КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 47 (223) ◂ 24 снежня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

**ПЛОШЧА–2010**
НАРОДНАЯ ПАДТРЫМКА НА КРЫВІ ........ Стар. 3
НОВЫ БЕЛАРУСКІ ПАРАДАК ........ Стар. 5
ЧЫРВОНА-ЗЯЛЁНЫ ТЭРОР ........ Стар. 6
ЛІЛЕЯ ........ Стар. 27
ЗАЛАТАЯ СТАРОНКА Ў ГІСТОРЫІ ........ Стар. 28






ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10047

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**НАСТУПНЫ НУМАР ГАЗЕТЫ ВЫЙДЗЕ 7 СТУДЗЕНЯ 2011 ГОДА!**

ВІНШАВАННЕ

# ШЧАСЛІВЫХ СВЯТАЎ!

**Гэты перадкалядны нумар мы хацелі зрабіць святочным, добрым і цёплым — такім жа, як само Нараджэнне Хрыстова. На жаль, паслявыбарчыя падзеі — жорсткае збіццё і затрыманні соцень людзей — унеслі свае карэктывы. І гэты нумар, амаль цалкам прысвечаны таму, што адбывалася з 19 снежня.**




Тым не менш, перад святам Божага Нараджэння звычайна добры час для таго, каб падвесці вынікі і папрасіць у Бога нешта на будучы год для сябе і сваіх родных.

Для адных Каляды — гэта той час, калі ў імбірным водары людзі ставяць елку і ўпрыгожваюць дом, накрываюць святочны стол і збіраюцца ў цёплым і добрым крузе. Для іншых — час адзіноты і неверагоднай самоты.

Ва ўсіх свае асацыяцыі, свае ўспаміны пра 2010 год. Для кожнага ён не быў простым, мы сутыкнуліся з расчараваннямі і не раз адчайваліся. Але мы спазналі радасць, упэўненасць і надзею.

Гэта быў год крызісу, эканамічных турбот, палітычнага фарсу пад назвай выбары і непрыкрытай нянавісці ўлады да сваіх грамадзян. Былі моманты, калі ў нас апускаліся рукі і не было ніякага жадання, ніводнай прычыны працягваць барацьбу. Але гэта праходзіла, і мы ўзнімаліся зноў і зноў.

У 2010 годзе, годзе зімовай алімпіяды ў Ванкуверы, не спыняліся вайсковыя канфлікты, у якіх загінуў не адзін дзесятак чалавек, было нямала прыродных катаклізмаў і катастроф. Для адных краін ён стаў часам уздыму, умацавання пазіцый, для іншых — перыядам смутку і жалобы, як для Польшчы.

За гэты год усе мы многае паспелі зрабіць. Нехта стварыў сям'ю, спазнаў радасць бацькоўства ці пачаў гадаваць унукаў. Хтосьці пераехаў на новае месца і пабудаваў сваё новае жыццё. Многія знайшлі сваю справу, сваю шчаслівую зорку. Нехта шмат падарожнічаў, пабываў у экзатычных кутках свету. Некаторыя, на жаль, аддаліліся ад сяброў ці родных, страцілі блізкіх. Для іх гэта быў год жалобы і пакінутасці, але яны вытрымалі і працягвалі жыць. Многія сустрэлі новых людзей, знайшлі добрых сяброў, каханых. Усе мы адчулі самыя розныя эмоцыі, ад небывалай узнёсласці да глыбокага смутку.

На свята Божага Нараджэння ёсць добрая магчымасць кожнаму нешта пажадаць. Усім зычым добрага здароўя, асабліва тым, хто ў шпіталі ці сустрэне там Новы год. Тым, хто расчараваўся, — знайсці новыя стымулы і зноў паверыць у свае сілы. Тым, хто ў пошуку, — заняць сваё месца. Падманутым — знайсці магчымасць прабачыць. Тым, хто адчуў страту, — трымацца і жыць, захаваўшы ў памяці вобразы блізкіх. Навучэнцам — цярпення і ўмення цаніць студэнцкія гады.

Тым, хто ў дарозе, — дайсці да мэты і вярнуцца дадому. Тым, хто зараз за кратамі, — трывання і веры ў лепшы час. Мы з вамі.

Няхай ваш дом заўсёды будзе поўным цеплыні, дабрыні, звычайнага шчасця. У працы жадаем упэўненасці, мудрасці і амбіцыйнасці. У адносінах — даверу, шчырасці і адданасці.

Яшчэ год таму мы задаваліся пытаннем, што нас чакае ў будучыні. Зараз мы ведаем гэтую будучыню. Мы гэты год пражылі. І з нецярплівасцю глядзім і надзеяй глядзім наперад.

Таму наша галоўнае пажаданне ў тым, каб кожны дзень быў асаблівым, поўным падзей і эмоцый, поўным надзеі на лепшую будучыню, поўным сіл для барацьбы за сябе, сваіх родных, за сваю краіну. Са святам Божага нараджэння Вас, і шчаслівага Новага года!

ЗАЯВЫ

## БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя журналістаў» выказвае рашучы пратэст супраць шакуючага факту прымянення сілы супрацоўнікамі міліцыі ў дачыненні да журналістаў і грамадскіх актывістаў увечары 19 снежня.

Праваахоўнікі жорстка збілі нашых калег, пашкодзілі і аднялі іх прафесійную апаратуру, не зважаючы на актуальныя журналісцкія пасведчанні. Пры гэтым пацярпелі рэпарцёры беларускіх СМІ і афіцыйна акрэдытаваныя ў краіне замежныя журналісты.

Пасля мірнай грамадзянскай акцыі на плошчы Незалежнасці ўвечары 19 снежня міліцыя затрымала шэраг журналістаў, якія асвятлялі ход падзеяў. І зноў супрацоўнікі праваахоўных органаў не зважалі на журналісцкія пасведчанні, груба і беспадстаўна парушаючы прафесійныя правы нашых калег на бесперашкоднае збіранне інфармацыі.

Паводле інфармацыі ГА «БАЖ», як мінімум 20 журналістаў былі затрыманыя, яшчэ столькі ж былі збітыя супрацоўнікамі міліцыі.

Такім брутальным чынам улады краіны ў чарговы раз выказалі сваю абсалютную непавагу да базавых грамадзянскіх і прафесійных правоў.

ГА БАЖ выказвае свой рашучы пратэст супраць формы асвятлення вядучымі дзяржаўнымі электроннымі СМІ мірнай грамадзянскай акцыі, якая адбылася ўвечары ў Мінску 19 снежня. Беларускае грамадства было абсалютна дэзінфармаваным наконт мэтаў гэтага мерапрыемства, колькасці ўдзельнікаў і іх дзеянняў, а таксама жорсткасці, з якой дзейнічалі супрацоўнікі міліцыі падчас разгону мірнай акцыі.

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» патрабуе неадкладнага расследавання ўсіх выпадкаў гвалту супраць журналістаў і перашкодаў для іх прафесійнай дзейнасці, а таксама прыцягнення ўсіх вінаватых да адказнасці.

## САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Увечары 19 снежня на вуліцы Калектарнай у Мінску быў жорстка збіты вядомы беларускі паэт, сябар Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў.

Пасля тэрміновай шпіталізацыі ён быў затрыманы, і цяперашняе месцазнаходжанне Уладзіміра Някляева застаецца невядомым.

Рада Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» выказвае занепакоенасць яго́ным лёсам і рашуча патрабуе вызвалення Уладзіміра Някляева, выдатнейшага творцы сучаснасці.

## ЕЎРАПЕЙСКІ ПАРЛАМЕНТ

Кіраўнікі дэлегацыі Еўрапарламента ў Парламенцкай асамблеі Еўранэст, дэлегацыі Еўрапарламента па адносінах з Беларуссю і Падкамітэта Еўрапарламента па правах чалавека выступілі з сумеснай заявай адносна правядзення прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Яны падтрымалі папярэднія высновы наглядальнай місіі БДІПЧ/АБСЕ і рашуча асудзілі прымяненне гвалту ў дачыненні да лідараў апазіцыі, журналістаў, праваабаронцаў і мірных дэманстрантаў.

Прадстаўнікі Еўрапейскага парламента заклікаюць да неадкладнага вызвалення затрыманых, правядзення расследавання ўсіх акалічнасцяў празмернага прымянення сілы з боку міліцыі і спецслужбаў і прыцягнення да адказнасці ўсіх вінаватых у парушэнні правоў чалавека і асноўных свабодаў.

У заяве таксама ёсць заклік да ўладаў Беларусі «прыслухацца да патрабаванняў беларускага грамадства, у тым ліку і да ідэяў апазіцыі, і аднавіць нацыянальную грамадскую дыскусію аб будучыні краіны і паслядоўным плане рэформаў».

«Мы будзем чакаць вынікаў такога ўнутранага палітычнага дыялогу, які мог бы прывесці да ўдзелу нашых партнёраў з Беларусі ў Еўранэст і да пачатку поўнамаштабнага двухбаковага парламенцкага дыялогу»,— падкрэсліваецца ў заяве.

## ПАРЛАМЕНЦКАЯ АСАМБЛЕЯ САВЕТА ЕЎРОПЫ

Спецдакладчык па Беларусі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Сініка Хурскайнен асудзіла гвалт на вуліцах Мінска пасля прэзідэнцкіх выбараў у нядзелю 19 снежня.

«Я ўстрывожаная паведамленнямі аб тых шматлікіх арыштах, што былі, у тым лідараў апазіцыі, уключна з кандыдатамі ў прэзідэнты, актывістаў і журналістаў, якія былі збітыя міліцыяй», — сказала палітык.

Сініка Хурскайнен была ў Мінску ў складзе місіі па назіранні за выбарамі Парламенцкай асамблеі АБСЕ: «Падчас назірання за выбарамі мне не далі ніякага шанцу глядзець за падлікам галасоў, бюлетэняў».

Дакладчык ПАСЕ па Беларусі настойліва заклікае сілы бяспекі і дэманстрантаў стрымлівацца ад любых далейшых спроб прымянення гвалту. Яна таксама заклікала ўлады Беларусі вызваліць затрыманых людзей.

«Усё асобы павінны мець магчымасць мірна здзяйсняць свае права на свабоду выказвання меркаванняў і сходаў, у тым ліку, калі крытыкуюць беларускія ўлады і выбарчы працэс. Я шкадую, што гэтыя выбары ўяўляюць сабой страчаную магчымасць для прыцягнення Беларусі да еўрапейскіх каштоўнасцяў і прынцыпаў», — сказала спецдакладчык па Беларусі ПАСЕ.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ШТУРМ «ВЯСНЫ»

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Праваабарончы цэнтр «Вясна» пазбаўлены ўсіх кампутараў. У ноч з 19 на 20 снежня міліцыя ўварвалася ў офіс, куды паступала інфармацыя па выніках галасавання ад назіральнікаў.**

«На працягу ночы двойчы «штурмавалі» наш офіс. Была канфіскаваная ўся аргтэхніка. Мы фактычна пазбаўленыя сродкаў працы. І будзем нейкі час працаваць па-за офіснымі ўмовамі», — паведаміла супрацоўніца праваабарончага цэнтра Тацціяна Равяка.

Супрацоўнікі Першамайскага РУУС правялі вынятку тэхнікі ў тры гадзіны ночы. Яны скарысталіся момантам, калі двое праваабаронцаў выходзілі з офісу, і дзверы не паспелі зачыніць. Прычынай свайго візіту яны абвясцілі пошук рэчаў ці каштоўнасцей, якія маглі б мець дачыненне да злачынства. «Каштоўнасцей быццам бы не знайшлі. А інфармацыйныя носьбіты вынялі. Вось мы паглядзім, да якога злачынства яны могуць мець дачыненне», — сказаў кіраўнік «Вясны» Алесь Бяляцкі.

Яго калег, 10 чалавек, якія знаходзіліся ў офісе, завезлі ў Першамайскі РУУС. Міліцыянты праводзілі «агляд памяшкання». «Вельмі цяжка сказаць, чым ён адрозніваўся адператрусу, — адзначыў Алесь Бяляцкі. — Таму што яны лазілі практычна ўсюды і забіралі ўсе інфармацыйныя сродкі, якія тут былі. Гэта флэшкі, відэакасеты, аўдыёкасеты, кампутары, ноўтбукі»

Выняцце тэхнікі скончылася каля 6.30. У гэты час усе затрыманыя былі адпушчаныя з міліцыі. Але прыкладна праз 40 хвілін з'явілася ўжо другая група. На мікрааўтобусе «Фольксваген» з цёмным шклом прыехалі 5 чалавек у цывільным. «Гэтыя наогул не назваліся. І пагражаючы тым, што яны ўзламаюць дзверы, патрабавалі адчыніць памяшканне. Я сказаў, што калі не будзе ордэра, дзверы не будуць адчыненыя», — распавёў Алесь Бяляцкі. Другая спроба пранікнення ў офіс не здзейснілася.

Наступным днём за офісам працягвалася весцізя вонкавае назіранне. «Так што ў нас выбарчая кампанія працягваецца, — рэзюмаваў Алесь Бяляцкі. — Але ў нейкай ступені я лічу, што гэта ацэнка нашага назірання. Таго, што мы рабілі ўсе гэтыя тры месяцы. Пра тое, што ўлады не хацелі б на самай справе ведаць пра вынікі нашага назірання, сведчаць якраз здарэнні гэтай ночы».

У дзень галасавання «Вясне» адключылі стацыянарны тэлефон.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПАЧАЛАСЯ КАМПАНІЯ САЛІДАРНАСЦІ

Генадзь КЕСНЕР

**21 снежня ўвечары ля муроў ізалятара часовага ўтрымання на вуліцы Акрэсціна ў Мінску прайшла акцыя салідарнасці з затрыманымі і асуджанымі на адміністратыўны арышт удзельнікамі акцый пратэсту, якія адбываліся ў беларускай сталіцы 19 і 20 снежня. У мерапрыемстве прынялі ўдзел да 200 прадстаўнікоў палітычных партый, грамадскіх арганізацый і рухаў. Там жа былі і блізкія затрыманых, якія спрабавалі высвятліць лёс сваіх родзічаў.**



Photo.ByMedia.Net

Прыйсці ўвечары да акрэсцінскіх муроў раніцай у аўторак заклікаў адзіны кандыдат ад дэмакратычных сіл на прэзідэнцкіх выбарах 2006 года, лідар руху «За свабоду!» Аляксандр Мілінкевіч. Гэта адбылося падчас прэс-канферэнцыі, якую, апроч Мілінкевіча, зладзілі старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, кандыдат у прэзідэнты Рыгор Кастусёў, кіраўнік гарадской арганізацыі Партыі БНФ Віктар Івашкевіч, лідэр Руху салідарнасці «Разам» Вячаслаў Сіўчык і намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Леў Марголін.

Удзельнікі сустрэчы з журналістамі паведамілі, што ўжо з таго ж самага дня пачынаецца кампанія салідарнасці з затрыманымі і прыгаворанымі да адміністратыўных арыштаў удзельнікамі пратэстных акцый. Таксама прагучала, што ў рамках кампаніі пачынаецца збор сродкаў, каб дапамагчы асуджаным на грашовыя штрафы выплачваць непад'ёмныя для многіх сумы. «Мы мусім сёння прадэманстраваць салідарнасць з тымі, хто апынуўся ў вязніцах, гэта вельмі важна», — падкрэсліў Аляксандр Мілінкевіч.

Удзельнікі прэс-канферэнцыі агучылі падпісаную імі заяву (да якой хвілінамі раней далучыўся і старшыня Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін, але сам палітык не змог прысутнічаць на сустрэчы з журналістамі з прычыны праблем са здароўем), у якой адзначаецца, што падпісанты выказваюць «салідарнасць з арыштаванымі кандыдатамі ў прэзідэнты Аляксеем Міхалевічам, Уладзімірам Някляевым, Віталём Рымашэўскім, Андрэем Саннікавым, Мікалаем Статкевічам і патрабуюць іх неадкладнага вызвалення, а таксама вызвалення ўсіх удзельнікаў мірнай маніфестацыі».

Увечары каля акрэсцінскага ізалятара ў ланцуг са свечкамі і знічкамі сталі каля двухсот чалавек, які скандавалі «Жыве Беларусь!», «Свабоду!», спявалі багдановіцкую «Пагоню». Рыгор Кастусёў, чый малодшы сын атрымаў 15 сутак арышту, паведаміў, што асуджаных у гэты дзень трымаюць не толькі на Акрэсціна, але і ў ізалятары Жодзіна, а некаторых з прычыны перапоўненасці гэтых вязніцаў нават адвезлі ў Гродна. Дарэчы, у ізалятары на Акрэсціна былі толькі мужчыны, жанчын адвозілі ў мінскі абласны ізалятар, што на вуліцы Францыска Скарыны, 20.

У завулку Акрэсціна стаяў «аўтазак» і аўтобус са спецназаўцамі, якія не ўмешваліся ў падзеі, праўда, на непрацяглы час. Ужо пасля завяршэння мерапрыемства быў затрыманы актывіст АГП і сябра штабу Някляева Міхаіл Пашкевіч.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПУШКІН НА СВАБОДЗЕ

Аляксей ХАДЫКА

**21 снежня, пасля 13 сутак зняволення і галадоўкі, на свабоду выйшаў вядомы мастак і перформер Алесь Пушкін.**

Як прэзідэнцкія выбары — так Алеся Пушкіна ў кутузку. Каб не дай Бог зноў не прывёз тачку гною па ўсім вядомым адрасе.

Выйшаўшы з камеры ў Крупскім РАУС, мастак накіраваўся дахаты ў Бобр, схадзіў у лазню і адпраўся спаць. А з раніцы так пракаментаваў сітуацыю:

— Я нарэшце зразумеў месідж беларускай дзяржавы: Алесь, трэба хадзіць на галасаванне! Бо ў камеры ўрну для бюлетэняў мне кожны раз дастаўляюць з зайздроснай адказнасцю. Можа, яны нават маюць на ўвазе: Алесь, табе трэба ісці ў прэзідэнты! Пэўна, я так і зраблю наступным разам. Бо калі б я быў разумнейшы, хоць бы як Някляеў ці Рымашэўскі, то з такім піярам я б абавязкова перамог!»

ЯК ГЭТА БЫЛО

# НАРОДНАЯ ПАДТРЫМКА НА КРЫВІ

Вольга ХВОІН



**Прагназуемая колькасць людзей, якія выйдуць на плошчу, ацэньвалася скептыкамі ў пяць-дзесяць тысяч чалавек. Вечарам 19 снежня гаварылі, што ў акцыі пратэсту ўдзельнічае каля 20 тысяч чалавек. У выніку многія з гэтых людзей атрымалі не толькі амапаўскай дубінкай па хрыбту, але і рэвалюцыю ў свядомасці. Людзі сталі грамадзянамі.**

А пачыналася ўсё мірна і нават прыгожа. На буйнейшую вулічную акцыю апазіцыі з часоў вясны 2006 года ў цэнтр Мінску ехалі-ішлі і самі мінчукі, і жыхары рэгіёнаў. Апошнім кампанію ад чыгуначнага вакзалу ў бок Кастрычніцкай плошчы складалі кандыдаты ў прэзідэнты Віталь Рымашэўскі і Мікола Статкевіч, якія абвясцілі збор людзей на пляцоўцы перад вакзалам. Па шляху надзвычайных інцыдэнтаў не было, хіба што некалькі п'яных спрабавалі прычапіцца да дэманстрантаў.

Тым часам на Кастрычніцкую падцягваўся народ, недзе ў 20.30 яна была цалкам запоўненая людзьмі, з дынамікаў гучна транслявалася расійская папса. Яшчэ да з'яўлення кандыдатаў у прэзідэнты калегі-журналісты расказалі, што збіты Уладзімір Някляеў, яго адвезлі ў бальніцу. Пазітыву ад гэтай весткі не дадалося, але міліцыі, апроч супрацоўнікаў у цывільным, не было. І падавалася, што ўлады абыдуцца толькі ліквідацыяй актыўнага апанента.

Прыйшлі кандыдаты ў прэзідэнты, гукаўзмацняльнай апаратуры не было, і словы з мегафону былі чутныя максімум на адлегласці ў дзесяць метраў ад выступоўцаў. Потым прынеслі калонкі, і кандыдаты выступілі з невялікімі прамовамі. Прыехаў кіраўнік штабу Уладзіміра Някляева Андрэй Дзмітрыеў, які расказаў пра напад на кандыдата ў прэзідэнты, ён перадаў словы кандыдата ў прэзідэнты: «Можна зламаць руку, але нельга зламаць волю, можна разбіць галаву, але нельга разбіць надзеі».

Людзі скандавалі: «Сыходзь!», «Жыве Беларусь!», «Пора менять лысую резину». Мікола Статкевіч паведаміў звесткі незалежнага экзіт-пола і заклікаў прысутных ісці да Лукашэнкі і патрабаваць яго сысці з пасады. Літаральна цягам 10–15 хвілін натоўп рушыў па праспекту ў бок плошчы Незалежнасці. Людзі цалкам запоўнілі вуліцу ад плошчы да плошчы, калона ішла вельмі хутка. Быў момант замяшальніцтва, калі на плошчу дайшла частка людзей — было не зразумела, дзе лідары, што рабіць далей. Праехала машына з гукаўзмацняльнай апаратурай, некалькі разоў папярэдзіла дэманстрантаў аб адказнасці за ўдзел у масавых мерапрыемствах і з'ехала. З'явіліся паліткі, пачаўся мітынг каля помніка Леніну. Натоўп быў настроены міралюбіва, не агрэсіўна, але адчувалася энергетыка рашучасці.

Віталь Рымашэўскі заявіў, што кандыдаты ў прэзідэнты запрашаюць на плошчу кіраўнікоў міліцыі, пракуратуры, Лукашэнку, патрабуючы правядзення новых выбараў, але цяпер хочуць перамоў. Кандыдат запэўніваў, што сілавых дзеянняў не будзе. З боку Дома ўраду даляцеў гук разбітага шкла. Натоўп зароў: «Правакатары!» Кандыдаты спрабавалі ўціхамірыць людзей. У гэты час адбылася першая спроба зачысткі, людзей білі ля ганку Дома ўраду. Але раптам АМАП пачаў сыходзіць. Выступоўцы міралюбіва заклікалі: «Міліцыя пакідае нас і вернецца без формы для таго, каб нас падтрымаць. Не біце міліцыю — хай сыходзіць з мірам!» Натоўп з адабрэннем закрычаў: «Міліцыя з народам!» Да дзвярэй парламенту стварылі жывы калідор з людзей, Андрэй Саннікаў і Віталь Рымашэўскі пайшлі «на перамовы».

Далейшыя падзеі разгортваліся хутка. З Дому ўраду выбегла каля сотні байцоў спецназу, пад'ехалі аўтазакі, аўтобусы з міліцыянтамі, амапаўцамі. Людзей пачалі выцясняць, пры гэтым білі, не разбіраючы каго і па чым — жанчын, пажылых, па спіне, галовах... Спецназ сціскаў натоўп з усіх бакоў, аргументуючы свае дзеянні дубінкамі, мацюкамі... Тыя, што ў цывільным, выхоплівалі дэманстрантаў па аднаму і збівалі нагамі. Людзей пачкамі закідвалі ў аўтазакі, выдаючы порцыі ўдараў дубінкамі, нагамі. Літаральна за дзесяць хвілін натоўп быў разбіты, людзі, як вада з прарванай плаціны, расцякаліся па прылеглых вуліцах, але і там іх чакалі дубінкі, аўтазакі. Каля чыгуначнага вакзалу міліцыянты «вінцілі» нейкіх хлопцаў каля кіёску «хутка-смачна», з рацыяў міліцыянтаў даносіліся загады «пакаваць». Пакавалі без разбору па ўсяму гораду да раніцы — мінакоў, мітынгоўцаў, кандыдатаў у прэзідэнты...

***

Рэжым Лукашэнкі праявіў сваю жахлівую, сапраўдную існасць.

Аляксандр Лукашэнка заяўляў, што Плошчы не будзе. Плошча была, але нядоўга. Падкрэслена мірны характар вулічнай акцыі пратэсту катастрафічна дысануе з метадамі яе разгону. Пазней з'явіліся фота- і відэадоказы таго, што вандалізм на ганку Дома ўраду надта нагадвае сплянаваную акцыю, якая развяжа рукі сілавікам.

На заклікі да сілавых структур знайсці паразуменне, не ісці супраць сваіх сугрмадзян быў адказ у выглядзе брутальнага, нематываванага жорсткага разгону. Людзей сціскалі паміж дзвюма сценкамі з амапаўцаў у шлемах, са шчытамі, з дубінкамі. Працягні руку ў адзін бок — дакранешся да амапаўца, працягні ў другі — тое ж. Натоўп шалеў ад страху, амапаўцы таксама пад адрэналінам былі далёкія ад адэкватнасці. Сітуацыя, якая склалася ў выніку гэтых манеўраў, — другая Няміга. Адрозненне ў тым, што над галовамі быў не дождж, а дубінкі.

Нейкага мужчыну збівалі нагамі каля дзесятка супрацоўнікаў, апранутых у цывільнае. Крымінальныя, дваровыя разборкі — вось узровень сілавікоў Беларусі. Такая ў нас улада, спадарства, такую ўладу мы трываем 16 гадоў. Відаць, усё мае пад сабой грунт.

Напад на ініцыятыўную групу Уладзіміра Някляева, збіццё самога кандыдата ў прэзідэнты — гэта папросту па-за каментарамі. Імаверны бліжэйшы супернік Лукашэнкі, які, верагодна, мог бы быць другім прэзідэнтам Беларусі, невядома дзе з чэрапна-мазгавой траўмай.

Так, магчыма, апазіцыя «правісла» ў плане падрыхтоўкі, правядзення акцыі, кіраўніцтва натоўпам, не прадугледзела магчымыя правакацыі. Не зразумелая сутнасць перамоў у Доме ўраду, што ініцыявалі кандыдаты ў прэзідэнты, калі гэты самы Дом ураду зачынены і, па логіцы, там хіба што прыбіральшчыца знаходзілася (але падзеі паказалі, што знайшлося месца ў гэтым будынку і не адной сотні амапаўцаў). Але ўсё гэта не можа быць падставай для бойні пад сценамі Дома ўраду, пасля якой застаўся чырвоны ад крыві снег.

Кроў, боль, сорам — вось вынік 19 снежня 2010 года.

ФІГУРЫ ТЫДНЯ

## ТАКІХ АСОБАЎ СОТНІ

**Пасля 19 снежня, калі людзі выйшлі на вуліцу, каб пратэставаць супраць фальсіфікацый вынікаў выбараў больш за два дзясятка чалавек праходзяць па крымінальных справах. Ім пагражае ад трох да пятнаццаці гадоў пазбаўлення волі.**

**Падазраюцца па крымінальнай справе па артыкуле 293, частках 1 і 2, Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь «Масавыя беспарадкі»:**











1. **Уладзімір Някляеў** — кандыдат у прэзідэнты, быў збіты супрацоўнікамі спецслужбаў 19 снежная прыблізна ў 19.30, у непрытомным стане дастаўлены ў бальніцу, таму ў мітынгу не ўдзельнічаў, знаходзіцца ў СІЗА КДБ.
2. **Андрэй Саннікаў** — кандыдат у прэзідэнты, знаходзіцца ў СІЗА КДБ.
3. **Рыгор Кастусёў** — кандыдат у прэзідэнты, адпушчаны з СІЗА КДБ пад падпіску аб нявыездзе.
4. **Мікалай Статкевіч** — кандыдат у прэзідэнты, знаходзіцца ў СІЗА КДБ, трымае галадоўку.
5. **Аляксей Міхалевіч** — кандыдат у прэзідэнты, знаходзіцца ў СІЗА КДБ.
6. **Віталь Рымашэўскі** — кандыдат у прэзідэнты, знаходзіцца ў СІЗА КДБ.
7. **Дзмітрый Ус** — кандыдат у прэзідэнты таксама праходзіць у якасці падазраванага па крымінальнай справе аб масавых беспарадках у Мінску. Пра гэта паведаміў Рыгор Кастусёў, які быў на допыце ў КДБ і сустрэў там Дзмітрыя Уса.
8. **Павел Севярынец** — даверная асоба кандыдата Віталя Рымашэўскага, адзін з сустаршыняў аргкамітэту па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», знаходзіцца ў СІЗА КДБ.
9. **Дзмітрый Бандарэнка** — каардынатар грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь».
10. **Ірына Халіп** — журналістка, жонка Андрэя Саннікава, знаходзіцца ў СІЗА КДБ.
11. **Наталля Радзіна** — журналістка, рэдактарка інтэрнэт-сайта charter97.org, знаходзіцца ў СІЗА КДБ.
12. **Анатоль Лябедзька** — старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі, знаходзіцца ў СІЗА КДБ. Трымае галадоўку.
13. **Настасся Палажанка** — намесніца старшыні «Маладога Фронту», падчас мітынгу выступіла з кароткай прамовай.
14. **Андрэй Дзмітрыеў** — кіраўнік перадвыбарнага штаба Уладзіміра Някляева.
15. **Аляксандр Фядута** — адзін з каардынатараў перадвыбарнага штаба Уладзіміра Някляева, журналіст, знаходзіцца ў СІЗА КДБ.
16. **Аляксандр Атрошчанкаў** — прэссакратар перадвыбарнага штаба Андрэя Саннікава.
17. **Аляксандр Класкоўскі** — былы супрацоўнік міліцыі, падчас акцыі ўгаворваў спецназаўцаў не ўжываць сілу супраць дэманстрантаў.
18. **Уладзімер Кобец** — кіраўнік перадвыбарнага штаба Саннікава.
19. **Сяргей Вазняк** — даверная асоба Уладзіміра Някляева, сябра праўлення Беларускай асацыяцыі журналістаў, рэдактар газеты "Товарищ".
20. **Анатоль Паўлаў** — сябар Палітрады АГП, экс-прарэктар БДУ.
21. **Алег Корбан** — моладзевы лідар АГП.
22. **Аляксандр Арастовіч** — даверная асоба Мікалая Статкевіча.

**Крымінальная справа па артыкуле 339 ч. 3 Крымінальнага кодэкса «Хуліганства»:**

1. **Дашкевіч Зміцер** — старшыня «Маладога Фронту».
2. **Лобаў Эдуард** — актывіст «Маладога Фронту».
3. **Лазар Дзяніс** — актывіст «Маладога Фронту».

Затрыманыя прэвентыўна, 18 снежня, абвінавачваюцца ў зачыне хуліганскай бойкі.

**Агулам 19 снежня і ў наступныя дні было затрымана, арыштавана каля 700 чалавек. Ізалятары часовага ўтрымання ў Мінску, Жодзіна перапоўненыя. Людзей завозяць у іншыя гарады, нават у Гродна. Многія суды над затрыманымі адбываліся за закрытымі дзвярыма.**

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ЗАКЛАДНІКІ ЭЛЕКТАРАЛЬНАЙ ДЭМАКРАТЫІ

Сяргей НІКАЛЮК

**У 2007 годзе адзін палітык прапанаваў уручыць малую нобелеўскую прэмію таму, хто падкажа, чым заняцца апазіцыі ў перапынках паміж выбарамі. Надышоў час адгукнуцца на такую прывабную прапанову.**



Бацька кітайскага эканамічнага «цуду» Дэн Сяапін, ацэньваючы ўплыў Вялікай французскай рэвалюцыі на развіццё сусветнай гісторыі, зазначыў, што рэвалюцыя скончылася ўсяго два стагоддзі таму, і яшчэ рана рабіць высновы. Выбары–2010 у Беларусі — падзея, безумоўна, іншага маштабу. Праз два стагоддзі яна наўрад ці стане тэмай публічнага абмеркавання. Аднак выбары–2010, асабліва на іх завяршальнай фазе, у ноч з 19 на 20 снежня, былі багатыя на факты, на аснове якіх паспрабуем зрабіць хоць бы не канчатковыя, а толькі прамежкавыя высновы.

## Сацыялогія перамогі

Абвешчаны спадарыняй Ярмошынай вынік не выклікаў здзіўлення. Адзіны беларускі палітык (АП) сваё званне пацвердзіў: за яго прагаласавала 79,67% выбарцаў. Перамножыўшы з дапамогай калькулятара канчатковы вынік пераможца на працэнт яўкі, якая, па дадзеных ЦВК, склала 90,66%, мы атрымаем 72,23%. Такі афіцыйны электаральны рэйтынг АП. У 2006 годзе ён быў амаль на 5 працэнтных пунктаў вышэй — 77,11% (у 2001 годзе — 63,44%). Дадзеныя ЦВК фактычна супалі з прагнозам Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі прэзідэнта (ІАЦ). З тыдня на тыдзень ён нарошчваў рэйтынг АП і давёў яго да канца лістапада да 71,3%.

Што да шматлікіх апазіцыйных кандыдатаў, то іх рэйтынгі высыпаліся са скрыняў для галасавання, як гарох. Калі сабраць усе гарошыны разам, то, з улікам яўкі, атрымалася 12,46%. Яшчэ 1,45% на дваіх атрымалі ці то далучаныя да апазіцыі, ці то «незалежныя» кандыдаты Цярэшчанка і Ус. На папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах апазіцыйнаму тандэму Казулін—Мілінкевіч ЦВК вылучыў істотна менш галасоў — 6,4%.

Выбары–2010 пацешылі беларусаў экзіт-поламі. Як жа без іх, у Еўропу ж ідзём! Права апытваць выбарцаў каля выхаду з участкаў атрымалі Цэнтр ЕсооМ, Рэспубліканскі саюз грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт моладзевых арганізацый» і ТАА «TNS» (Украіна). На момант падрыхтоўкі «Азбукі» я здолеў знайсці ў інтэрнэце толькі вынікі ЕсооМ і ТАА «TNS». За АП прагаласавала 79,1% і 72,2% адпаведна.

Звернемся да выніку, які атрымалі айчынныя экзітпольшчыкі. Перад намі чарговае супадзенне з дадзенымі ЦВК, але не ад агульнай колькасці выбарцаў, як у ІАЦ, а ад колькасці тых, хто прагаласаваў. Так, у прынцыпе, і павінна быць, калі б не адна маленькая няўвязка. Экзіт-полы праводзіліся толькі 19 снежня. Паводле ж дадзеных ЦВК, датэрмінова прагаласавала 23,1%. Такі працэнт не павінен выклікаць здзіўлення: у 2006 годзе НІСЭПД зафіксаваў 25,9% выбарцаў, якія прагаласавалі датэрмінова. Дык у чым жа няўвязка? Яна ў тым, што датэрмінова галасуюць пераважна прыхільнікі АП. З улікам амаль чвэрці выбарцаў, якія прагаласавалі датэрмінова, каб выйсці на выніковую лічбу ЦВК, працэнт прыхільнікаў АП, што прагаласавалі ў апошні дзень, павінен быць значна ніжэйшы.

Дадзенымі незалежных сацыёлагаў па выніках галасавання я, натуральна, не валодаю, але, абапіраючыся на вынікі апытанняў, праведзеных падчас дзвюх папярэдніх прэзідэнцкіх кампаній, пэўны прагноз зрабіць можна (гл. табліцу).

Звярніце ўвагу, у 2001 і ў 2006 гадах вынікі, атрыманыя сацыёлагамі НІСЭПД за месяц да галасавання, істотна не адрозніваліся ад канчатковых вынікаў. Што да 2010 года, то прыведзены ў табліцы рэйтынг быў замераны, па-першае, не за адзін, а за два месяца да галасавання; па-другое, непасрэдна перад галасаваннем вялікая частка выбарцаў атрымала зарплату з улікам істотнай лістападаўскай карэктоўкі. На такія «падарункі» беларусы традыцыйна з падзякай адгукаюцца. Таму з высокай ступенню верагоднасці можна сцвярджаць, што на месцы прочырку ў табліцы апынецца лік не ніжэй за 2001 год, але і не вышэй за 2006-ы.

**АДКРЫТЫЯ РЭЙТЫНГІ АП ДА ГАЛАСАВАННЯ І ВЫНІКІ ГАЛАСАВАННЯ ПА ДАДЗЕНЫХ НІСЭПД І ЦВК**

| | 2001 | 2006 | 2010 |
|---|---|---|---|
| Рэйтынг да галасавання | 44,4 | 57,6 | 44,0 |
| Вынікі галасавання | 48,2 | 58,2 | – |
| Афіцыйны вынік ЦВК* | 63,4 | 77,11 | 72,2 |

* З улікам яўкі ад спіскавай колькасці выбарцаў

## Перамога сацыялогіі

Цікавасць большай часткі экспертаў і апазіцыйных палітыкаў да вынікаў незалежных сацыёлагаў абмяжоўваецца рэйтынгамі. Што характэрна, як першыя, так і другія пры гэтым рэйтынгам не давяраюць. Рэакцыя палітыкаў нагадвае рэакцыю карантышак на партрэтны жывапіс героя казкі Носава «Прыгоды Нязнайкі». Для тых, хто даўно не перачытваў дзіцячую класіку, нагадаю, што аднойчы раніцай Нязнайка развесіў партрэты сяброў у двары свайго дома. Першым прачнуўся доктар Пілюлькін. Мастацтва Нязнайкі яму вельмі спадабаліся, ён доўга смяяўся, пакуль не дайшоў да свайго партрэта. Наконт далейшай рэакцыі Пілюлькіна здагадацца нескладана.

Перад прэзідэнцкімі выбарамі на рэспубліку літаральна абрынулася плынь «сацыялагічнай інфармацыі» з крыніц, якія ніколі раней у Беларусі нічым сябе не выявілі. І калі гэта інфармацыя адпавядала ўяўленням мясцовых пілюлькіных пра саміх сябе, то ёй тут жа надаваўся статус «рэальных сацыялагічных дадзеных», якія фіксуюць «прынцыпова новую электаральную сітуацыю».

Асобныя энтузіясты пайшлі далей і сталі выбудоўваць уласную сацыялагічную рэальнасць на аснове апытанняў у інтэрнэце. Прывяду тыповую логіку такога кшталту будаўніцтва: па дадзеных Міністэрства сувязі і інфармацыі РБ, у краіне палова сем'яў маюць доступ у «сусветнае павуцінне», што дазваляе стварыць малюнак значна больш дакладны, чым самыя крутыя сацапытанні. Да таго ж, галасуюць рэспандэнты ананімна і таемна — гэта значыць так, як і на рэальных выбарах.

Ну што тут сказаць, у гісторыі перадвыбарных апытанняў быў выпадак, калі ў ЗША праз такіх «сацыёлагаў» апытала больш за тры мільёны чалавек і «прakaлолася». Уся справа ў тым, што апытваліся выключна хатнія гаспадары на падставе тэлефонных кніг (справа была ў пяцідзесятых гадах). Сучасныя інтэрнэт-карыстальнікі — людзі прасунутыя. У верасні 2010 года сярод тых, хто карыстаецца інтэрнэтам штодзень, давяралі АП 28,3% апытаных, хто ніколі інтэрнэтам не карыстаўся — 56,5%, а сярод не дасведчаных, «што гэта такое», — 75,8%.

Рэйтынгі палітыкаў — гэта адна з характарыстык грамадства. Падкрэслю — адна з... Гіпертрафаваную ўвагу да рэйтынгаў з боку палітыкаў і экспертаў варта разглядаць у якасці адваротнага боку нежадання вывучаць грамадства. Цяжка сказаць, што спарадзіла гэтае нежаданне. Магчыма, за адказам трэба звярнуцца да цара Саламона: «Ад шматлікай мудрасці шмат смутку, і той, хто памнажае веды, памнажае смутак».

## У кожнага свае міфы

Старажытныя грэкі кампенсавалі недахоп ведаў пра навакольны свет міфатворчасцю. Звышзадача любога міфа, як вучаць культуролагі, — пераадоленне страху хаосу. Міф стварае крыніцу парадку. Для большасці беларусаў у такой якасці выступае «моцная ўлада». У апазіцыі сваё ўяўленне пра парадак і свой шлях да яго. Прайсці яго без Плошчы немагчыма.

Перачытайце перадвыбарныя заявы апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты, перачытайце адпаведныя каментары аналітыкаў. Большасць з іх прысвечана будучай Плошчы. Прывяду толькі адзін фрагмент, абраны выпадкова: «Тое, што гэтыя выбары будуць сфальсіфікаваныя, як і папярэднія, не выклікае ніякіх сумневаў. Таму для апазіцыі адзіным інструментам абароны вынікаў выбараў застаецца Плошча, на якую амаль усе кандыдаты і заклікаюць выбарцаў прыйсці 19 снежня. І тут паўстае істотнае пытанне: ці маюць кандыдаты ад апазіцыі канкрэтную стратэгію таго, што яны будуць рабіць на плошчы?»

Міф пра Плошчу паўстаў не на пустым месцы. Ён навеяны «каляровымі рэвалюцыямі». Менавіта пад іх уплывам у 2006 годзе была здзейснена спроба ўвасобіць міф у жыццё. Нягледзячы на эканамічныя дасягненні, якія дэманстравала тады «беларуская эканамічная мадэль» ва ўмовах спрыяльнай знешняй кан'юнктуры, нягледзячы на максімальныя рэйтынгі АП (гл. другую калонку табліцы), Плошча, па меркаванні яе арганізатараў, адбылася, і першы блін не атрымаўся камяком. Для канчатковай Перамогі не хапіла той самай «пэўнай стратэгіі», на неабходнасць якой звяртае ўвагу цытаваны вышэй аўтар.

Тут самы час звярнуцца па дапамогу да азбукавых ісцін паліталогіі. Паводле класіфікацыі Freedom House, аўтарытарныя рэжымы падзяляюцца на кансалідаваныя і некансалідаваныя. Наша паўднёвая суседка Украіна пры Кучме, як і сонечная Грузія пры Шэварнадзэ, — усё гэта класічныя прыклады некансалідаваных аўтарытарных рэжымаў. Іх трансфармацыю праз механізмы «каляровых рэвалюцый», у якасці нагоды да пачатку якіх выступалі пратэсты супраць фальсіфікацыі выбараў, не варта разглядаць як унікальную падзею.

Але якое дачыненне такога кшталту падзеі маюць да сучаснай Беларусі? Не варта блытаць Божы дар з яечняй. «Каляровыя рэвалюцыі» — гэта, у першую чаргу, разборкі сярод эліт, і толькі ў другую — масавыя акцыі пратэсту на галоўных плошчах дзяржаў. Пасля 1996 года аўтарытарны рэжым у Беларусі кансалідаваўся, і пакуль сур'ёзных расколін у ім не заўважаецца.

Каб у чарговы раз не прыцягваць правадыра сусветнага пралетарыяту ў якасці эксперта па рэвалюцыйных сітуацыях, працытую ўкраінскага спецыяліста па «аранжавай рэвалюцыі» палітолага Міколу Рабчука: «Дрэнны рэвалюцыянер — гэта той, хто спрабуе ўвасобіць свае ўтапічныя дактрыны насуперак акалічнасцям, аднак не ўлічвае пры гэтым унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае становішча і грэбуе палітычнай культурай і эканамічным развіццём».

У заключэнне паспрабую ў бочку песімізму дадаць лыжку надзеі на змены. І дапаможа мне гэта зрабіць зноў Мікола Рабчук: «Леанід Краўчук, як і яго беларускі калега Вячаслаў Кебіч, прайграў у свой час выбары зусім не таму, што быў занадта шчырым дэмакратам. Ён прайграў выбары, бо ні ён сам, ні яго каманда не назапасілі дастатковых рэсурсаў, а галоўнае — умення імі карыстацца ва ўмовах імітацыйнай дэмакратыі».

Вось рэсурсы, дакладней, іх нарастаючы дэфіцыт, і дае шанец на трансфармацыю кансалідаванага палітычнага рэжыму ў некансалідаваны. Беларуская эліта вырасла на дзяльбе расійскай рэнты, але не за гарамі час, калі дзяліць ёй давядзецца страты.

З НАГОДЫ

# НОВЫ БЕЛАРУСКІ ПАРАДАК

Вольга ХВОІН





**За два дні да выбараў Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў краіне разгарнулі дэмакратыю, якая парушае стабільнасць палітычнага ладу. Вечарам 19 снежня дэмакратыю згарнулі. Ды так, што ад шоку яшчэ доўга будзе апраўляцца і Беларусь (дакладней, тая частка, што ўмее думаць), і міжнародная супольнасць.**

Афіцыйны Мінск упіваецца чарговай «элегантнай» перамогай, назіральнікі выстаўляюць гэтым выбарам адзнакі «кепска» і «вельмі кепска».

Заручыўшыся падтрымкай Расіі, якая паабяцала ў 2011 годзе датацыі для Беларусі ў памеры каля 4 мільярдаў долараў, Аляксандр Лукашэнка не тое што пра кіраваную дэмакратыю размовы не вядзе, а дае зразумець, што наступныя пяць гадоў краіна будзе пад уладай дубінкі. Адзіную пакуль свабодную прастору — інтэрнэт — таксама збіраюцца зацугляць.

«Мы рэфармуем інтэрнэт, прывядзем яго ў адпаведнасць з заходнімі ўзорамі. Мы гэтага не зрабілі да выбараў. Гэта была мая пазіцыя: не кранайце, гавару, скажуць, што мы кагосьці там заціскаем, — растлумачыў Лукашэнка. — За кожнае напісанае слова вы будзеце несці поўную адказнасць. За ўсе ўкіды вы будзеце адказваць. Нават калі вашы рэдакцыі размешчаныя далёка за мяжой, мы будзем прад'яўляць прэтэнзіі тым дзяржавам, дзе размешчаныя гэтыя рэдакцыі».

## ЗША выбары не прызнаюць, а Еўропа?

Традыцыйна для Беларусі назіральнікі ад АБСЕ і ад СНД маюць супрацьлеглыя меркаванні наконт прэзідэнцкіх выбараў.

Прэзідэнцкія выбары ў Беларусі не адпавядаюць стандартам АБСЕ — такое заключэнне міжнародных назіральнікаў Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) і Парламенцкай Асамблеі (ПА) АБСЕ.

Высокі прадстаўнік Еўрапейскага Саюза Кэтрын Эштан заявіла, што прымае да ўвагі папярэднія высновы міжнароднай місіі БДІПЧ/АБСЕ па назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі ў Рэспубліцы Беларусь, а гвалт падчас разгону дэманстрацыі 19 снежня яна «катэгарычна асудзіла».

Нягледзячы на тое, што сам працэс галасавання быў ацэнены на «добра», працэдуры значна пагоршыліся падчас падліку галасоў, нівелюючы крокі, якія былі зробленыя для таго, каб палепшыць выбары. Працэдуры падліку галасоў былі ацэненыя як «кепска» і «вельмі кепска», — канстатуюць назіральнікі місіі.

Кіраўнік кароткатэрміновай місіі назіральнікаў АБСЕ і дэлегацыі ПА АБСЕ Тоні Лойд заявіў, што «гэтыя выбары не змаглі даць Беларусі новы старт, у якім яна мела патрэбу». «Працэс падліку галасоў не быў празрыстым. Народ Беларусі заслугоўвае лепшага. У прыватнасці, зараз я чакаю, што ўрад будзе адказваць за арышты кандыдатаў у прэзідэнты, журналістаў і праваабаронцаў», — сказаў прадстаўнік арганізацыі.

Місія АБСЕ рэзюмуе, што «нягледзячы на некаторыя паляпшэнні ў выбарчым заканадаўстве, прававая база дагэтуль не дае адэкватных гарантый для правядзення выбараў у адпаведнасці з абавязальніцтвамі ў рамках АБСЕ».

Місія назіральнікаў СНД, наадварот, не выявіла фактаў, якія б ставілі пад сумненне легітымнасць прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. «Мы канстатуем, што ў Беларусі былі створаныя неабходныя ўмовы для назірання, што гаворыць аб дэмакратычнасці і празрыстасці выбарчага працэсу», — цытуе БелаПАН кіраўніка місіі назіральнікаў СНД, выканаўчага сакратара Садружнасці Сяргея Лебедзева. Больш таго, Лебедзеў заявіў, што нічога антызаконнага не бачыць у дзеяннях сілавых структур падчас разгону вулічнай акцыі 19 снежня.

Негатыўныя водгукі на дзеянні кіраўніцтва Беларусі былі ад старшыні Камітэта па міжнародных адносінах Сойма Літвы Эмануэліса Зінгерыса, кіраўніка МЗС Германіі Гіда Вестэрвеле, старшыні Еўрапейскай народнай партыі Вільфрэда Мартэнса, прэзідэнта Польшчы Браніслава Камароўскага. Старшыня Еўрапарламента Ежы Бузэк напад на Някляева назваў «баязлівай атакай». «Гэтая баязлівая атака на безабароннага кандыдата ў прэзідэнты абуральная і ганебная», — заявіў Бузэк.

Цяпер застаецца чакаць афіцыйнага рашэння ЕС адносна легітымізацыі рэжыму Лукашэнкі на наступныя пяць гадоў. ЗША ад падобнага кроку адмовіліся і, паводле афіцыйнай заявы, «не могуць пагадзіцца з легітымнасцю вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, абвешчаных беларускай Цэнтральнай выбарчай камісіяй 20 снежня». Афіцыйны Мінск на парозе новага этапу ізаляцыі з Захаду і, адпаведна, цалкам у абдымках Расіі.

Аляксандр Лукашэнка, які зусім нядаўна ганьбіў Дзмітрыя Мядзведзева, заявіў: «У нас з Расіяй дрэнных адносін не будзе. Рыхтуйцеся да таго, што ў нас будуць вельмі добрыя адносіны з Расіяй», — падкрэсліў Лукашэнка.

## Калі ўлада па-за законам

Сямёра з дзевяці альтэрнатыўных кандыдатаў у прэзідэнты аказаліся за кратамі. Візітоўку «апошняя дыктатура Еўропы» было зарана адмяняць. Вечарам 19 снежня, яшчэ да моманту абвяшчэння вынікаў выбараў, жорстка збіты кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў, якога лічылі адным з фаварытаў палітычнай гонкі. Праз некалькі гадзін моц амапаўскага кулака і дубінкі зведалі іншыя кандыдаты, а разам з імі і людзі, што прыйшлі на плошчу Незалежнасці, каб заявіць пра сваю нязгоду з дзейным рэжымам, з афіцыйнымі вынікамі выбараў.

Хуткі, жорсткі разгон, якому папярэднічалі правакацыйныя дзеянні невядомых людзей, сплюжыў на нуль азарт, запал мірнай акцыі. У сухім астатку — кандыдаты на нарах, у следчым ізалятары КДБ, так званай «амерыканцы». Цяпер там знаходзяцца ўжо экс-кандыдаты ў прэзідэнты Віталь Рымашэўскі, Андрэй Саннікаў, відавочна, Уладзімір Някляеў, Мікола Статкевіч, Алесь Міхалевіч, кіраўнік штаба Някляева Андрэй Дзмітрыеў, палітыкі Павел Севярынец, Анатоль Лябедзька.

Былога кандыдата ад партыі БНФ Рыгора Кастусёва выпусцілі вечарам 21 снежня. Кастусёў выступіў з заявай, што «асуджае правакацыі на плошчы і брутальны разгон мірных удзельнікаў акцыі пратэсту ў Мінску, жорсткае збіццё і затрыманні журналістаў і праваабаронцаў,ператрусы на офісах грамадскіх арганізацый. Вынікі выбараў, забяспечаныя такімі гвалтоўнымі дзеяннямі, не могуць быць прызнаныя за свабодныя і справядлівыя ні беларускім грамадствам, ні міжнароднай супольнасцю».

Ацэньваючы вулічную акцыю пратэсту, Рыгор Кастусёў заявіў, што «пачатак быў вельмі добры, але, на жаль, ці нас справакавалі, ці мы паддаліся на правакацыю».

## Ахвяры ці здраднікі?

Цягам першых сутак пасля выбараў экс-кандыдат у прэзідэнты ад партыі АГП Яраслаў Раманчук і кіраўнік штаба Някляева, каардынатар кампаніі «Гавары праўду» Андрэй Дзмітрыеў зрабілі заявы, якія, на першы погляд, можна расцэньваць як здраду ідэям, з якімі яны ішлі да людзей.

Яраслаў Раманчук распаўсюдзіў відэа-заяву, у якой фактычна абвінавачіў Міколу Статкевіча, Андрэя Саннікава і Віталя Рымашэўскага ў грамадскіх беспарадках і спробах захопу будынка Дома ўрада. Абвергнуць апошняе могуць тысячы людзей, якія былі 19 снежня на плошчы Незалежнасці і ўласна чулі шматразовыя заклікі кандыдатаў не паддавацца на правакацыі, не ісці на штурм, не ўступаць у канфрантацыю з міліцыяй.

Палітрада Аб'яднанай грамадзянскай партыі зрабіла заяву, што словы Раманчука адлюстроўваюць выключна яго пазіцыю. «Заява Раманчука не магла не выклікаць засмучэння. У 3 гадзіны ночы была скліканая палітрада, дзе была зробленая і ацэнка выбараў. Лукашэнка паставіў сябе па-за законам, — сказаў сябра палітрады партыі Міхась Пашкевіч. — Больш таго, тыя факты, што арыштаваныя нашы лепшыя актывісты на чале з Анатолем Лябедзькам, Андрэем Дзмітрыевым, Фёдарам Масленікавым і астатнімі, — сведчыць: партыя ведае, што ёй рабіць у гэтыя дні. АГП выходзіць на вуліцы, а не падпісвае заявы пад камерамі беларускага тэлебачання».

Затым на Першым канале беларускага тэлебачання з'явілася невялікае інтэрв'ю Андрэя Дзмітрыева, у якім ён падзякаваў міліцыянтам за іх дзеянні ля офіса Някляева, калі кандыдат быў збіты да непрытомнасці, а ўсіх, хто быў з ім, паклалі тварамі ў зямлю. Дзмітрыеў сказаў, яны з Някляевым вінаватыя ў тым, што не прад'явілі дакументаў супрацоўнікам ДАІ і не давалі абшукаць аўтамабіль. Трэба зазначыць, што на відэазапісах і Раманчук, і Дзмітрыеў выглядалі прыгнечанымі, паводзіліся нетыпова для сябе. Магчыма, у следчым ізалятары КДБ ім прад'явілі «аргументы», пасля якіх проста не магчыма было не пайсці на здзелку са сваім сумленнем.

Увогуле, аператыўнасць, зладжанасць сілавых і спецслужбаў падчас выбараў і цягам некалькіх дзён пасля наводзіць на думкі, што ўсё гэта не збег абставінаў, а спланаваныя дзеянні.

Святлана Навумава, палітолаг, сябра штабу Уладзіміра Някляева: «Ужо ёсць шэраг заяў ад прадстаўнікоў Еўропы, якія не ўхваляюць падзеі ў Беларусі. Думаю, у Лукашэнкі будуць сур'ёзныя праблемы ва ўзаемаадносінах з Еўропай. Самаізаляцыя Беларусі, уласна, і не спынялася, папросту абяцаныя 3 мільярды еўра наўрад ці нехта дасць Лукашэнку. Яго хваравітая рэакцыя на цяперашнія падзеі не паддаецца паліталагічнаму аналізу. Паслабленні, што мелі месца, гэта не яго існасць. Ён цярпеў, колькі мог. Недацярпеў».

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ЧЫРВОНА-ЗЯЛЁНЫ ТЭРОР

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Зламаныя рукі і ногі, выбітыя зубы і разбітыя галовы — такія вынікі разгону акцыі 19 снежня. Жорсткі працяг напаткаў удзельнікаў і пасля іх затрымання.**



Частку людзей прывезлі ў ізалятар на Акрэсціна, вывелі на вуліцу і паставілі ўздоўж сцяны. Людзі сталі на марозе без руху чатыры гадзіны — тварам да сцяны.

Жорстка збівалі людзей у аўтазаках. Спецназаўцы білі нагамі нават дзяўчын. Збівалі і падчас перавозкі, і калі «выгружалі» людзей з аўтазакаў: і ў РУУСах, і пасля судоў. Былі тыя, каму разбілі галовы, адбілі ныркі, і ў іх адразу пачаліся праблемы са здароўем, яны гублялі прытомнасць. «Бачылі ў Жодзіна, як людзей, калі выгружалі, вельмі моцна білі. У аднаго маладога чалавека быў і твар у крыві, і рука апухлая», — расказала праваабаронца «Вясны» Наста Лойка.

## З міліцыі ў шпіталь

Некаторыя асуджаныя змаглі патэлефанаваць. Адзін з іх, студэнт-завочнік Вячаслаў, паспеў паведаміць «Радыё Свабода»: «Білі моцна, мне дагэтуль баляць ногі. Вельмі многіх людзей білі, побач у аднаго мужчыны павыбівалі ўсе зубы, ён потым апынуўся разам з намі ў аўтазаку. У многіх акрываўленыя галовы былі, вельмі многія атрымалі страсенне, быў чалавек са зламанай рукой».

Пра зламаную руку і пашкоджаную галаву аднаго з арыштаваных, Яна Лагвіновіча, паведаміла жонка. Незалежны журналіст, які выдае бюлетэнь «За Маладзечна», асуджаны на 10 сутак. Маскоўскую журналістку Марыю Антонаву вызвалілі пасля ўмяшання агенцтва «Франс-прэс», дзе яна працуе. Яна распавяла, што ў аўтазаку затрыманых білі за любую спробу варухнуцца. Хлопцы сядзелі на падлозе і трымалі рукі на галаве.

Па інфармацыі праваабарончага цэнтра «Вясна», у шпіталях апынуліся каля 50 чалавек. Сярод арыштаваных таксама шмат у каго праблемы са здароўем. «У тым жа Жодзіна знаходзіцца некалькі чалавек у вельмі дрэнным стане. І я ўпэўнена, што такія людзі ёсць ва ўсіх ізалятарах. Улічваючы, як гэта ўсё адбывалася», — адзначыла Наста Лойка.

Пасля збіцця ў Кастрычніцкім РУУС трапіла ў шпіталь з унутранымі пашкоджаннямі актывістка Крысціна Шацікава. Студэнтцы Маі Абрамчык амапаўцы падчас захопу раздрабілі голень. А пасля яна правяла ў аўтазаку тры гадзіны. Зараз дзяўчыне зрабілі ў бальніцы аперацыю.

## Ноч у аўтазаках

Дакладна вядома, што затрыманыя ў адным аўтазаку цалкам правялі ўсю ноч. Там была даволі вялікая колькасць людзей — каля 30. Журналіст «Gazeta Wyborcza» Андрэй Пачобут таксама ўсю ноч мёрз у адным з аўтазакаў. Ён сказаў, што ў падобных умовах начавала досыць многа затрыманых. Журналіста вызвалілі пасля хадайніцтва польскага Міністэрства замежных спраў. Некаторыя паведамлялі, што знаходзяцца ў аўтазаку другія суткі — без ежы і вады. Шмат хто знаходзіўся ў камерах раённых упраўленняў міліцыі — так званых «стаканах» ці «мяшках». У людзей там не было магчымасці спаць. Іх не кармілі, не давалі вады, не пускалі ў прыбіральню.

Па дадзеных «Вясны», асуджана каля 500 чалавек. Спісы ўдакладняюцца і, магчыма, папоўняцца. У канвееры былі задзейнічаны ўсе суды Мінска — Першамайскі, Цэнтральны, Партызанскі, Ленінскі, Заводскі, Маскоўскі, Кастрычніцкі, Савецкі, Фрунзенскі. Судзілі па двух артыкулах: 23.34 (несанкцыянаванае масавае мерапрыемства) і 17.1 (дробнае хуліганства), выносілі арышты па 10 і 15 сутак. Штрафы абвяшчалі ў рэдкіх выпадках. «Былі перашкоды з боку супрацоўнікаў міліцыі ў тым, каб патрапіць на працэс. Не давалі магчымасці людзям прысутнічаць на судах. Выстаўлялі іх у калідоры, і ўвогуле выганялі з суда. У Заводскім судзе быў выпадак, калі людзей прывезлі на аўтазаку і выгрузілі пад суд. Супрацоўнікі міліцыі праз некаторы час выйшлі і папросту агучылі, каму колькі далі сутак па адміністрацыйным арышце», — сказала Наста Лойка.

## Галадоўкі

Палітыкаў і актывістаў затрымлівалі і дома. Так, у ноч з 19 на 20 снежня ў лідара АГП Анатоля Лябедзькі група асобаў узламала дзверы ў кватэру. Да палітолага Аляксандра Фядуты а 5-й гадзіне раніцы прыйшлі некалькі чалавек і «запрасілі» на гутарку ў КДБ. У сваёй кватэры затрымалі і рэдактара газеты «Товарищ» Сяргея Вазняка. Візіцёры назваліся супрацоўнікамі КДБ. Сябра Палітрады АГП, экс-прарэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Анатоля Паўлава затрымалі дома а 7-й раніцы.

Зараз усе яны ў ліку 19-ці арыштаваных змешчаны ў следчы ізалятар КДБ. Там знаходзяцца і кандыдаты ў прэзідэнты Уладзімір Някляеў, Андрэй Саннікаў, Віталь Рымашэўскі, Мікола Статкевіч, Аляксей Міхалевіч, журналісткі Ірына Халіп і Наталля Радзіна, палітык Павел Севярынец, каардынатар кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Зміцер Бандарэнка, намеснік старшыні «Маладога фронту» Наста Палажанка, моладзевы актывіст АГП Алег Корбан. Анатоль Лябедзька і Мікола Статкевіч абвясцілі галадоўку і адмовіліся даваць паказанні.

Пасля сустрэчы 22 снежня з Андрэем Саннікавым адвакат Павел Сапелка заявіў, што кандыдат моцна збіты і «ўяўляе з сябе жудаснае відовішча». Ён «практычна не можа перасоўвацца», — паведаміў адвакат агенцтву БелаПАН.

«Гэта паказальна-палітычная акцыя. Сапраўдны тэрор супраць людзей, якія проста выказаліся супраць дзеючай улады», — лічыць праваабаронца Наста Лойка.

ЛІЧБЫ

# БРУДНЫЯ ВЫБАРЫ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Выбары нельга лічыць дэмакратычнымі і празрыстымі. Працэдура падліку галасоў не можа сведчыць пра дакладнае адлюстраванне волевыяўлення выбаршчыкаў. Пра гэта заявілі прадстаўнікі кампаніі «За свабодныя выбары».**

«За гэтым сталом павінен быў ляжаць знаходзіцца старшыня Беларускага Хельсінскага камітэта Алег Гулак, які ўчора быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі». З гэтага паведамлення пачалася 20 снежня прэс-канферэнцыя прадстаўнікоў кампаніі «За свабодныя выбары».

## Блакада

Яны адзначылі, што на працягу дня 19 снежня вельмі складана было збіраць інфармацыю ад назіральнікаў у сувязі з дрэннай працай інтэрнэта. Сайты перыядычна блакаваліся. На раніцу 20 снежня праваабаронцы змаглі атрымаць інфармацыю толькі з 222 выбарчых участкаў замест запланаваных 300. У дзень галасавання на офісе праваабарончага цэнтра «Вясна» быў адключаны стацыянарны тэлефон. А ноччу міліцыя канфіскавала ўсе кампутары.

71 працэнт назіральнікаў паведаміў, што яны не маглі бачыць змест бюлетэняў. «Сябры камісіі, як правіла, калі лічылі галасы, сталі спінамі да назіральнікаў вакол стала. Такім чынам ,назіральнікі фактычна не мелі магчымасці аглядаць, што там адбываецца», — сказаў юрыст «Вясны» Валянцін Стэфановіч. А 46 працэнтаў назіральнікаў засведчылі, што камісіі не агалошвалі вынікі асобнага падліку бюлетэняў з розных скрыняў (для датэрміновага галасавання, для галасавання на ўчастку і па месцы галасавання выбаршчыкаў).

«І назіральнікі ў асноўным былі сведкамі падліку галасоў, пры якім сябры камісіі адначасова ўсе лічылі галасы, — зазначыў Валянцін Стэфановіч. — Кожны лічыў пэўную колькасць бюлетэняў, перадаючы дадзеныя старшыні камісіі, які потым запаўняў пратакол аб выніках галасавання. Такую працэдуру, па нашым глыбокім перакананні, ніяк немагчыма назваць транспарэнтнай як для назіральнікаў, так і для кожнага сябра выбарчай камісіі паасобку».

Па датэрміновым назіранні ёсць факты сур'ёзных разыходжанняў у лічбах назіральнікаў і ўчастковых камісій па колькасці тых, хто прагаласаваў. Прыводзяцца прыклады, калі на суседніх участках, дзе няма назіральнікаў, яўка выбаршчыкаў па звестках камісій у разы болей, чым там, дзе вядзецца назіранне.

## Кропкі над «і»

У СМІ з'явіліся сведчанні назіральнікаў пра фальсіфікацыі. Так, у інтэрв'ю радыё «Свабода» Дар'я Каткоўская распавяла пра маніпуляцыі з бюлетэнямі на ўчастку №17 у Фрунзенскім раёне Мінска.

«Я стаяла ў метры ад стала — мяне трымаў кіраўнік камісіі, мяне трымала міліцыя. Але, прынамсі, я бачыла, як не лічаць галасы. ...Я бачыла, што галасы адных і тых жа кандыдатаў кладуць у розныя стосы. Гэта значыць, што бюлетэні, дзе крыжыкі стаяць у розных месцах, кладуць то ў адну, то ў другую стопку».

Назіральніца галасавала на гэтым жа ўчастку і напісала на бюлетэні: «Саня паедзе ў Гаагу». Але сярод трох сапсаваных бюлетэняў яго не было. На патрабаванне Дар'і знайсці яго, бюлетэнь адшукалі ў стосе за Лукашэнку. «Гэта значыць, што калі «Саня едзе ў Гаагу», то гэты бюлетэнь чамусьці кладуць у яго стос. ...І ў выніку на нашых вачах больш за 80 працэнтаў было аддадзена Аляксандру Лукашэнку. Там быў 71 голас за Рыгора Кастусёва з дзвюх тысяч. Хаця адзіны стос, які я магла бачыць, гэта быў стос якраз за Рыгора Кастусёва. Я магу сказаць, што там было каля 200 бюлетэняў, калі яны клалі першапачаткова ў гэты стос», — паведаміла Дар'я Каткоўская.




Па папярэдніх афіцыйных дадзеных, Лукашэнка атрымаў 79,67% галасоў. Яўка на выбарах склала 90,66%. Андрэю Саннікаву далі 2,41%, Рыгору Кастусёву і Яраславу Раманчуку аднолькава — па 1,97%, Уладзіміру Някляеву — 1,77%, Віталю Рымашэўскаму — 1,1%, Міколе Статкевічу — 1,04%. А па дадзеных «нелегальнага» экзіт-пола, які праводзілі ўкраінскія спецыялісты з Міжнароднага цэнтра сацыялагічных даследаванняў «SOCIUM», Лукашэнка атрымаў 38,4% галасоў апытаных выбаршчыкаў. Уладзімір Някляеў атрымаў 18,7%, Андрэй Саннікаў — 12,2%, Мікола Статкевіч — 7,8%, Яраслаў Раманчук — 5,4%, Рыгор Кастусёў — 4,8%, Віталь Рымашэўскі — 4,1%.

«Асаблівa апошнія дні гэтай выбарчай кампаніі, а менавіта дні папярэдняга галасавання і апошні дзень, расставілі ўсе кропкі над «і», — адзначыў кіраўнік праваабарончага цэнтра «Вясна» Алесь Бяляцкі. — Мне здаецца, што калі сказаць, што гэта брудныя выбары, гэта ацэнка дакладна падыходзіць да гэтых выбараў. І здзіўляцца масаваму пратэсту, які адбыўся 19 снежня, улада асаблiва няма чаго. Таму што ісці на чацвёрты тэрмін сумлення хапае. Фальсіфікаваць выбары сумлення хапае. А масавыя пратэсты ўспрымаць сіл не хапае».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 27 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 00.55** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** У цэнтры ўвагі.
**10.35** Культурныя людзі.
**11.05** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.10** Рамантычная камедыя «Змёрзлая з Маямі» (ЗША).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.35** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.15** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.25** Інфармацыйная праграма «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Відэафільм АТН «Зямля святой Ніна».
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-5» (ЗША).
**23.25** Камедыя «Пераježыць Каляды» (ЗША).
**01.00** Дзень спорту.
**01.15** Хакей для ўсіх.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 00.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здарова!».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Выклік». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.50** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Галасы».
**22.20** Фільм «Анёлы Чарлі».
**00.20** Навіны спорту.
**00.25** «Заўсёды Ваш, таварыш Сухаў».
**01.25** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**02.10** «Хай кажуць».
**03.00** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** Фільм «Дзе знаходзіцца Нофелет?». СССР, 1987 г.
**15.10** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «У тэму». Актуальнае інтэрв'ю.
**20.30** Фільм «Тата напракат». Расія - Украіна, 2008 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Проста сябры». Германія - ЗША - Канада, 2005 г.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.00** Навагодняя камедыйная меладрама «Дзяўчынкі» (Расія). 1-я серыя.
**10.00** Калядная меладрама «Са святам нішто не параўнаецца» (ЗША).
**11.50** Пра мастацтва.
**12.20** Школа рамонту.
**13.25** Прэм'ера. «Халі-галі». Скетч-шоў.
**14.00** «Прыгоды Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя» (СССР). 1-я серыя.
**15.10** Мультсерыял «Драконччык і яго сябры» (Канада).
**15.25** Пазакласная гадзіна.
**15.40** Тэлебарометр.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Камедыйная меладрама «Дзяўчынкі» (Расія). 1-я серыя.
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.25** «Навагодні жарт з…» Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.30** Калыханка.
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** Беларуская часіна.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Арсенал-Чэлсі. Прамая трансляцыя.
**23.55** Авертайм.
**00.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**01.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Гарадок».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** Прэм'ера. «Мужчынская праца». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Святочны канцэрт.
**22.25** Тэлесерыял «Сівы конь».
**23.25** «Нічога асабістага».
**23.40** Навіны - Беларусь.
**23.50** «Весткі.ru».
**00.05** Прэм'ера. «Гарадок».

НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.40** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.45** Прэм'ера. Серыял «Брат за брата».
**00.05** «Капітал. ru».

EUROSPORT

**09.30** Скачкі з трампліна. Турнэ 4-х трамплінаў. Часопіс.
**10.30, 11.30, 20.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**12.30, 13.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Чэхіі (Гарахаў). HS 142.
**14.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Іспаніі (Барселона). Фотафініш. Часопіс.
**15.45, 16.15** Тэніс. «Цікавае са свету тэніса». Часопіс.
**16.45, 17.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). HS 137.
**18.45** Фінішная прамая. Зімовыя алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Часопіс.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Госць тыдня. Часопіс.
**21.05, 21.30** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30, 23.25, 00.25, 01.25** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Род Радзівілаў» .
**07.40** Хто ёсць кім?: Уладзімір Чыквін.
**08.00** ПраСвет.
**08.25** Эксперт.
**08.45** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.20** Басанож па свеце: «Хатні слон».
**09.45** Дак. гадзіна: «Камунізм гісторыя адной ілюзіі», дак. фільм, Германія: 3 серыя: «Камунізм: гісторыя адной ілюзіі».
**10.35** «Час гонару», серыял: 9 серыя.
**11.25** Фільматэка майстроў: «Плецены чалавек», маст. фільм, ЗША–Канада–Германія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Час гонару», серыял: 9 серыя.
**18.15** «Царква на мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**18.45** Госць «Белсату» .
**19.00** Хто ёсць кім?: Уладзімір Чыквін.
**19.20** Калыханка для самых маленькіх.
**19.30** Еўропа сёння.
**20.00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Ізгоі», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.45** Фільматэка майстроў: «Плецены чалавек», маст. фільм, ЗША–Канада–Германія.
**23.25** Аб'ектыў.

## 28 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.35** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.25** Відэафільм АТН «Зямля святой Ніна».
**12.10** Лірычная камедыя «Адзін у Навагоднюю ноч» (Украіна). 1-я серыя.
**14.05** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Канцэрт «Першы віншуе Беларусь».
**17.15** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Серыял «Доктар Хаўс-5» (ЗША).
**23.15** Камедыя «Тэрмінова патрабуецца Дзед Мароз» (Украіна).
**00.55** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 00.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Выклік». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Уцёкі».
**22.20** Фільм «Анёлы Чарлі - 2».
**00.35** Навіны спорту.
**00.40** «Зваротны адлік».
**01.10** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**02.00** «Хай кажуць».
**02.50** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Тата напракат». Расія - Украіна, 2008 г.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Правілы згону». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Сустрэчная паласа». Серыял. Заключная серыя.
**23.55** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял. Заключныя серыі.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.00** Камедыйная меладрама «Дзяўчынкі» (Расія). 2-я серыя.
**10.00** Музычная камедыя «Зімовы вечар у Гаграх» (СССР).
**11.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**12.35** Авертайм.
**13.10** Дакументальны фільм «Перамога Сезана» (Францыя).
**14.05** «Прыгоды Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя». 2-я серыя.
**15.20** Мультсерыял «Драконччык і яго сябры» (Канада).
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Камедыйная меладрама «Дзяўчынкі» (Расія). 2-я серыя.
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.25** Музычная камедыя «Зімовы вечар у Гаграх» (СССР).
**21.10** Калыханка.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.15** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.50** «Спорт-кадр».
**00.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Бірмінгем-Манчэстэр Юнайтэд.

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Драма Івана Броўкіна». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Святочны канцэрт.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Фільм «Школа пражывання».
**22.20** Тэлесерыял «Сівы конь».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Шынок краіны Саветаў». Дак. фільм.

НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.45** Прэм'ера. Серыял «Брат за брата».
**23.40** Сёння.
**00.05** Серыял «Вінтавая лесвіца».

EUROSPORT

**09.30** Дзюдо. Турнір Вялікага шалома ў Японіі (Токіо).
**10.05, 15.15** Вось дык так!!!
**10.30, 15.45** Скачкі з трампліна. Турнэ 4-х трамплінаў. Часопіс.
**11.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Семерынг). Жанчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.30, 13.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). HS 137.
**14.30, 18.15, 01.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Семерынг). Жанчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба.
**16.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 137. Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**19.55** «Алімпійскія гульні. Лондан». Часопіс.
**20.00** Ралі. «Шлях да Дакара». Часопіс.
**20.15, 00.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 137. Кваліфікацыя.
**21.00** Веласпорт. Агляд сезону. Часопіс.
**22.00** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**22.30** Бокс.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**02.15** Ралі. «Шлях да Дакара». Часопіс.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** «Час гонару», серыял: 9 серыя.
**08.50** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Ізгоі», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**10.10** «Мой родны горад», серыял.
**10.35** Невядомая Беларусь: «Царква на мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**11.00** Хто ёсць кім?: Уладзімір Чыквін.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 17 серыя.
**18.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.40** «Лебядовыя гады», дак. фільм, 2008 г.
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Род Радзівілаў».
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.10** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**22.05** «Доктар Марцін», серыял.
**22.50** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 29 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.05** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.15** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Камедыя «Адзін у Навагоднюю ноч» (Украіна) . 2-я серыя.
**14.05** Здароўе.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Праграма «Акно ў Еўропу».
**16.25** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**17.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.40** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Серыял «Доктар Хаўс -5» (ЗША).
**00.10** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.25** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Выклік». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Уцёкі».
**22.20** Асяроддзе пасялення.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.30** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**02.10** «Хай кажуць».
**03.00** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Правілы згону». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Правілы згону». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** Фільм «Гэта я». Украіна, 2009 г.
**00.30** СТБ прадстаўляе: «Ноч збывання жаданняў». Музычная казка.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.40** Камедыйная меладрама «Дзяўчынкі» (Расія). 3-я серыя.
**10.45** Спорт-кадр.
**11.10** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.00** «Запал па культуры».
**12.50** Медычныя таямніцы.
**13.20** «Лабірынты гісторыі беларускага фотамастацтва».
**13.50** Прыгодніцкая камедыя. «Вакацыі Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя» (СССР). 1-я серыя.
**15.05** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.40** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.50** Камедыйная меладрама «Дзяўчынкі» (Расія). 3-я серыя.
**18.55** Хакей КХЛ. «Дынама» (Мінск)-«Атлант» (Маскоўская вобл.). Прамая трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.25** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.05** Камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**23.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Ліверпуль-Вулверхэмптан.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мая цудоўная лэдзі. Таццяна Шмыга». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Фільм «Школа пражывання».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Фільм «Школа пражывання».
**22.25** Тэлесерыял «Сівы конь».
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Эпоха вялікага Кручкова». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.40** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Вочная стаўка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Развод па-руску».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.40** Прэм'ера. Серыял «Брат за брата».
**00.05** Серыял «Вінтавая лесвіца».

### EUROSPORT

**09.30, 10.00** Весь дык так!!!
**10.30** Усе віды спорту. Топ-10. Часопіс.
**11.30, 15.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 137. Кваліфікацыя.
**12.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Барміо). Мужчыны. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
**14.15** Усе віды спорту. Топ-10. Часопіс.
**16.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Семерынг). Жанчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**16.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 137. Прамая трансляцыя.
**18.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Семерынг). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**21.00** Снукер. Агляд сезону. Часопіс.
**22.30** Покер. Турнір Партуш (Францыя).
**00.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 137.
**01.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Семерынг). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба.
**02.15** Футбол. Еўрагалы. Госць тыдня. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Сальда (эканамічная праграма).
**08.05** Беларусы ў Польшчы.
**08.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.30** ПраСвет.
**09.00** Рэпартэр.
**09.25** Невядомая Беларусь: «Лебядовыя гады», дак. фільм, 2008 г.
**09.55** Вагон.
**10.00** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Род Радзівілаў».
**10.10** «Мой родны горад», серыял.
**10.35** «Доктар Марцін», серыял.
**11.25** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 17 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Доктар Марцін», серыял.
**18.15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларуска-літоўскае летапісанне».
**18.25** «А калі б так здарылася?», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах.
**20.10** Вагон.
**20.15** Навігатар.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Кітайцы атакуюць», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**21.45** Эксперт.
**22.05** «З Новым годам!», маст. фільм, 1973 г., Францыя.
**00.00** Аб'ектыў.

## 30 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.50** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 00.50** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Прэм'ера. Камедыя «Папараца» (Расія).
**14.10** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Канцэрт.
**16.50** Серыял «Спальны раён» (Расія). Заключныя серыі.
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Драматычны серыял «Доктар Хаўс-5» (ЗША). Заключныя серыі.
**23.50** Канцэрт.
**00.55** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Выклік». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.40** «Поле цудаў». Навагодні выпуск.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Здабыткі Рэспублікі».
**00.05** Нашы навіны.
**00.20** Навіны спорту.
**00.25** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Камедыя «Мы з джазу».
**02.45** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Правілы згону». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Правілы згону». Серыял. Заключная серыя.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** Фільм «Каханне яшчэ быць можа». Расія, 2008 г.
**00.40** СТБ прадстаўляе: «Дзень Нараджэння ў Новы год».

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.20** Камедыйная меладрама «Дзяўчынкі» (Расія). 4-я серыя, заключная.
**10.20** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**10.40** Жансавет.
**11.20** «30-ы Міжнародны фэст цырку будучыні». Забаўляльная праграма (Францыя).
**12.30** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**12.50** «Дача здароўя».
**13.20** Смешная часіна.
**13.55** Прыгодніцкая камедыя. «Вакацыі Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя» (СССР). 2-я серыя.
**15.10** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**15.25** Пазакласная гадзіна.
**15.40** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Камедыйная меладрама «Дзяўчынкі» (Расія). 4-я серыя, заключная.
**19.10** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.25** Музычная камедыя «Карнавальная ноч» (СССР).
**21.00** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Канцэрт групы «Мумій Троль».
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Яе лёдавая Вялікасць. Алена Чайкоўская». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Фільм «Школа пражывання».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.25** Тэлесерыял «Сівы конь».
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Як запальвалі «Агеньчык». Сакрэты навагодняга эфіру». Дак. фільм.
**00.25** Камедыя «Сватаўство гусара».

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Мама ў вялікім горадзе».
**09.00** «Жывуць жа людзі!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Прасплявана ў СССР».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Баявік «Кодэкс гонару».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…ў Новы год».
**20.35** «Чыстасардэчнае прызнанне». Навагодні выпуск.
**21.35** Прэм'ера. Фільм з цыклу «Аддзел».
**23.30** «Нтвшнікі». Арэна вострых дыскусій.
**00.25** Навагодняя камедыя «О'кей!».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. «Шлях да Дакара». Часопіс.
**09.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Барміо). Мужчыны. Хуткасны спуск.
**10.30, 14.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 137.
**12.00** Веласпорт. Агляд сезону. Часопіс.
**13.00** Снукер. Агляд сезону. Часопіс.
**16.00** Хакей. Кубак Шпэнглера (Давос, Швейцарыя). 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**18.15** Усе віды спорту. Топ-10. Часопіс.
**19.00** Біятлон. Калядная гонка (World Team Challenge) у Германіі (Гельзэнкірхен). Прамая трансляцыя.
**21.00** Фігурнае катанне. Паказальныя выступы (Оберстдорф, Германія). Прамая трансляцыя.
**23.30** Спартовыя бальныя танцы. Чэмпіянат свету па лацінаамерыканскіх танцах (Інсбрук, Аўстрыя).
**00.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. К 1. Сусветны Гран-пры (Токіо, Японія). Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** «Доктар Марцін», серыял.
**08.35** Эксперт.
**08.55** «А калі б так здарылася?», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**09.35** Вагон.
**09.40** Без рэтушы: «Кітайцы атакуюць», рэпартаж, 2010, Польшча.
**10.00** Навігатар.
**10.25** Асабісты капітал.
**10.40** «Мой родны горад», серыял.
**11.05** Госць «Белсату».
**11.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Беларуска-літоўскае летапісанне».
**11.30** «З Новым годам!», маст. фільм, 1973 г., Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.30** «З Новым годам!», маст. фільм, 1973 г., Францыя.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** Вагон.
**20.15** Басанож па свеце: «Хатні слон».
**20.40** Хто ёсць кім?: Андрэй Такінданг: «...апрануўшы белую кашулю...»
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 13 серыя.
**22.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Бялінская, 6», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**23.05** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

**Выпуск №14 (52) (снежань)**

www.lit-bel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

**Анонс**

**«НАВІНЫ»: грамадска-літаратурнае жыццё снежня** ........ с. 2.
**«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Рыгора БАРАДУЛІНА** ........ с. 3.
**«ЛЕКТОРЫЙ»: штрыхі да творчага партрэта Генрыха ДАЛІДОВІЧА** ........ с. 4.
**«ЗАПІСЫ»: старонкі з дзённіка Ніла ГІЛЕВІЧА** ........ с. 5.
**«ПРОЗА»: мініяцюры Славаміра АДАМОВІЧА** ........ с. 6.
**«ПАЭЗІЯ»: вершы Віктара СЛІНКА** ........ с. 7.
**«ПРОЗА»: эсэ Алы СЯМЁНАВАЙ** ........ с. 8–9.
**«ПАЭЗІЯ»: пераклады вершаў Ёнаса ЛІНЯЎСКАСА** ........ с. 10.
**«КРЫТЫКА»: «ДЗЕЯ СЛОЎ», літагляд ад ЛеГАЛА** ........ с. 11.
**«ГОТЛАНДЫЯНА»: роздумы-эсэ Валерыя СТРАЛКО і Сяргея АСТРАЎЦА пра Дом пісьменнікаў і перакладчыкаў у Візбю** ........ с. 12–13.
**«ШКАЛЯРЫЙ»: Уладзімір АРЛОЎ пра Ларысу ГЕНІЮШ і Уладзіміра КАРАТКЕВІЧА** ........ с. 14–15.
**«ПАНАРАМА»: дзесяць топ-справаў Саюза беларускіх пісьменнікаў** ........ с. 16.

**ВІНШАВАНКА**

# КАЛЯДНАЕ

**Валерыя КУСТАВА**

*Мэры Крыстмас! Глянь наўкола!*
*І прыйдзі, святы Мікола,*
*снегам поўніць далягляды*
*на Каляды, на Каляды!..*

*Не праз сінія этэры,*
*а праз комін у кватэры.*
*Ды ў шкарпэткі пакладзі*
*дзівы — о-дзі-ры-дзі-дзі!*

*Як анёлак б'е ў курантны,*
*прамаўляю модлы-мантры:*
*дай нам, Звышні, на Каляды*
*шчасця ў горад наш праклятты.*

*Дай нам добрае надвор'е*
*без глабальных пацяпленняў.*
*Дай дзівоснае сузор'е,*
*дзе Венера з Марса млее.*

*Дай шалёных закаханняў*
*і каханых найшалёных,*
*каб у кожным у дыханні*
*любыя пачуць імёны.*

*Шчодры вечар. Шчыры вечар —*
*Добраму святому люду.*
*Словы простыя і рэчы*
*зіхацяць прадвеснем цуду.*

*Калі быў зусім малечай,*
*я прасіў узяць на плечы*
*ў таты, мамы і ў дзядулі —*
*ды круціў з вышыняў дулі.*

*А цяпер прашу я ў Бога,*
*бо галоўны Ён Мікола,*
*каб пакутную дарогу*
*не разбіла часу кола.*

*Як раней прасіў я цацкі,*
*шчанюка і шмат цукерак,*
*так цяпер прашу я ласкі*
*боскай і людзей даверу.*

*Я раней дурнеў на святы,*
*у зімовай завірусе*
*кідаў ледзяшамі ў брата*
*і ў сумёт хавацца мусіў.*

*А цяпер гляджу я ў неба*
*кожнаю каляднай ноччу.*




*Падарункаў мне не трэба,*
*толькі б, Божа, мне не збочыць…*

*На Каляды… На Каляды*
*Пахне цытрусавай елкай.*
*Ліхі ўсе і нашы звады*
*заліваем мы гарэлкай.*

*На Каляды… На Каляды*
*Беларусі роднай зычу*
*новай праўды, новай рады,*
*новага жывога клічу.*

*Новага-старога сцягу.*

*Новага-сівога гімна.*
*Каб на еўрапейскім шляху*
*ды не згінуць.*

*Каб зямля нам нарадзіла*
*Каліноўскіх і Скарынаў.*
*І каб не ўцякла радзіма*
*за кардон ці за адрыну.*

*На Каляды! На Каляды*
*Казкай поўніць далягляды.*
*Снегам поўніць туманы.*

*…А ўначы гучаць званы...*

**ІНТЭРВ'Ю**

# Васіль ЗУЁНАК: «НА ПЕРАСЯЧЭННІ ПАРАЛЕЛЯЎ»

***— Васіль Васільевіч, мы ведаем вас не толькі як паэта, але і як крытыка і літаратуразнаўцу. Чым, на ваш погляд, цікавая сучасная беларуская літаратура?***

— Яна цікавая і сур'ёзна грунтоўная... Адольваючы выдавецка-фінансавыя цяжкасці, літаратура нашая не ўпала ў нямогласць. Жывуць — і паэзія, і проза, і крытыка... Дастойна, хоць найчасцей і безганарарна, працуюць... — хацеў во пачаць пералік, ды спахапіўся: дужа доўгі спіс атрымаецца... Таму запыню ўвагу ўсяго толькі на адной «сілавой лініі» — публіцыстычнай, — на яе самых вузлавых, найбольш характэрных, асаблівых, а то і эксклюзіўных момантах. А гэта — перадусім — тое, што сёння найперш чытаецца і чакаецца: эсэістыка — самых розных тэматычных і выяўленчых накірункаў, жывое публіцыстычнае слова... «Любоў прасветлая». Ніл Гілевіч — без перабольшання можна сказаць: тытанічнае змаганне за родную мову — як несмяротную душу народа, яго існасць і заруку будычыні. Не асобны артыкул, эсэ ці выступ — а Кніга, вартая многіх тамоў. А следам за ёй — яшчэ адна: «Толькі мы самі» — з такім жа змагарным публіцыстычным настроем...



Паралелі адкрываюцца нечаканыя. От жа чытаю новую паэтычную кнігу Генадзя Бураўкіна «Лісты да запатрабавання» — вершы: і самотны роздум, і чалавечы боль, і — адзіны сцяты кулак, гатовы да байцоўскага ўдару, але адначасна гатовы і разгарнуцца ў далоню — для сяброўскага поціску рукі...

Згадваецца і «Дзікае паляванне ліхалецця» — кніга Віктара Казько, кніга-расследванне, кніга-дыягназ і кніга-споведзь... У гэтым жа шэрагу стаяць і эсэістычныя кнігі Анатоля Кудраўца, Янкі Сіпакова, Анатоля Бутэвіча, якія з поспехам абжывае нішу навукова-пазнавальнай літаратуры, Леаніда Дранько-Майсюка з яго «віленскімі пілігрымкамі»...

Суцяшальна не прэтэндуе на тэматычную «аўтаномію» літаратура гістарычная: лінія яе пазначана памкненнем да перасячэння з лініяй самай што ні ёсць гарачай сучаснасці, — Леанід Дайнека, Уладзімір Арлоў... аднак жа, аднак — дамаўляліся... Нямала слаўных імёнаў! — і, паўторым, ва ўсіх жанрах.

***— Ці знаходзіце вы час, каб пачытаць маладых? Што пажадаеце тым, хто сёння ідзе ў літаратуру?***

— Чытаю, а як жа. І кожны раз з надзеяй: вось-вось успыхне яркае, непаўторнае, каб такіх не было да гэтага, адно-адзінае ў сваёй творчай выключнасці, тое самае Перасячэнне. На жаль, на жаль... Часцей трапляюцца бяскроўныя, худасочныя паўторы і перайманні з даўно перахвораных і асуджаных на творчае адмаўленне іншымі паэзіямі «ўзораў»... Не тут і не тыя пошукі. Паэзію не падманіш. Схема тут не праходзіць. Паэзія нараджаецца на роднай глебе і жывіцца лёсам таго, хто ўзяўся за творчае пяро. Адваротнага яшчэ нікому не ўдавалася даказаць. Кніга, твор — у эпіцэнтры, на перасячэнні дзвюх творчаносных і творчадайных сіл: жыццё і мастак з яго лёсам, — дай жа Божа, каб не былі вызначаныя яны лініямі, якія ніколі не перасякуцца, так і пройдуць «паралельнымі недатклівкамі»...

***— Шаноўны Васіль Васільевіч, нядаўна выйшла вашае «Выбранае» ў паважанай серыі «Беларускі кнігазбор». Што для Вас асабіста — выхад новай кнігі?***

— Перш чым аб'явіць аб радасці, паклікаанай новаю кнігай, абстрагуемся (выбачаючы «матэматычны празаізм»: рэмарка вымагае). Дык вось, — магчыма, і занадта адвольная метафара, бо няма, ды і ці будзе знойдзена яна, тая формула, якую давёў Лабачэўскі ў матэматыцы, абвергнуўшы, здавалася б, непахісны пастулат, што дзве паралельныя не перасякаюцца. Зямное ўяўленне абвяргаецца касмічным... У нас жа выпадак асаблівы: дзве гэтыя лініі зліваюцца ў адну. І наканавана ёй альбо не дадзена знайсці перасячэнне з сілавою «лініяй жыцця» (таксама ў адзінстве: агульнага і асабістага). Няхай сабе гэта будзе кніга ці нават асобны верш. Тут кропка перасячэння — нябеснага і зямнога. Тут якраз і пачынаецца: сумненні, сумненні, сумненні... Перад імі заўсёды стаіш, выпускаючы ў людзі новую кнігу. Толькі закончаны графаман шчасліва не сумняваецца.

Кніга — і радасны падрахунак, і сур'ёзны экзамен. Асабліва — калі яна такая: «Кнігазбораўская». Яна, само сабою, становіцца як бы ўпоплеч з кнігамі класічнага ўзору. А ці наблізілася да іх? Як тут не пахваляваліся! Тройчы (а то і больш) давялося перасейваць ранейшыя кнігі і публікацыі. Чытаць, перачытваць... Адлучаць верш, зноў вяртаць... А тут яшчэ — фармат серыі, пэўны аб'ём... Далібог, ці не лягчэй верш было напісаць, чым вызначыць яго «кнігазбораўскі» статус... Але, нарэшце, — кніга ёсць! Якая яна, ці сышліся, ці перасекліся ў ёй тыя вызначальныя «лініі», — меркаваць чытачу...

**Алесь Сачанка**

СЕМІНАР

# ЖАНОЧЫ ДОСВЕД У ЛІТАРАТУРЫ І ГРАМАДСТВЕ

**Упершыню ў Беларусі з ініцыятывы Саюза беларускіх пісьменнікаў адбыўся свабодны семінар «Жаночы досвед у літаратуры і грамадстве», прысвечаны гендэрнай тэматыцы ў беларускай літаратурнай прасторы.**



Семінар стаў своеасаблівым падрахункам праведзенага старэйшай творчай арганізацыяй Беларусі літаратурнага конкурса «Жанчына ў сучасным грамадстве», у якім прынялі ўдзел каля 80 аўтараў.

«Мы заўважылі, што сярод аўтараў-пачаткоўцаў 90% складаюць жанчыны, але да першай кнігі даходзяць адзінкі, а ў Саюз уступаюць адзінкі з тых адзінак, — адзначыў першы намеснік Саюза беларускіх пісьменнікаў Барыс Пятровіч. — На якім этапе мы страчваем жанчын? Чаму? У школьныя, студэнцкія гады дзяўчаты актыўна пішуць, друкуюцца, а потым, калі сутыкаюцца з жыццём, першымі сямейнымі клопатамі, то перастаюць пісаць.

Канечне, праблема і ў нашай дзяржаве, якая мала не займаецца падтрымкай творчых асобаў. Выдаць кнігу любому аўтару сёння цяжка... Мы бачым вялікі патэнцыял у тым, каб як мага больш аўтараў-жанчын дайшлі да сваёй першай кнігі. Мы хацелі б зразумець, што Саюз пісьменнікаў можа зрабіць, каб гэтых стратаў было менш.

Мы ведалі, што самая прасунутая краіна ў свеце ў аспекце гендэрнай праблематыкі — Швецыя, таму скантакталіся з нашымі сябрамі, Шведскім саюзам пісьменнікаў. Атрымаўся добры сімбіёз».

Са шведскага боку дакладчыкам па тэме «Літаратурная творчасць і правы літаратарак у Швецыі» выступіла пісьменніца, літаратурны крытык і выкладчыца літаратурнага мастацтва Інга-Ліна Ліндквіст. Яна з радасцю падзялілася з прысутнымі (беларускімі літаратаркамі і паэткамі, а таксама прадстаўніцамі грамадскіх жаночых арганізацый Беларусі) асабістым досведам, а таксама расказала аб гендэрнай сітуацыі ў Швецыі:

«Шведкам карысна было б прыехаць сюды, паглядзець, што такое сапраўдныя праблемы, каб яны зразумелі, што ў іх праблем няма. Жаночы рух у Швецыі развіваўся, як і еўрапейскі, ішоў поруч з сацыял-дэмакратыяй, барацьбой за права голасу. У сучаснай Швецыі раўнапраўе — адна з асноваў дзяржаўнай палітыкі. Усе партыі — за раўнапраўе. Шведы лічаць сябе самым раўнапраўным народам у свеце. Для жанчын няма ніякіх перашкодаў з пункту гледжання заканадаўства. Жанчына можа стаць кім хоча... Што мяне хвалюе, дык гэта наколькі сегрэгаваны рынак працы ў Швецыі. Напрыклад, жанчын-будаўнікоў там амаль няма (98% — мужчыны), а ў сферы аховы здароўя, дзіцячых садкоў, дашкольнай і школьнай адукацыі працуюць выключна жанчыны (97%). Да таго ж, у Швецыі няма хатніх гаспадыняў, у кожнай сям'і працуюць і мужчына, і жанчына.

Што ж да творчасці і літаратуры, то ў Швецыі раўнапраўе. Жанчыны-пісьменніцы заўсёды на вышыні, атрымліваюць прызы, стыпендыі. У Саюзе пісьменнікаў Швецыі старшыня мужчына, але яго намеснік — жанчына, быў перыяд, калі старшынёй была жанчына.

Цяпер у Швецыі вельмі папулярная аўтабіяграфічная проза. Усе пішуць пра сябе. І вось што выклікае ў нас найбольшыя спрэчкі: жанчын, якія пішуць пра сябе, больш крытыкуюць, чым мужчын. Мужчынам пры гэтым выказваюць павагу, а калі жанчына піша пра сябе — гэта скандал: «Ды як яна магла, як насмелілася называць імёны...»».

Вельмі цікава было даведацца пра педагагічныя аспекты ў дачыненні да дзіцячай літаратуры: у творах шведскіх аўтараў дзеці могуць расці ў няпоўнай ці аднаполай сям'і, яны могуць расказваць пра дзяцей з сіндромам Даўна, пра аўтыстаў.

«Такія кнігі маюць высокі літаратурны стандарт, ёсць разуменне, што некаторыя рэчы неабходна паказваць, называць — гэта вельмі важная задача педагагічнай дзіцячай літаратуры», — дадала спадарыня Ліндквіст.

Беларуская пісьменніца Людміла Рублеўская падкрэсліла:

«Радуе, што цяпер з'яўляецца шмат таленавітых маладых пісьменніц, якія пішуць цудоўную жаночую прозу. Але мастацкія творы па-ранейшаму ўзважваюцца як дыстыляваная вада: вось пра гэта пісаць можна, пра гэта — нельга. Уласна кажучы, нашае грамадства застаецца патрыярхальным, і гендэрнай роўнасці ў нас пакуль няма».

У сваім дакладзе «Гендэр і сучасная беларуская літаратура» малады крытык Маргарыта Аляшкевіч на падставе шматлікіх прыкладаў вылучыла тэмы, жанры, якія часцей выкарыстоўваюць жанчыны-літаратары ў сваёй творчасці, і аптымістычна падагульніла: «Ёсць пэўная роўнасць, ёсць пэўная рознасць. І гэта — цудоўна».

Сваімі развагамі па выніках трох публічных дыскусій на тэму «Ці патрэбная Беларусі жаночая літаратура» падзялілася Аляксандра Дынько:

«Для мяне жаночая літаратура — гэта не літаратура, якая залежыць ад полу яе аўтара, а літаратура, якая выяўляе ўнікальны жаночы досвед, унікальнае жаночае жыццё і быццё. Першая дыскусія, удзел у якой узялі літаратары і крытыкі, атрымалася вельмі вострая. На другую сустрэчу да нас прыйшлі студэнты, непасрэдныя сённяшнія чытачы, якім была дадзеная магчымасць свабодна выказацца наконт таго, чаго чакае моладзь ад сучаснай кнігі, напісанай жанчынай. Трэцяя сустрэча прайшла з удзелам актывістак жаночых арганізацый».

Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч адзначыў:

«Для нас нават сама пастаноўка «гендэрнага» пытання — гэта ўжо поспех. Бо і папярэдняе анкетаванне, і размовы з аўтаркамі-жанчынамі выявілі амаль татальнае неразуменне ўзнятых на гэтым семінары праблем. А вось сабраліся, пачалі дыскутаваць, і выявілася, што ў нас праблемаў не менш, чым у Іране ці ў Швецыі. Іншая рэч, што гэтыя праблемы вырашаюцца па-рознаму, як у творчасці, так і ў палітычным, сацыяльным жыцці. Застаецца традыцыя, нацыянальная беларуская культура, дзе яшчэ з пячорных часоў мужчына-здабывальнік павінен быў клапаціцца пра бяспеку сям'і, а жанчына была і апякункай «сямейнага вогнішча», і своеасаблівы прыдатак да яго... Як бачна на шведскім досведзе, не мужчыны-літаратары ўздымалі гэтыя праблемы. Шведскія мужчыны такія ж, як і беларусы. Ім таксама шмат што не падабаецца, яны таксама хочуць быць, як і ў часы вікінгаў, асноўнымі і першымі, а не толькі быць прадстаўленымі пяцідзесяцю адсоткамі ў парламенце... Але самі жанчыны, у тым ліку і ў Саюзе пісьменнікаў, іншых творчых саюзах Швецыі, паставілі іх перад такімі ўмовамі. Адсюль і вынікае нашая сённяшняя галоўная задача — найперш не вырашаць пытанні гендэрнага сужыцця, а запаліць вочы жанчынаў-творцаў, каб яны пабачылі, што справа выжывання — гэта іх грамадскі клопат».

Грунтоўны экскурс у гісторыю жаночага руху ў Беларусі (пачынаючы ад дзейнасці Алаізы Пашкевіч-Цёткі) быў зроблены ў дакладзе Валянціны Коўтун, заснавальніцы адной з першых жаночых арганізацый Беларусі — Міжнароднага жаночага фонда святой Ефрасінні Полацкай.

«Асабліва актыўна жаночы рух пачаў развівацца ў перыяд перабудовы, калі жаночыя аб'яднанні востра падымалі сур'ёзныя і важныя пытанні абароны правоў жанчын. У яго ўваходзілі не толькі пісьменніцы, акторкі, доктаркі, навукоўцы, журналісткі. Тады гэта была сапраўды з'ява. Жаночы рух на Беларусі сёння — гэта той рух, які падымае вялікія пласты праблемаў жанчын, мае магутныя пісьменніцкія карані».

Старшыня Грамадскага аб'яднання «Беларускі жаночы інфармацыйна-каардынацыйны цэнтр» Святлана Бястужава прызналася, што «яшчэ 15 гадоў таму ад паняцця «гендэр» усе ўцякалі, варта было толькі загаварыць пра «гендэрную роўнасць», «гендэрныя прынцыпы». Цяпер і чыноўнікі, і абываецелі ведаюць, што азначаюць гэтыя паняцці, у чым, безумоўна, ёсць заслуга жаночых арганізацый Беларусі».

У другой частцы семінара спадарыня Інга-Ліна Ліндквіст у ролі літаратурнага крытыка дала ацэнку пяці творам пераможцаў літаратурнага конкурса «Жанчына ў сучасным грамадстве» (якія прачытала ў арыгінале па-беларуску).

«Як літаратурны крытык, — адзначыла яна, — я разглядаю любы літаратурны твор з трох пазіцый: гендэр, клас, этнас. У вас ужо бяскласавае грамадства, як я разумею. Пры гэтым ні жанчын, ні сучаснасці, як ні шукала, я не знайшла. Затое я ўбачыла апантанасць этнасам, гісторыяй краіны, але нічога дзіўнага ў гэтым няма, бо шмат чаго ў ёй адбылося, і ў гэтым яшчэ трэба разабрацца».

Напрыканцы семінара адбылося ўганараванне пераможцаў конкурсу, прысвечанага гендэрнай праблематыцы ў сучаснай беларускай літаратуры. Сярод аўтараў, якія даслалі свае творы, былі не толькі жанчыны, але і мужчыны, прадстаўнікі розных пакаленняў, рэгіёнаў Беларусі, стыляў, жанраў. Журы Саюза беларускіх пісьменнікаў выбрала 10 найлепшых і агучыла лаўрэатаў, якія занялі тры першыя месцы. Уладальнікамі лаўрэацкіх дыпломаў і прэміі сталі пісьменніцы Данута Бічэль-Загнетава, Галіна Багданава і Людміла Рублеўская.

Усе лаўрэаты конкурсу — Сяргей Егарэйчанка, які дэбютаваў аповесцю, Паліна Качаткова, Раіса Крывальцэвіч, Міхась Мірановіч, Любава Незабава, Анка Упала, Алеся Лапіцкая — атрымалі гадавую падпіску на адзін з найлепшых беларускіх штотыднёвікаў — газету «Новы час» з дадаткам «Літаратурная Беларусь».

**Зарына Кандрацьева, budzma.org**

ПАДЗЕІ

# У ГОНАР БЕЛАРУСКАГА ЭНЦЫКЛАПЕДЫСТА

**Вечарына, прысвечаная 80-годдзю драматурга, гісторыка і грамадскага дзеяча Алеся Петрашкевіча, прайшла 11 снежня ў менскай штаб-кватэры Грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны».**

Арганізатарам выступіў старшыня Партызанскай рады Менскай гарадской арганізацыі ТБМ мастак Аляксандр Цыркуноў.

Старшыня ТБМ Алег Трусаў назваў Петрашкевіча «энцыклапедыстам і беларускім Леанарда да Вінчы», які ў адной асобе злучыў постаці высокапастаўленага чыноўніка, драматурга і навукоўца. Менавіта дзякуючы Алесю Петрашкевічу і Петрусю Броўку ў Беларусі было створана выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя», выйшлі кнігі памяці — 145-томная серыя гісторыка-дакументальных хронік раёнаў і гарадоў Беларусі, шматтомны «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» ды іншыя энцыклапедычныя выданні. «Петрашкевіч стаў заснавальнікам айчыннай энцыклапедычнай справы», — падрахаваў А.Трусаў.

Прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Лідзія Савік назвала Петрашкевіча «нацыянальным прарокам» і выказала вялікае шкадаванне ў сувязі з тым, што «аніводная з выбітных гістарычных п'есаў Алеся Петрашкевіча не пастаўленая ў беларускіх тэатрах». «Калі б ставіліся гэтыя п'есы, нашыя людзі сталі б больш адукаванымі, паколькі б даведаліся аб цікавым мінулым свайго народа, яго выдатных дзеячах і выдатнай мове», — падкрэсліла Л.Савік.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Барыс Святлоў распавёў аб ролі першага рэктара і прафесара ўніверсітэта Алеся Петрашкевіча ў станаўленні вышэйшай вучэбнай установы, а яго студэнты і аспіранты пазнаёмілі ўдзельнікаў вечарыны з узорамі беларускай народнай музыкі, а таксама з гісторыяй узнаўлення беларускай дуды.

У выкананні выкладчыкаў і студэнтаў БДУКіМ прагучалі фрагменты з п'есы Алеся Петрашкевіча «Напісанае застаецца», прысвечанай жыццю і дзейнасці беларускага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны.

**Марат Гаравы, БЕЛАПАН**

ВЕРШЫ

# АНЁЛ СПАГАДЫ

Рыгор БАРАДУЛІН

## Малітоўная просьба

*Валянціны*

*Існы і ў высі, і доле,*
*Анёле,*
*Хай твае богавейныя крылы*
*Атуляць*
*Замроеныя небасхілы*
*Босай душы.*
*Цёплым снегам*
*Прыцерушы*
*Балючыя раздарожжы.*
*Хай прыцьмеецца*
*Позірк — варожы.*
*Хай, як нядзеля святая,*
*Надзея світае.*
*Не пакідай без апекі*
*Жыццёвы сон.*
*Даверлівасць дзён*
*Не аддавай*
*У прыгон небяспекі*
*Ніколі.*
*Просьбу маю ты пачуй,*
*Анёле…*

## Імяніны

*Прасіў прабачэння*
*Кажух у аўчыны.*
*Вынік сватаўся да прычыны.*
*Студзіў світанне*
*Сум крумкачыны.*
*Рух несупынны*
*Спраўляў імяніны…*

## Сівы верш

*Здаецца, жыву,*
*А ці дажываю.*
*Надзея, як тая*
*Вада дажджавая,*
*Якую збіралі,*
*Каб мыць галаву.*
*Дажджы засталіся*
*У той старане,*
*Якая ўжо больш*
*Да мяне не прыйдзе.*
*І я да яе.*
*Мы абодва ў крыўдзе.*
*Спакой маладзы*
*Нас не ахіне.*
*І валасоў*
*На цяжкой галаве,*
*Як і дзён маіх,*
*Не шмат і засталося.*
*Навальніцы*
*Разгубленае адгалоссе,*
*Не забытае,*
*Глытае сум.*
*Плыве…*

* * *

*Рэха дагнаць і ўгаварыць*
*Вярнуцца назад —*
*Гэта і ёсць паэзія…*

## Загад

*У пярыне,*
*А ці за хатаю,*
*Ці на паляне,*
*Дзе шэпчацца верас,*
*Эрас*
*Любіць салодка загадваць:*
*— Яшчэ раз!..*

## Парада

*Смялей кулі куму,*
*Калі няма каму!..*

* * *

*Толькі калі пішу,*
*Дыхаю і жыву я.*



Фота С. Шапрана

*Слухаючы душу,*
*Лячу сваю галаву*
*Зношаную,*
*Сівую.*

*Раю пачуць святло*
*Думкам —*
*Заспаным совам.*
*Адно баюся,*
*Каб не было*
*Сорамна перад Словам…*

* * *

*І я адсюль сыду,*
*З нікчэмнай мітусні.*
*І, ўрэшце, ў глыбіні*
*Я карані знайду.*

*І прарасту знава,*
*Каб тут пабыць яшчэ,*
*Пакуль расце трава,*
*Пакуль вада цячэ…*

* * *

*"Крум-крум",*
*Ляціць самотны плач.*
*Вачэ цішыня глухая.*
*Ці спавядаецца крумкач,*
*Ці нешта ў вышыні пытае?*

*"Крум-крум",*
*Адпачывае тлум.*
*"Крум-крум",*
*Абсяжыста ўспаміну.*
*І на душу*
*Спадае сум,*
*Як жвір сыры*
*На дамавіну…*

## Ные…

*Белабокая, як сарока,*
*Аблачына*
*Прысела на слуп.*
*Недзе ў небе заспаным*
*Ные глыбока*
*Самалёт,*
*Як вырваны зуб…*

* * *

*Песня пеўня.*
*Серп маладзічка.*
*Годная шляхцянка*
*Бруканка.*
*Тая ж*
*Тумановая фіранка.*
*Гулкая гамонка малатка.*
*Болей даспадобы*
*Малатку*
*Дах даладжваць,*
*А не дамавіну.*
*П'ю,*
*Пакуль не выпрастаю спіну,*
*Роднае паветра па глытку.*
*І хмялею…*

## Плыве…

*Згубіўшы галаву,*
*Хаджу як сам не свой.*
*Жыву і не жыву,*
*Заву саву ўдавой.*
*Хлусні сваёй хлушу.*
*І стаўлю ля стаўка*
*За грэшную душу*
*Я свечку жаўрука.*

*Мне ўтульна сон прысніць*
*У ветра ў рукаве.*
*Крапліста воск звініць.*
*А галава плыве…*

## Суцяшайся

*Роспач,*
*Ненажэрная ў дзяльбе,*
*Прагне ўлады*
*Над жывой прасторай.*
*Як бы кепска*
*Ні было табе,*
*Суцяшайся тым,*
*Што будзе горай…*

* * *

*Няшчадныя нашчадкі,*
*Як закон,*
*Аруць ужо па-свойму*
*Твой загон.*
*З цябе пакеплівае*
*Лёс-айчым.*
*А ты маўчыш,*
*Як быццам ні пры чым…*

## І…

*Думаю,*
*Што недабразычліўцам*
*на злосць,*
*Каб былі мае клопаты плёнымі,*
*У мяне апрача незямнога*
*Ёсць*
*І зямны*
*Анёл-ахоўца з пагонамі…*

## Штрыхі

*Спаць угаварыў*
*Бацян сыной,*
*Пад крыло хавае галаву.*

*Рэха*
*Са сталіцы перуноў*
*Разбудзіла сонную саву.*

*Нестае нізіне*
*Тумаюў*
*Ахінуць азяблую траву.*

*Вецер сам сябе*
*Шукае зноў,*
*Вольна выдыхаючы:*
*"Жы-ву-у-у!.."*

## Цёплая завея

*Сівее, сівее*
*Усё навакола.*
*Завея, завея*
*Шалее вясёла.*

*І вёдры ў вясёлкі*
*З вясёлай вадою.*
*Ідзецца вясне*
*Маладою хадою.*

*І робіцца светла*
*Беламу свету*
*Ад цёплай завеі*
*Вішнёвага цвету…*

## Ды…

*І страла пачакаць магла,*
*Ды свой лёс*
*Дагнаць не ўцярпела.*

*І хацела стаць*
*Зіркатай імгла,*
*Ды яе слепата сустрэла.*

*І скала трапяткой была,*
*Ды ў яе душа скамянела.*

*Косы рэжуць*
*Правы травы.*
*Прагне ўвагі*
*Зёлка малая.*
*І датуль чалавек жывы,*
*Покуль з ім*
*Душа размаўляе…*

* * *

*Літаўраў грымучая медзь*
*Прыглухне,*
*Як рэха ў бары.*
*І прыйдзе час зразумець,*
*Што ты незваротна стары.*
*Пачнеш вучыцца тады*
*Лічыць недакладна гады.*
*Ля сонная ручая*
*Свяціцьмеш сівой галавой.*
*Аж покуль*
*Старасць твая*
*Не застанецца ўдавой…*

## Крывіцкай мове — чалом!

*Крывіцкая мова матчына,*
*Ты нашчышся даўняў журбой.*
*Маёй прысутнасці мачына*
*Трываліцца толькі табой.*
*Крывіцкая мова шчырая,*
*Гляджу з-пад тваёй рукі,*
*Як дзёнператомленых выраі*
*Лятуць праз мяне ў вякі.*

*Крывіцкая мова няспынная,*
*Нявесціцца твой пасаг.*
*І гэта жыццё пакіну я*
*Са словам тваім на губах…*

## У асноўным…

*У плётак*
*Далікатнасці няма.*
*Хлусня*
*Трымае ісціну за кратамі.*
*Гісторыя —*
*Цікаўная кума*
*Харчуецца ў асноўным*
*Канцэнтратамі…*

* * *

***Устал я жить в родном краю.***
***Сяргей Ясенін***

*Стаміўся ў родным краі жыць,*
*Чакаць,*
*Калі, нарэшце, доля*
*На зорках будзе варажыць,*
*Святлець*
*І болей верыць болю.*
*Відаць, і долі,*
*Як і мне*
*Няўтульна,*
*Бо яна жывая.*
*І ключ,*
*Які згубіўся ў сне,*
*Глыбей за пазуху хавае.*

*Ключ ад няспыненай ракі,*
*Ключ ад чакання і адчаю,*
*Ад краю роднага,*
*Які*
*Надзею шчодра пазычае…*

* * *

*Напачатку Слова было.*
*А святло?..*
*Спачатку была пятля.*
*Гальштук пасля?..*

* * *

*Надвор'е стомленай душы*
*Прагнозу не падпарадкуецца.*
*Анёл спагады апякуецца*
*І смутны хмель ліе ў каўшы.*
*На сподзеў п'е душа з каўшоў,*
*Каб паступова праяснілася*
*Усё,*
*Што ў снах вясновых снілася,*
*Пакуль па стрэхах*
*Дождж ішоў.*
*Душа прачнецца —*
*І наноў*
*Няўдзячныя атуляць клопаты.*
*Цяярозы дзень*
*Учыніць допыты,*
*Што снілася ў краіне сноў?..*

▸ КРЫТЫКА

# ПОКЛІЧ

## ШТРЫХІ ДА ТВОРЧАГА ПАРТРЭТА ГЕНРЫХА ДАЛІДОВІЧА

Аляксей РАГУЛЯ

**Проза Генрыха Далідовіча з'яўляецца характэрнай з'явай беларускай духоўнай культуры апошняй трэці XX—пачатку XXI стагоддзяў. У гэты час літаратура заняла вядучае месца сярод іншых відаў культуры. Беларускамоўная форма нацыянальнага хранатопу ў XX ст. адкрыла шлях для развіцця нацыянальнай культурфіласофіі. Захаванне і галоўнае развіццё гуманістычных традыцый ва ўмовах крайняга рэлятывізму і нацыянальнага нігілізму з'яўляецца неабходнай умовай паўнацэннага духоўнага жыццядзеяння нацыі. Менавіта на гэтым напрамку плённа і разгортваецца творчасць пісьменніка.**



Г. Далідовіч нарадзіўся ў в. Янкавічы ў Стаўбцоўскім раёне 1 чэрвеня 1946 года, закончыў філалагічны факультэт БДУ. У 1968-73 гг. працаваў у Шабыньскай васьмігадовай школе Барысаўскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі. З 1973 г. працаваў у рэдакцыі часопіса «Полымя». У 1991-2002 гадах быў галоўным рэдактарам часопіса «Маладосць». Член Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Яго творчы шлях пачаўся ў 1966 годзе, калі ў стаўбцоўскай раённай газеце «Прамень» было апублікавана яго першае апавяданне. Першая кніга прозы «Дажджы над вёскай. Апавяданні» выйшла ў 1974 годзе...

Пачынаючы з васьмідзясятых гадоў, аўтар засяроджваецца на праблеме рэальнага самасцвярджэння асобы. Ад лірыка-псіхалагічнага апавядання і аповесці Г.Далідовіч пераходзіць да жанру рамана.

Генрых Далідовіч ніколі не прэтэндаваў на незвычайныя навацыі ў творчасці. Наадварот, ён заўсёды падкрэсліваў сваю далучанасць да традыцыі сацыяльна-псіхалагічнага аналізу ў беларускай прозе, бо змалку ў родным слове адчуў глыбінны сэнс такой каштоўнасці, як жыццё ў згодзе са стваральнай сілай прыроды. Сфармуляваныя адраджэнцамі універсаліі беларускай культуры: «зямля — усяму аснова» (Я.Колас), «радасць існавання» (К.Чорны) — сталі аксіялагічнымі арыенцірамі ў яго творчай працы.

Усведамляючы аздараўленчую ролю мастацкай літаратуры ў грамадстве і індывідуальным жыцці асобы, Г.Далідовіч у адпаведнасці з логікай уласнай праграмы спачатку раскрывае творчыя рэсурсы і патэнцыял асобы. Вырашэнне гэтай задачы складае змест яго творчасці на этапе да пачатку васьмідзясятых гадоў. На другім этапе пісьменніка ўжо больш цікавяць творчы патэнцыял беларускай нацыі. Гэтым абумоўлены яго зварот да гістарычнай тэматыкі. Першасны покліч жыцця і кліч званоў з гісторыі Бацькаўшчыны — так можна вызначыць лейтматывы, якія вызначаюць стыль прозы Г.Далідовіча на этапах станаўлення і творчай сталасці. Эвалюцыя пісьменніка знайшла сваё адлюстраванне і ў дынаміцы жанравай формы — руху ад лірычных апавяданняў-імпрэсій да гістарычнага рамана. Адчуваецца таксама дынаміка і ў манеры апавядання: даверлівая лірызаваная фабула з элементамі медытацыі і споведзі ранніх твораў становіцца па-асветніцку педагагічна накіраванай. Пісьменнік у справе станаўлення нацыі надае вялікую ролю літаратуры і школе, якая заклікана зрабіць мастацкія скарбы духоўным здабыткам пакалення. Семантычным ядром стылю пісьменніка сталі топасы «абуджэнне», «покліч», «родны звон»...

У ранняй прозе Г. Далідовіча вызначаны, бадай, усе важнейшыя матывы на будучыню: душэўная шчодрасць людзей вялікага сэрца, памылкі выбару, бездапаможнасць чалавека перад ваяўнічым і жорсткім цынізмам. На першы погляд можа паказацца, што аўтарскія імпрэсіі існуюць самі па сабе, без усялякіх сувязяў з навакольным светам. На справе ж іх паэтыка адлюстроўвае рух быцця ў адпаведнасці з яго спрадвечнымі законамі. У аснове гэтага руху ляжыць не выпадак, а сустрэча. Часцей за ўсё паўтараецца матыў восені як магчымасці новай сустрэчы з жыццём пасля зімовага сну. Аўтар адчувае восеньскі матыў у жыцці беларускага народа. Аповесць «На новы парог» стала лірыка-філасофскім падсумаваннем заключнага этапу жыцця не толькі «неперспектыўнай» вёскі Бабчын Скон, але і ўсяго беларускага фундаменталізму. Аўтар стварыў галерэю партрэтаў, і кожны з персанажаў выношвае сваё разуменне сэнсу і каштоўнасці жыцця. Аўтарскія сімпатыі відавочна аддаюцца тым, хто дбае пра сям'ю, будуе дом. Як і ў іншых творах («Ласяня», «Губаты») напружана гучыць матыў адзінства чалавека з яго «меншымі братамі» — паразумення на аснове адчування каштоўнасці жыцця і «роднага кута».

Г.Далідовіч імкнецца ўзнавіць цэласную карціну духоўнага быцця. Яго творы нібы самі спалучаюцца ў цыклы, часцей за ўсё — у форме трыпціху. Аповесці «Юля» (1971), «Жаночае сэрца» (1975), «Жывы покліч» (1984) таксама могуць быць прачытаны як адзінае цэлае. Варта адзначыць перш за ўсё агульначалавечую значымасць матыву, які збліжае гэтыя творы, — інтымныя адносіны ў эпоху татальнага крызісу ў грамадстве. Было б памылкай лічыць гэтую цікавасць да асабістага жыцця ўцёкамі ад грамадскай праблематыкі. Наадварот, інтымная сустрэча ёсць вынік і пачатак культуры грамадства ў цэлым.

Паўнацэннае жыццядзеянне чалавека ў творах Г.Далідовіча пачынаецца з паглыбленага перажывання духоўнай блізкасці ў сферы інтымных адносінаў. Несумненным дасягненнем пісьменніка з'яўляецца раскрыццё ў чалавеку нязломнай патрэбы ў вяртанні да жыцця сапраўднага, да выпраўлення памылак, якія прывялі да непаразуменняў, разбурэння сям'і. На такое вяртанне здольныя людзі чыстыя душою, якія ўмеюць ацэньваць сябе па вялікім рахунку чалавечнасці і ставіць перад сабой высокія патрабаванні...

Покліч жыцця, улоўлены Г.Далідовічам у рытмах пасляваеннага адраджэння ў выпаленым Налібацкім краі, сёння патрабуе спасціжэння і адлюстравання экзістэнцыяльнай для беларускага этнасу праблемы: дзяржаўнага суверэнітэту. Нявырашаным на ўзроўні культурнага жыццядзеяння застаецца пытанне пра статус беларускай мовы. Усё гэта ставіць пад сумненне культурную паўнацэннасць тытульнай нацыі ў Беларусі ў бліжэйшай будучыні. Сітуацыя ўскладняецца тым, што сялянства, носьбіт нацыянальных традыцый, рассялянена калгасамі і індустрыялізацыяй...

Раманная трылогія Г. Далідовіча з'явілася як адказ на пагрозу аншлюсу Беларусі ў канцы XX-га стагоддзя. Хлусню пра няздольнасць беларускага народа да самастойнага дзяржаўнага жыцця выкрыў у свой час А.Т.Касцюшка. Гэтая задача ў канцы XX–пачатку XXI стст. стала зноў актуальнай. Трылогію «Свой дом» Г.Далідовіч пабудаваў у выглядзе цыкла, які з'яўляецца адказам на пытанне, у свой час пастаўленае Я.Купалам: «Што нам апека тут ваша дала?». Пісьменнік карыстаецца сімволікай, традыцыйную канатацыю якой беларуская літаратура ўзбагаціла новымі значэннямі ў творах М.Багдановіча, К.Чорнага.

Раманы «Гаспадар-камень», «Пабуджаныя», «Свой дом» сталі, бадай ці не першымі гістарычнымі творамі, у якіх выкрываецца хлусня пра стваральную дзейнасць бальшавіцкіх эмісараў у Беларусі. Г.Далідовіч паказвае ў іх двурушніцкі характар бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі.

У 1992 г. з'явіўся раман Г.Далідовіча «Заходнікі». Твор мае ярка выражаны палемічны характар. Аўтар пастараўся рэабілітаваць «заходнікаў», якія былі далучаны да Савецкай Беларусі толькі 17 верасня 1939 года і лічыліся вінаватымі перад савецкай уладай ужо за адно гэта. Раман узнаўляе старонкі крывавай оргіі ў першыя пасляваенныя гады.

У Заходнюю Беларусь на кіруючыя пасады было прыслана шмат «васточнікаў». Сярод іх — і шмат авантурыстаў, якія ратаваліся ўцёкамі ад закона. Адзін з такіх «актывістаў» — Кураглядаў. Разам з сябруком Курловым яны займаюцца бандытызмам і свае злачынствы спісваюць на «лясных братоў».

Раман заканчваецца трагічна. У засценках НКУС гінуць людзі, і сярод страчаных — Францішак Грыгарцэвіч ды яго пляменнік Сцяпан. Іх трагічныя постаці ўвасабляюць лёсы лепшых прадстаўнікоў беларускай нацыі.

«Заходнікі» падводзяць вынікі будаўніцтва таго часу, якое закладвалі ў Беларусі Фрунзе, Ландар, Кнорын. «Набрыдзь» новага пакалення здрабнела да ўзроўню «курашчупаў». Рэквізаваць у сялянкі апошні мех бульбы, кілаграм масла, вырваць грошы на «дзяржаўную пазыку» — такі маштаб дзяржаўных інтарэсаў «ніжэйшага звяна». Звяно вышэйшае — «першы» (сакратар) Уладароў, пракурор Ламідзе, рэдактар Фрайзман, начальнік міліцыі Сысункоў. Іх місія — караць і палохаць. Разбуральная дзейнасць «курашчупаў» не менш небяспечная за гульні «рэвалюцыйных рамантыкаў». Народнае жыццё стала падобным на антыкарнавал, дзе над усім пануе страх.

У «Заходніках» Г. Далідовіч стварыў своеасаблівую стылёвую формулу. Пранікнёны лірызм і трагедыя змарнаванай маладосці і страчанага жыцця тут спалучаюцца з сатырычным паказам антрапаморфнага бэстыярыю на кіруючых пасадах. Старонкі з дзённіка Кураглядава пры ўсёй антыжанравай іх умоўнасці раскрываюць творчы патэнцыял пісьменніка ў жанры антыўтопіі. Іх вытокі бачацца ў сатыры 20-х гадоў — творах К.Крапівы, А.Мрыя, К.Чорнага.

Ёсць усе падставы разглядаць раман «Заходнікі» як лагічнае завяршэнне цыклу «Свой дом» і трансфармацыю яго ў тэтралогію — гістарычную хроніку беларускага жыцця ў XX стагоддзі...

У сучасных умовах покліч скіроўвае творчы пошук Г.Далідовіча да глыбінных пластоў беларускай гісторыі. У XIII ст. на аснове еўрапейскіх этнічных плямёнаў пачалі фармавацца нацыі і нацыянальныя цэнтралізаваныя дзяржавы. У гэты перыяд узнікла пагроза з боку ўсходніх дэспатыяў. Асабліва небяспечнай была Арда.

Дацэнтрабежным пунктам беларускай дзяржаўнасці ў XIII стагоддзі стаў горад Наваградак. Узвышэнне Наваградскай зямлі ў час татарскай пагрозы з'яўляецца фенаменальнай з'явай еўрапейскай гісторыі. Пастаянная пагроза яе існаванню ішла не толькі з Усходу, але і з Захаду — ад крыжаносцаў. Няспынныя былі войны з галіцка-валынскімі князямі.

Г. Далідовіч знаходзіць вытокі дзяржаўнай жыццястойкасці Наваградчыны не толькі ў яе эканамічнай і ваеннай магутнасці, але і ў мудрасці стваральнікаў, здольных да глыбокага аналізу геапалітычнай сітуацыі. На аснове асэнсаванага ведання гісторыі будавалася знешняя палітыка, у якой прадбачлівая дыпламатыя адыгрывала не меншую ролю за ваенную сілу. Вобразы мудрых дзяржаўных дзеячаў — князя Ізяслава, ваяводы Усяслава, дыпламата Войшалка — у рамане «Кліч роднага звона» паўстаюць як знакавыя фігуры часу тварэння. Тып беларускага дзяржаўнага дзеяча ў час узвышэння Наваградскай зямлі можа быць ахарактарызаваны як чалавек эпохі Протарэнесансу, праваобраз якога бачыцца ўжо ў аблічны аўтара «Слова пра паход Ігаравы». Агульнадзяржаўны інтарэс, клопат пра стабільнасць і будучыню — характэрныя штрыхі да яго партрэта. Г.Далідовіч, аднак, не забывае і першапачатковую, на думку аўтара, крыніцу духоўнасці і сілы: глыбіннае інтымнае пачуццё і ўзаемаразуменне паміж мужчынам і жанчынай.

Раман «Кліч роднага звона» разлічаны пераважна на юнага чытача. Яго эмацыянальна-стылявая гама сінтэзуе рысы хвалаcпеву беларускай дзяржаўнасці, сапраўднаму рыцарству, беларускай жанчыне, беларускай сям'і. Заключныя ж старонкі твора нагадваюць прасветлены рэквіем па сынах Бацькаўшчыны.

Багацце творчай палітры Генрыха Далідовіча з'яўляецца пераканаўчым сведчаннем высокага ўзроўню і творчага патэнцыялу сучаснай беларускай прозы.

**Артыкул друкуецца ў скароце.**

ДЗЁННІК

# ДЗЕВЯНОСТА ТРЭЦІ

Ніл ГІЛЕВІЧ

**2. І. 1993**

Упершыню за апошні час сустракаў Новы год па чалавечы — у мілым сямейным коле, і зноў адчуў гэтую непараўнаную радасць. Божа, дапамажы мне — сівому, ды неразумнаму! Я апраўдаю давер Твой!..

Першы дзень новага года прайшоў у трывожных, цяжкіх роздумах. Што будзе? Куды ідзем? Ці бачым, ці разумеем самі? Два тыдні ляжаць накіды да артыкула «Што з намі?». Не магу ўзяцца, каб сказаць гэтае балючае слова, не хапае сілы духу.

30-га вечарам засядалі ўсім Прэзідыумам Вярхоўнага Савета ў Драздах, у былой рэзідэнцыі Першых асобаў (раней мая нага тут ні разу не ступала). На маё здзіўленне быў поўны кворум — прыйшлі ўсе да аднаго. Пілі мала. Гаварылі шмат. У тым ліку — шмат кампліментаў і клятваў вернасці Станіславу [Шушкевічу], нашаму спікеру, фактычна — галаве дзяржавы. (Але ж: «Пяюн не прапяяў тры краты». Не паўторыцца? Далёка ж не ўсе яго аднадумцы! Сёй-той толькі і чакае каманды: «Назад!»)

Ш-ў трохі перабраў, відаць, і па-дзіцячы смешна прасіўся ў Шушкевіча і ва ўсіх нас у замежную камандзіроўку. Як усё-такі цягне іх усіх у гэтыя паездкі! Як яны помняць пра сябе! Падсякай, пакуль клюе ёсць! Падсякай ды ў вядзерца! Ці на дно чоўна!

Далі слова і мне. Сказаў пра прафесійны рост і старшыняў і ўсіх дэпутатаў, і ўсім пажадаў зрабіць хоць крок да практычнага карыстання беларускай мовай. Дарэчы, да гэтага заклікаў у слове на развітанне і Шушкевіч. А Б. Савіцкі зусім сур'ёзна сказаў мне: «А вы знаеце, што ў справе адраджэння беларускай мовы я зрабіў не менш за вас?». Яшчэ і паўтарыў гэтае самае «не менш». «Можа быць, — адказаў я спакойна. — У такім разе гісторыя аддасць вам належнае». Усякае даводзілася чуць ад тых, хто сам і двух слоў па-беларуску сказаць не можа, ну але такое — пачуў упершыню. Нават і накуляўшыся мог бы сёе-тое помніць, шаноўны прафесар.

Учора прачытаў у «Правде» прагнозы замежных саветолагаў. Прарочаць: у красавіку Ельцын падасць у адстаўку, да восені прэзідэнтам стане Руцкой і возьме курс на аднаўленне СССР (напачатку — у форме канфедэрацыі). Мяркуючы па ўсім, будзе менавіта так. Нас далучаць без крыві — эканамічнай блакадай і гатоўнасцю народа да страты незалежнасці.

**3. І. 1993**

Ельцын і Буш падпісалі дагавор аб скарачэнні стратэгічных узбраенняў. Ну што ж, хоць трохі больш надзеі, што ачунеем.

Па тэле ішоў фільм пра Сталіна («Баляванне Валтасара»). Яшчэ адзін выразны штрых да вялікай трагедыі народа і народаў. Між іншым, нядаўна вычытаў, што ў Сталіна была калекцыя парнаграфічных малюнкаў. Сексуальна-паталагічны тып. Як і многія з яго атачэння, перш за ўсё — Берыя.



У чацвер, 31-га, заходзіў міністр Вайтовіч — наконт заснавання ў Беларусі Акадэміі мастацтваў і літаратуры. Ён загарэўся гэтай ідэяй і хоча давесці справу да канца. Ну што ж, хай бы была ў нас і такая Акадэмія. Але мяне гэта больш не хвалюе. Сябры музыкі і мастакі, як сведчыць іх ліст у друку, проста не ведаюць, які ў мяне настрой і якога «акадэмічнага спакою» мне хочацца.

Гаварылі з Нінай [Іванаўнай, жонкай] пра Данчыка (ішоў яго канцэрт). Сам Бог яго паслаў нам — цяпер, калі мы Адраджаемся. Часцей бы толькі даваць яму экран і эфір! Праз добры беларускі голас можна зрабіць для Адраджэння вельмі многа. Ды яшчэ пры ягонай артыстычнай і чалавечай прывабнасці.

**7. І. 1993**

Каляды. Званіў М. А. Савіцкі. Сказаў, што ўчора міністр Вайтовіч збіраў «рабочую групу» па арганізацыі Акадэміі мастацтваў і літаратуры (спісак яе, той групы, мне Вайтовіч чытаў раніцай 31-га). Прагаласавалі — за Акадэмію, а не за Аддзяленне літаратуры і мастацтва ў складзе АН Беларусі. Адзін Казінец, нібыта, супраць. Але механізм стварэння Акадэміі на мой погляд, сумніўны. Кандыдатаў у акадэмікі будуць вылучаць творчыя саюзы. Уяўляю, якое гэта будзе вылучэнне і хто ў тую акадэмію трапіць.

**11. І. 1993**

Вечарам перадаў у «Звязду» рэпліку на інтэрв'ю Сл-ва, старшыні камісіі В[ярхоўнага] С[авета] па нацыянальных пытаннях. Рэпліка — рэзкая і іранічная, таму будзе, напэўна, і адказ. А трэба было б і яшчэ вастрэй. Якія ж у нас дзяржаўныя «абаронцы» свайго народа!..

**12. І. 1993**

Цэлы дзень, з раніцы, у Радашкавічах, на адкрыцці новай школы, да завяршэння будаўніцтва якой я меў дачыненне (як дэпутат гэтай акругі). На мяне выпаў гонар перарэзаць стужку. У вачах — першакласнікі (чатыры класы беларускія, два рускія — для прыезджых). Аж расчуліўся, гледзячы на іх. Трэба часцей глядзець малым у вочы. Як шкада, што ў мяне з імі так мала сустрэчаў!..

**13. І. 1993**

У «Звяздзе» — мая рэпліка Сл-ву: «Прабачце, гэта не апіскі?». Звышаператыўна надрукаваў Наркевіч. Малайчына. Першыя водгукі (тэлефонныя) вельмі хвалебныя.

Днём — лекцыя ў Наргасе (ЭУ), на адкрыцці факультатыўнага Універсітэта беларускай культуры, мовы, гісторыі. Гаварылася мне чамусьці цяжкавата, але людзі — дэканы і загадчыкі кафедраў — здаецца, засталіся задаволенымі. Былі пытанні наконт моўнай сітуацыі ў Беларусі. Яшчэ раз пераканаўся, што трэба сустракацца і гутарыць.

Вечар (шчодры!) правёў у Музычнай Акадэміі, з Казінцом і Шаранговічам, пасля далучыўся і Дрынеўскі. Гадзіны чатыры «прабалантэсілі» — і амаль толькі пра будучую акадэмію мастацтваў. А сабраў нас мой ліст да іх. К. сказаў: «Ніколі за 50 гадоў не атрымліваў такога ліста, у якім столькі болю, але і столькі неразумення мяне…». З доўгай размовы вынікла: нам трэба трымацца разам і не аддаваць справу заснавання Акадэміі ў рукі М. С. (пры ўсёй да яго павазе), бо — не туды пакіруе. Прымірэння, а тым больш любові ў гэтых з гэным — не будзе. У чым я пераканаўся канчаткова. Наша нацыянальная трагедыя. Вялікі халуйскага становішча Беларусі ў імперыі.

**14. І. 1993**

Маленькае свята паэзіі ў Карповічах, у маіх выбаршчыкаў, з ініцыятывы дырэктара саўгаса У. І. Худога. Былі і старэйшыя школьнікі, і дарослыя. Сустрэча прайшла вельмі хораша, — дзякуючы настаўніцы В. І. Цыбулінскай, якая выдатна ўсё арганізавала. Дзеці таксама чыталі свае вершы, і досыць слаўненькія. Асабліва 9-класнік Вадзім Равяка — пра Багдановіча.

**15. І. 1993**

Прачнуўся ў 4:15 і да 8:00 напісаў водпаведзь тром землякам, акадэмікам РАН, што прабілі ў рэйку: трымайцеся, беларусы, за рускую мову — і ў навуцы, і ў тэхніцы, і ў школах!

А ў 10:00 ужо быў у Доме настаўніка — з лекцыяй (гутаркай) аб сучасным становішчы беларускай мовы і культуры — для загадчыкаў кафедраў абласных ІПК Міністэрства адукацыі. Сярод прысутных — яўныя і нават зацятыя ворагі беларусізацыі жыцця ў Беларусі. Але такіх менш.

**16. І. 1993**

З 10 да 18 быў на сумесным пасяджэнні двух Прэзідыумаў — Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў. Уражанне вельмі цяжкае — ніхто нічога не ведае, як не дапусціць канчатковага краху эканомікі і выйсці з крызісу. І ў прыватнасці, як адолець чарнобыльскую бяду. Падобна на тое, што нашыя вучоныя ядзершчыкі ўсё ж вінаватыя перад народам.

**18 траўня**

Першы дзень працы XII сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля доўгага перапынку. Запісы раблю на пасяджэнні.

Пачалося вельмі сумбурна. Зноў у зале, у радах, пануе нейкі лёгкі настрой, гучыць гумарок, жарцікі. Зусім не адчуваецца настроенасці на цяжкую, сур'ёзную працу. Чорт жа знае, што робіцца ў краіне — у эканоміцы, у гаспадарцы. Ды і на свеце. Паўсюль у зале — гэтакае маладзецкае бадзёрства. Ні знаку, што ў рэспубліцы — крайне цяжкая, нават трывожная сітуацыя. У тым ліку і ў маральным стане грамадства.

Пачынаецца абмеркаванне Парадку дня. Дэп[утат] У. Новік прапануе ўключыць законапраект аб паліве — бо надта страшная можа быць для нас зіма. Рэпліка З. Ломаця: «Садзіся на свой нейтралітэт і язджай, нашто табе бензін. Хацеў жа нейтралітэту, без саюзу з Расіяй».

Дэпутат З. Пазьняк унёс дзве прапановы. Першая: адмяніць пастанову, якая рэабілітавала Камуністычную партыю Беларусі, каб заставалася ў сіле першая пастанова, паводле якой КПБ — антыдзяржаўная арганізацыя. Другая: паставіць на разгляд пытанне аб адмене пастановы аб Рэферэндуме, бо такі рэферэндум не патрэбен, ён будзе на шкоду Беларусі.

У зале — адпаведнае (нядобрае) рэагаванне.

Падхапіўся дэп. Качан. Патрабуе: 1. Уключыць у Парадак Дня пытанне аб забароне БНФ як арганізацыі антыдзяржаўнай (у піку Пазьняку). 2. Аб аднаўленні свята Кастрычніцкай рэвалюцыі. Спаслаўся на ліст 112 дэпутатаў у Прэзідыум Вярхоўнага Савета. (А з якім пафасам гаварыў! З якой загартоўкай у голасе!).

Канфрантацыя пачалася з абмеркавання складу Рэдакцыйнай Камісіі. «Беларусы» зарэзалі ўсіх «дэмакратаў» (Герменчука, Герасюка, Трусава, Навумчыка і інш.). Узначаліў Камісію Б. І. Недарэка, што і засведчыў, выступіўшы (хай Бог даруе, што я даў Б. І. такі псеўданім).

Дэп. В. Ганчар пляжыць Прэзідыум ВС і рабочы прэзідыум Сесіі за няўменне арганізаваць працу, парушэнне рэгламенту, — з вялікай непавагай да кіраўніцтва ВС — як заўсёды. І як заўсёды — высакамерна, наставіцельна, павучальна, па рэзанёрску, катэгарычна…

Дэп. Мінько патрабуе ўключыць у Парадак дня справаздачу Шушкевіча па выкананні ім п. 4-га Пастановы XI сесіі. Відома ж, не толькі ад свайго імя. Даюць адразу ж зразумець Шушкевічу.

Дэп. Трафіменка: «Намі ставілася пытанне аб барацьбе са спекуляцыяй — які яго лёс? Ці будзе яно ставіцца нанава?».

Дэп. Лукашэнка: напачатку хвошча Прэзідыум ВС і Шушкевіча, затым патрабуе ўключыць у Парадак дня справаздачу кіраўніцтва дзяржавы Шушкевіча і Кебіча аб мерах па паляпшэнні эканамічнага становішча ў краіне. А яшчэ — «Я падтрымліваю дэпутата Качана наконт забароны БНФ і святкавання дня Кастрычніцкай Рэвалюцыі».

Дэп. Гаркун прапануе разгледзець пытанне аб кампенсацыі калгасам і ўсім сельгаспрацаўнікам панесеных імі цяжкіх стратаў ад поўнага адпускання цэнаў на тавары прамысловасці. Вельмі справядлівае патрабаванне.

Дэп. Лукашэнка: пытанне аб прыватызацыйных чэках не абмяркоўваць — зняць!

Шушкевіч: без прыватызацыі — мы адстанем у рэформах ад Расіі, трэба даганяць рэформы Расіі! (Што даганяць? Гэны дзікі капіталізм?)

Дэп. Міцько (пасля правалу пытання аб правах дзіцяці — набрала 123 галасы, не прайшло, не ўключылі): «Не разумею! Супроць будучыні Беларусі прагаласавалі!». (З абурэннем.)

Дэп. Савіцкі (пасля правалу пытання аб экалагічнай інспекцыі): «Віншую! Нас з'ядуць тараканы скора, калі мы так рашаем пытанні экалогії!».

Дэп. Катушкін — Шушкевічу: «Станіслаў Станіслававіч, вы, іменна вы раскалваеце Сесію. Вы ўжо дзесяць разоў зрабілі выпад супроць дэпутатаў аб'яднання «Беларусь»! Я вам раблю катэгарычную заўвагу! (Усё — з вялікай злосцю.)

Пытанне аб санітарна-эпідэміялагічнай службе — зарэзалі. Не ўключылі. Ну і ну! Гэта заняло б толькі паўхвіліны часу. І вось — маем!..

Пытанне аб Рэферэндуме (з удакладненнем пытанняў, якія выносяцца на ўсенароднае галасаванне). Дэп. Пазьняк: рашуча супроць. Булахаў, Станкевіч, Грыбанаў: рашуча за. Булахаў узяў слова яшчэ раз — за! «У 1991-м у нас не было вопыту, рэферэндум быў недасканалы».

Наша Камісія прасіла ўключыць у план Сесіі пытанні «Аб архівах» і «Аб бібліятэках». Не ўключылі: толькі 88 галасоў «За» (і па адным, і па другім). Было бачна, з якім вялікім энтузіязмам зарэзалі — аж пошчак ішоў па зале, як галасавалі супроць! Выступленне Трусава не памагло.

Пытанне «Аб племяннай справе» — зарэзалі пад гучны рогат. Настолькі на пошлы лад настроены думкі дасціпнікаў. А пытанне вельмі важнае для развіцця жывёлагадоўлі. Дэп. Унучка (эканаміст!) пульнуў дасціп: «Штучна ці натуральна асеменяць?» (з націскам на «натуральна»). А між тым дэп. Лужынскі з вялікай горыччу сказаў, якая гэта важная эканамічная праблема.

Дэп. Герасюк прапанаваў уключыць у Парадак дня пытанні: 1. Аб катэджах наменклатуры; 2. Аб адстаўцы В. Кебіча з пасады Старшыні Савета Міністраў. Абедзве прапановы з трэскам праваліліся.

Дэп. Вярцінскі (ад сябе і ад дэп. Гілевіча) унёс прапанову абмеркаваць пытанне «Аб канцэпцыі інфармацыйнай прасторы» — замест праваленага Законапраекта аб СМІ. Прапанова была з вялікім поспехам зарэзана — «за» толькі 75 галасоў.

Дэп. Трусаў унёс прапанову абмеркаваць пытанне аб датэрміновых выбарах у Вярхоўны Савет. «За» — усяго 95 галасоў. Дзівак-чалавек! Людзі ашалелі ад шчасця, што сталі «членамі Парламента», і цяпер самім адмовіцца ад такога гонару?

Прагаласавалі прапанову Качана аб забароне БНФ: «за» — 45. (Я думаў, што будзе больш.) Яго ж прапанову аб аднаўленні дня 7 лістапада як Свята Кастрычніцкай рэвалюцыі падтрымалі 131 голасам. Не прайшла.

Прапанова Мінько абмеркаваць на Сесіі справаздачу Шушкевіча атрымала 176 галасоў. Прайшла! Рыхтуйся, спікер, да справаздачы! Ой, мала табе не будзе!

МІНІЯЦЮРЫ

# НІКОЛІ НЕ ПЫТАЙСЯ, АДКУЛЬ Я

Славамір АДАМОВІЧ



## Смерць на рагу дома

Здохла котка, якая ледзь не цэлы год прыходзіла да мяне пад вакно карміцца. Зрэшты, можа гэта быў і кот — белы з чорнымі падпалінамі.

Звер з'явіўся якраз тады, калі ў мяне з'явілася Тамара. Жанчыне было сумна, калі я пакідаў яе адну ў кватэры, вось яна і прывáдзіла ката. Ці котку.

А потым Тамара паехала назад, туды, дзе не сумна, дзе жывуць родныя і перманентна квітнее Радзіма. Усё радзей і радзей прыходзіла котка. Бачна было, што худнее. Але абы-што не ела — вычэквала, каб кінуў ёй рыбу. А сёння я зірнуў у сваё вакно на першым паверсе, а яна ляжыць сабе на левым баку, пляскатая нейкая, акурат на рагу суседняга дома…

Па другой дня выносіў смецце ў кантэйнер, гляджу, а яна ўжо там. Відаць, паляк выкінуў, — той, што жыве ў суседнім доме, на рагу якога апруцянела котка, якую прывадзіла Тамара, якой так і не ўдалося назаўжды прывадзіць мяне.

**2007**

## Ніколі не пытайся, адкуль я

«Яны святкуюць Раство. Праз некалькі дзён — так званы новы год (чорт яго ведае, як пісаць слова навы — з вялікай? у двукоссі?). Яны святкуюць, гэта значыць, што ў мяне будзе сёння многа работы.

У начную я бяру мегапіксельную мыльніцу і відэакам. У патаемную кішэньку заплечніка кладу нагостраны шведскі паляўнічы нож. Трэба не забыцца паліцэйскую картку замежніка і ліхтарык. Яшчэ рабочыя пальчаткі і цэлафанавы пакет. Здаецца, усё…

Яны святкуюць. Яны ўсё яшчэ не ўехалі, што ім канец. Іх белая пыха заслала ім вочы. Яны сапраўды думаюць, што іхная лялечная дзяржаўка самая лепшая ў свеце. Яны свята вераць, што ў іх самая дэмакратычная дэмакратыя… Белыя выродкі, пажыральнікі свінняў!..»

Так я думаю, ідучы на работу — збіраць пустыя бутэлькі. У будныя дні я пішу, а ў выхадныя — збор тары. Яны п'юць па выхадных, пасля іх увесь горад завалены шклом і пластыкам. Я збіраю. Я навучыўся згінацца і падымаць пустую бутэльку на вачох гэтай белай сволачы. Вунь адзін таўстамясы ляжыць на лаве. Э, які ніякі гэты прадстаўнік «залатога мільярду». А вось тройца тынэйджараў (слова ж якое выдумалі). Нешта гавораць у мой бок. Падыходжу, прашу цыгарэту. Частуюць, адзін працягвае фляжку з алкаголем. Раблю выгляд, што каштую. І тут гэты. Што злева, пытаецца адкуль я. Во сукі, ну кожны раз, як толькі гэтыя белыя бачаць, што я збіраю бутэлькі, нехта з іх абавязкова спытаецца, адкуль я. Яны, бачыш, не могуць даць веры, што нехта іхны можа збіраць тару. Як ім пэўна прыемна ўсведамляць, што нехта, а не яны, збірае тару, каб выжыць. Вось толькі мой абсалютна еўрапейскі выгляд выключае ўсе іхныя культурныя коды. Я забыўся сказаць, што перад начной я прымаю душ, галюся і праціраю свае бронзавыя шчокі добрым мужчынскім адэкалонам. Мае раскошныя валасы з серабрыстым адлівам я ўкладваю з дапамогай гелю.

І вось я іду ў поўнай рабочай выкладцы і… пахну мужчынскай вадою «Men». У гэты момант у іх адбываецца заварот мазгоў… Я пабланжліва ўхмыляюся і на пытанне "адкуль я" называю свой тутэйшы адрас. Не вераць, асабліва настырныя выказваюць здагадкі наконт усходняй Еўропы. Тады я моўчкі іду далей…

Сёння асаблівая змена: я нутром адчуваю, што нешта здарыцца. Дальбог, лёс пашле мне вялікую сатысфакцыю. Ого, ты глядзі, на электрашчыце аж тры банкі піва. Цэлыя. Вось і захмелімся. Пайшлі да вады, там неяк душы цяплей: мачты рыпяць, шум вады, купка нейкіх тутэйшых чапляў…

Цьху! Дрэнь, вядома, але трохі расслабляе. А ў гэтым чортавым клімаце многа і не вып'еш — галава потым баліць.

Ну, вяртаемся, трэба яшчэ папрацаваць. Ага, бачу: каля гатэлю бліскаць мае шкляныя фунты-стэрлінгі. Так, спакойна, нейкі малады белы, няслаба п'яны, спрабуе нешта расказаць. Палез у кішэню, штосьці дастае… Ааа, гэта мясцовая купюра наміналам 50. Дае мне. Што ж, чаму не ўзяць, якніяк 15 еўраў пасля абмену. Зробім прыемна гэтаму беламу ідыёту. Але нешта і я разгаварыўся з ім. Кажу, што вельмі цяжка ў іх тут знайсці работу. Згаджаецца: так, няпроста. І прапануе прайсці да вады, хоча паказаць кантору, дзе патрабуюцца работнікі…

Добра, хадзем… Нешта лапоча, блін. П'янага цяжка зразумець бывае, тым болей іншамоўнага.

Нешта мне горача неяк… Якога чорта?! Сёння быў добры навар, крон на 250 набраў, 32 еўрамалеты!

Ды што ж мне так горача? Упрэў проста, пот па спіне раўчуком. О ё, адкуль у мяне ў кішэні нож? Я ж клаў яго ў заплечнік. А каб паліцыя? Гэтыя крымінальнікі ў форме ўсюды аднолькавыя — абы дакалупацца. Ну што, што ты пі…іш, балван? Ты мне расказваеш, як на работу ўладкавацца, га? Як на цябе, зажратага, укалваць? Ты думаеш, вы тут крутыя? У вас тут усё схоплена-звязана? Дык якога ражна тваю лялечную краіну будуюць мае землякі? Што, бля, сваіх рук не хапае? А вашыя лялечныя салдаты, што яны забыліся ў маёй разрабаванай краіне?

Я ж вас наскрозь бачу, навылёт. Вы — жменька рассыцелай белай сволачы, чыя гісторыя — сума рабаўніцкіх войнаў, захопаў і вялікай ілжы. Вы нават свае ўнутрырасавыя войны назвалі сусветнымі, каб і нас далучыць да сваёй віны. Невымольнай віны.

Пасля Другой вялікай вайны вы змянілі тактыку. Як нейкую вакцыну, вы запусцілі ў свой прыстарэлы арганізм нас; вы спадзяваліся, што мы будзем паслухмянай абслугай пры вашым стале. Але не туды тое! Не выйшла! Чуеш, ты, дохлая макрэль, не выйшла?! Мы сярод вас, але не сталі вашымі… мне толькі не зразумела, ну зусім я не даганяю, чаму вы так асцерагаецеся сваіх братоў па веры на Усходнім Акаёме? Ды не, не тое — вы іх проста баіцёся! Зрэшты, мне толькі цікава, не больш.

… — Ды канчай ты з ім!

— Што?

— Канчай, кажу. Канчай ты яму казку на вечны сон расказваць! Ну, раз-два, нікога побач і цёмна. У ваду боўтнеш і — канец! Юш! Ніц не буйсь! А, чёрт, натуральный бульбаш! Не тормози! Дай я, говорю, дай я...

…Нітку медна-нікелевага дроту ад веласіпеднага замка я захлісную на ягонай шыі так спрытна, нібы практыкаваў гэта штодня. Цела хутка супакоілася. Назаўсёды. Стала «грузам 200». У цені нейкага прадуктовага ангару я запхнуў яго ў чорны пластпакет, завязаў тым самым дротам і ціха спусціў у ваду.

Падраніцу снілася, што я яго не засіліў, а зарэзаў — гэтак жа спрытна і проста прафесійна. Толькі крыві было, крыві! Як з маладога барана. І мае сонныя мазгі, як сталёвая спіца з кола «харлея-дэвідсана», як скальпель хірурга, паласавала думка: ну вось вам і Раство, дабрабытныя. Вось вам і хрышчэнне ў водах Ярдану. Пайшоў на дно, як тая сякера. Як анкеры вашых белых яхтаў…

**30 снежня 2007–5 студзеня 2010**

## Справаздача, альбо Атакаваць за 7 хвілін

*— Начальнику штаба прецесии*;*
*— руководителю Школы тактических занятий;*
*— куратору гранта «Управляемый террор»*
*Рапорт…*

***

«…З многіх варыянтаў атакі мы спачатку выбралі тры: напад на прадстаўніцтва нафтавага канцэрну «Лукой»; правакацыя каля Пасольства і захоп закладніка, на ролю якога намі быў прызначаны сын прэзідэнта. Некаторыя з нашай групы настойвалі на тым, што трэба працаваць з жывым матэрыялам; што толькі тады, калі вораг сваёй патыліцай адчуе вільготны подых смерці, толькі тады…

А пакуль нам замінала, напрыклад, тое, што ў нас не было глушыльніка — варанёнага такога цыліндрыка грамаў на 400. Хаваць пісталет у падушку не выпадала, але і шуму рабіць — таксама.

Каб узяць закладніка — бракавала людзей. Нас усяго было тры чалавекі, прычым трэці зусім не ведаў, што ў час "Ч" ён будзе браць удзел у акцыі нашай баявой групы.

Штурмаваць будынак канцэрну выглядала таксама праблематычным — замінаўі адкрытыя подступы да аб'екта, якія былі б і нашымі шляхамі адыходу…

Урэшце мы спыніліся на Пасольстве. Ад ужывання стралковай адмовіліся — рашылі закідаць яго гранатамі.

І вось настаў дзень "Ч". Ён настаў, як і ўсе іншыя незлічоныя дні да яго — незаўважна і неўнікнёна. Мы адчулі яго адначасова, і калі напарнік пазваніў мне, я адказаў: «Без пытанняў».

Неверагодна, але я не думаў пра паразу, я проста, відаць, не дапускаў і самой спробы падумаць, а што будзе, калі наша аперацыя праваліцца, пацерпіць крах… Так, відаць, мы проста не дапускалі думкі пра магчымы правал.

І таму ў той дзень мы выглядалі спакойнымі і нават упэўненымі. Прынамсі выглядалі.

Было гадзіны тры па поўдні, калі мы сустрэліся каля дома, у якім жыў напарнік, і падняліся да яго ў кватэрку. Адчыніла нам ягоная жонка Марыя, выбегла з пакоя дачка Люба.

Неўзабаве гаспадыня накрыла на стол. Усё было нашае, класічнае: вараная бульба, селядзец, тоўстыя вясковыя кілбасы, хлеб «Нарачанскі», цыбуля, запраўленая алеем, і марынаваны часнік…

Гаспадар паставіў бутэльку гарэлкі «Усяслаў Чарадзей». Шкло бутэлькі было падобнае да колеру валовінага вока. Валавокае было шкло.

Да пачатку запланаванай акцыі заставалася яшчэ даволі часу. Пілося як гарэлка, але не пякло як вада. Відаць, у той момант, за некалькі гадзін да атакі, і рактыфікат не меў бы над намі ніякай сілы.

Так было — мы выпілі і з'елі амаль што моўчкі. Марыя расказала, што яна сёння разам з намі чыста выпадкова — гандляры на Камароўскім рынку забаставалі.

Потым я выходзіў на лесвічную пляцоўку курнуць. Потым мы паставілі касету і ўключылі відэапрайгравальнік. Гэта быў фільм «Майкл Колінз». Асабліва блізкай нам здалася канцоўка стужкі, у якой апантаны барацьбой малады ірландзец страляе ў свайго старэйшага таварыша — лідэра паўсталай Ірландыі Майкла Колінза.

Калі мы выйшлі з кватэры, пакінуўшы Марыю з дачкой адных, я пазваніў трэцяму з нас — дробнаму гандляру на пенсіі і з машынай «Жыгулі» ў руках.

Ён не пытаўся, куды і навошта мы паедзем. Ён проста верыў мне, верыў, можа, больш, чым самому сабе. 700 грамовы «Усяслаў» выветрыўся з нас яшчэ пры пад'ездзе да зоны візуальнага агляду аб'екта. У дварах Траецкага прадмесця мы распаланілі яшчэ адну гарэлкі. Трэцюю пакінулі на шчаслівае «пасля».

Набліжалася 11-я вечара. Канчаўся 30-ы дзень мая. Было цёпла, ціха і спакойна. Рэдкія наведнікі Траецкіх півярняў вышмыгвалі з дзвярэй у чэрава сталіцы. Пахла свежым лістом, інсекты бзыкалі над кустамі бэзу. Свяцілася макаўка пераможнага гранітнага фаласу на Круглай. Міргалі зялёныя габарытныя агеньчыкі тэлевежы на Чырвонай. Позния аматары тэлебачання лавілі відэасігналы тутэйшай рэдакцыі.

Я нічога не тлумачыў гаспадару старых савецкіх «Жыгулёў», толькі паказваў, куды і як хутка рухацца. У салоне было брудна, смярдзела бензінам. Акурат такая машына і пасавала нам, патэнцыйным смяротнікам.

Мы прыехалі на месца высадкі хвілінаў за 15 да пачатку. Я папрасіў шафёра не глушыць рухавік, прыадчыніць пярэднія дзверцы і, адвярнуўшы галаву ўправа, прыглушана пажадаў напарніку: «З Богам!»

Ён выйшаў з машыны роўна за 7 хвілінаў да 23-й гадзіны вечара. На дарогу прыпадалі хвіліна-паўтары. На сам напад — 4 хвіліны разлікавага часу.

Паўтараю, надвор'е было выключна майскае. Было неверагодна ціха як для цэнтру горада, і толькі на станцыі «Усход-сартавальны» разы два глуха бразганулі счэпамі таварныя вагоны. Гэтыя выпадковыя гукі з чыгункі ў протасферы апошняй майскае начы і змікшыравалі трэск ад разрыву першай «лімонкі» напарніка. Гаспадар машыны нічым не выдаў свой настрой, адно заўважыў, што ці не навальніца гэта пачынаецца. «Напэўна», — буркнуў я ў адказ.

Пасля другога выбуху наш трэці не сказаў нічога. Паветра стаяла цёплае і сухое. Неба — зорнае, над намі свяціліся Коўш і Палярная зорка. Нішто не нагадвала пра навальніцу.

Шчаслівa вярнуўся напарнік, паклаў сабе на калені пустую на выгляд зялёную сумку, і тады ўжо шафёру я гэтак жа глуха сказаў: «Давай!». Мы яшчэ ехалі па вуліцы Чырвонай, тыламі Опернага тэатра, а мянтоўскія «Волгі» ўжо несліся па Багдановіча да толькі што атакаванага Пасольства. Мы далі дарогу заклапочанаму картэжу і прадоўжылі свой рух у адваротны бок. На каленях у напарніка, у зялёнай моднай сумцы ляжаў варанёны карактаствольны аўтамат бліжняга бою.

Каля Жоўтай царквы мы з напарнікам выскачылі са старых савецкіх «Жыгулёў» нашага гераічнага трэцяга, пажадалі яму «шчасліва» і разбегліся кожны ў свой бок».

**1 июня 2001 года, г. Минск**

**Старший опергруппы подполковник Борусов (подпись)**

* Комплекс падрыўных мерапрыемстваў, якія адна дзяржава ажыццяўляе на тэрыторыі іншай з дапамогай сваёй «пятай калоны».

ВЕРШЫ

# ХТО НАРОДЗІЦЦА З НІМБАМ, ВЫЗВАЛЕННЕ ПАДОРЫЦЬ

Віктар СЛІНКА

## Гарлачыкі

*Гарлачыкі — чые? Хто іх сарве, ці мо*
*Таго, хто не кранае прыгажосць,*
*Чый човен*
*Наводдаль спыніцца?.. Яго.*

*…Але й таго яны,*
*Хто не баіцца вадзяной сцяны,*
*Хто іх сарве, нырне глыбока.*
*Дзе срэбнаю луской асвеціць дно*
*Нямая рыбіна… Яно —*
*Дно тое — вабіць рух і вока.*

*Гарлачыкі ж — чые? Імшанік і сасоннік?..*
*І мы — не мы, а цішыні сінонім.*
*Дык вось, сарве, дастане, вырве корань,*
*І кветку — у графін. Але ж — не выкінь*
*Карэнішчы — іх любяць сонца блікі.*
*Падсушацца ў падстрэшшы, на гарышчы,*
*Дзе звязкі сохнуць траў, і тчэ павук увішна*
*Амаль празрыстую бліскучасць — павуту.*
*Кубло пчалінае калісь было ў куце,*
*І там паставілі старэнькую тахту,*
*Заўжды патрэбную — як хочаш*
*спаць ці не…*

*…Калыша нашы грудзі ува сне*
*Жыццё, —*
*Чым і карэнне жывіцца на дне*
*Маё…*

*Люблю паселішчы, ў якіх няма дарог*
*Бы ў горадзе — вялікіх, шумных, тлумных…*
*Там можна проста — адпачыць бяздумна*
*Хоць тыдні два. І дзе воданапорнай*
*Будынак вежы — самы ёсць высокі.*
*Прачнуцца раніцай, калі зямныя сокі*
*Падыдуць да крыніц, узяць вудзільна*
*І апрэдзіць промень Ра. Надзьмі ты*
*Старэнькую — на латцы латка — лодку*
*І заплывi туды, дзе больш няма свабоды*
*І рабства, і да вечара вудзі,*
*І як адкрыюцца гарлачыкі, глядзі.*
*Але ты падплыві бліжэй — і зазірні*
*Той кветцы ў твар.*
*І ўвесь зямны абшар*
*Тут раптам звузіцца, і стане нам працей*
*Не быць, не радавацца, не абняць дзяцей*
*Пазней калісь. Ну, а сказаць працей —*
*Ў адносінах сябе адчуць, што не-*
*Не-вечнасць — ёсць не вырак — дабрыня.*
*Хто кветку рве — яе не помніць дня.*

*…Як па спіралі ад каменьчыка ідуць*
*Не кругам — хвалі,*
*Нас сюды*
*узялі*
*Не для таго — як халаднее ртуць —*
*Каб нашы вусны ў смазе халаднелі.*
*Яшчэ гайдаюць нас нябачныя арэлі…*
*Як адгарнуць*
*Старонку кнігі, што гайдаюць хвалі?*
*І як вярнуць,*
*Чаго не бралі мы, аб чым не зналі?*
*Туман сплыве, асядзе каламуць.*
*Г а р л а ч ы к і — чые?*
*Ці адказаць:*
*Зямля — зямлю — забудзь?..*

**21 ліпеня 2005**

* * *

*І не такія, як я,*
*Ламалі лязо мяча*
*Аб мур,*
*Ля якога стаю.*
*І плашч скідалі з пляча,*
*І кленчылі зноў: люблю!*

*А я не схілю кален,*



*Бо страшней ад цяжару сцен*
*Здрада сабе.*

*І нават страшней*
*За страту Цябе.*

*Амэн.*

**2002**

## Гаворыць Арахна

*Адказу на пытанні там няма.*
*Але не запытаешся — дарма.*

*Мёд выцякае па кары з дупла*
*З пчалінай хаткі. Поўная святла*
*Ад яснай поўні, ноч не заінее*
*За вокнамі. Прадбачыцца завея*
*Яшчэ не заўтра. На календары*
*Яшчэ кастрычнік. Лічбаў не сатры.*
*Пяць год мы сеем — і збіраем хлеб,*
*Дыханнем грэем шкло, не маючы патрэб.*
*Што ж, вернемся назад. Хто гаварыў*
*Праз дзверы ў хаце, нам не адчыніў?*
*Мёд выцякае па кары з дупла*
*З пчалінай хаткі. Поўныя ўраджаем*
*Каморы пчол — ад ліпеня да мая*
*Паверне год назад свой крок. З вясла*
*На павуцінне белае сляза*
*Рачная ўпала — там, на узбярэжжы*
*Ракі — забытыя, дзе спяць мярэжы.*
*Зноў вернемся назад.*
*Чакае сад.*
*Мёд выцякае па кары з дупла*
*З пчалінай хаткі. Поўныя ўраджаем*
*Каморы пчол. Я час, які не мае*
*Сябе. Гадзіннік, што ўнутры пусты.*
*Як соты пчол. Як цёмныя лясы.*
*Над жоўтым раўчуком марудным кружаць*
*Гатовыя цікаўных адагнаць*
*Там пчолы — й радасці няма,*
*але й не тужаць*
*Там пчолы, так! Дзе ісціны няма,*
*Там ёсць салодкі мёд. І ён цячэ*
*Без ведання, без подыху. Яшчэ*
*Жыццё не навучылася ў сябе*
*Аратым быць і госцем — на сяўбе.*
*Заўжды — альбо… Там тое, што хацеў,*
*За вокнамі адкрыецца — дзе спеў*
*Яшчэ не прагучаў — і не замоўк.*
*Мы ў дзверы стукаем, але нямы замок.*

*Вазьміце мёд, які кастрычнік зблытаў*
*І май. Вазьміце мёд, які ніхто не выпіў.*
*Прыйшлі ж за ім? Бо гэты вынік кветак,*
*Засохлых крыл пчаліных, пустак, вербаў,*
*Якія — атулялі даўні сад.*
*Вазьміце мёд, які вядзе назад.*
*Каб не было нічога, што было.*
*А толькі будучыні зор святло.*
*Вы не за гэтым тут? Вам будзе мала?*
*Раку забраць вам? — рэчка не адтала*
*Яшчэ ад лёду Ўчора — і дарма…*
*Цячэ вада праз пальцы, да жытла*
*Хрыста распнутага?.. Усё жывое — дзіва.*
*За шклом цячэ рака —*
*жывая, як карціна.*

*Вось паміж слоў адкрыецца. Яно*
*Лягло, як мост —*
*Між берагамі ведаў,*
*Набытымі табою — і чужых,*
*Яно лягло — між мёртвых і жывых,*
*Дзе радасці не перашкода вера,*
*Злучаючы, не дзелячы, напраўду,*
*Яно лягло. І ты пабачыў — Заўтра*
*Ў бязмежным полі. Дзе святло, дзе змрок?*
*Не важна, хто ты — вынік ці выток.*

*Абы паслухаў лён. І снег адкрыў замок.*

**Кастрычнік—лістапад 2005**

* * *

***В.***

*Навокал святлее, але гэта не дзень.*

*Нешта змянілася — дарэшты і беспры-чынна, і незразумелая радасць напоўніла мяне. Золкія, чорныя вокны дамоў сталі адно за адным запальвацца, і хай яны чужыя, хай! Нешта ўва мне нарадзілася, і цёплыя, шчасныя словы зрываюцца з языка, і на маім швэдры неацэннымі ўзнагародамі застываюць сняжынкі.*
*…І гэтак жа было, калі я вымольваў цябе, выстойваючы кожную нядзелю вечарам трохгадзінную службу…*

*Навокал святлее, але гэта не дзень.*
*І адвагі спакойныя вочы глядзяць мне ў твар.*

**13 лістапада 2006**

## Старыя рыфмы

*Мне ёсць куды пакласці камень.*
*І тая шаля пераважыць,*
*Дзе ўсё, што сэрцу даражэй.*
*Дзе змрок начэй, святло вачэй*
*Па-над хвілінаю маўчання*
*І той парог, які не мог*
*Пераступіць пасля дарог.*

*Хто ля падмурку лёг, скажы?*
*Каму марудныя смажы*
*Халодзяць твар, на вочы дым*
*Лісця прыносяць мурашы?*
*Спаткай мяне — у лепшы дзень,*
*Дзе б'ецца ў шыбу авадзень,*
*І дзе прагорклае віно*
*Мы выплюхнулі з чар даўно.*
*Хацець вады, хацець святла,*
*Неадзінокага жытла,*
*Жывой размовы між людзьмі*
*І пасму, што сваймі грудзьмі*
*Заціснем мы — так, тую пасму,*
*Тых неслухмяных валасоў,*
*З каронаю якіх не страшна*
*Было разбіцца аб любоў.*

*…Псіхея, чуеш? Паглядзі,*
*Як аджывае — хто ляжыць,*
*Абмацвае далонню камень,*
*А потым — як ламае шалі,*
*Якімі важылі святло*
*Бацькоў, каханых — і сыноў,*
*Дзе мальваў зыркія агні*
*Глядзелі ў вочы дабрыні,*
*І вось — ён забірае іх*
*У гэты ж дзень, у той жа міг,*
*Пакінуўшы — без вызначальных слоў —*
*Сабе — каханне і любоў.*

**21–22 жніўня 2006**

* * *

*Мне падабаецца быць свабодным,*
*Даволі прыгожым*
*і старамодным,*
*З чорным вінілам,*
*цёмным кагорам,*
*Светлай кашуляй*
*і лабрадорам*
*На ланцужку на шпацыры павольным.*
*Мне падабаецца быць незалежным,*
*Крыху несур'ёзным,*
*а часам і смешным,*
*І за руку падтрымаўшы дзяўчыну*
*На прыступках трамвая,*
*бы з аблачыны*
*Спускацца на дол, дзе мой парк*
*і пенаты,*
*Дзе ў пене шыпшыны я*
*невінаваты.*

## Ля кораня

*Не наракай на цану.*

*Жыццё —*
*Гэта імкненне замураваных*
*прабіцца наверх.*

*Ты глядзіш на расліны — яны паказваюць*
*прыклад.*
*Дзівішся мужнасці іх*
*ды цярпенню,*
*Іх шырокаму лісцю, зграбным пругкім*

*сцяблінам.*
*Ягадам, што растаюць удзячна*
*на тваім языку.*

*І дзіўна самому, як могуць рабіцца*
*кроў і жыццё*
*Рэдукцыяй ненаціскных галосных,*
*Невымоўным спалучэннем зычных,*
*распадабненнем,*
*Лабіялізацыяй… Моўнымі з'явамі,*
*уласцівасцю*
*вымаўлення.*

*Але зноў ты — парастак, сцябліна,*
*зялёны ліст,*
*жоўты ліст.*

**2009**

* * *

*Я прашыў свае вены суроваю ніткай*
*Ад запясцяў да згінаў у локці. Ямчэй*
*Зелянінаю, рунню палі свае выткаць,*
*Бо нябёсы так часта мяжа для вачэй.*
*Нехта птушак запрог у нябесныя сані.*
*Там нікога на сене, дзе цёплы кажух.*
*Толькі клён празвініць нам іржою,*
*лістамі,*
*Што ляжаць, быццам тонкае шкло,*
*пад нагамі,*
*Ды мяшэчак з насеннем пад пахай. Удвух*
*Ты і я. Наваколле*
*бясснежна-пустое.*
*Нам дазволяць пакінуць на вежах званы,*
*Кнігі ў скрыптах — і наша багацце зямное,*
*Бо мы самі належым. Не вольныя мы.*
*Я прашыў свае вены суроваю ніткай*
*Ад запясцяў да згінаў у локці. Раство*
*Надыходзіць, і Той, хто народзіцца з німбам,*
*Вызваленне падорыць — мы прагнем яго.*

**31 снежня 2008**

ЭСЭ

# НА ЛІНІІ ДАЛЯГЛЯДУ, НА

Ала СЯМЁНАВА



«Малады чалавек на лініі далягляду, вярніцеся!» — неслася з радыёрубкі выратавальнай станцыі.

Галава плыўца некалькі хвілінаў па-ранейшаму пакачвалася на хвалях, а потым стала набліжацца да берага.

«Шаленства! — нервавалася побач са мной жанчына. — Куды ён выправіўся? Потым сям'і адно няшчасце!»

«Сям'я», гэта значыць я, адчувала сябе спакойна і ўпэўнена. Маладзён на лініі далягляду быў мой муж. І ў мяне не было сумніву: неўзабаве ён апынецца побач.

Так яно і сталася. Ён, пафыркваючы, выйшаў на бераг — высокі, загарэлы, прыгожы. Увасабленне жыццёвай сілы і маладосці. Кінуўся проста на кактэбельскую гравейку: не любіў лежакоў.

...А дзень быў з тых, калі здаецца, што ва ўсім свеце толькі сонца, свежы зюйд-вест і блакіт мора. І ўсім добра. І паўсюдна пануе радасць. І ўсе шчаслівыя...

## 1

Паводле вядомага — усё існуючае разумнае, а ўсё разумнае — існуе. Свет — гэта толькі Гармонія, Хараство, Святло. І так станецца заўсёды.

Увосень весела павядзе свой карагод, ападаючы, лісце клёнаў, выдадуць высокім сэнсам плады зямлі. Першы снег уявіцца ўвасабленнем цноты і чысціні... А ўвесну ўсцешыць вока зяленіва, урачыста будуць панаваць свечы каштанаў... Нагадаюць пра салаўіны сад Паэта лірычна-раздумлівыя фарбы бэзу.

...А на той момант, на моры, той чалавек, якому крычалі з выратавальнай станцыі, адчуваў кожнай клетачкай сваёй істоты вось гэтую радасць быцця. І сваю моц. І сваю маладосць.

І быў упэўнены ў сабе. Калі плыў далёка ў мора і вяртаўся назад. Калі надвячоркам «выбіваў» аднаго за адным гульцоў у настольны тэніс на пляцы Дома творчасці. Пісьменнікі не надавалі асобай увагі гэтай гульні — іх можна было ўбачыць хутчэй на кортах. Тут вялі рэй дзеткі і ўнукі. Усё больш з белакаменнай і з тым адчуваннем самапавагі, што чамусьці заўсёды больш уласцівае не самім славутым, а іх сямейнікам...

## 2

Што ластаўчыны гнёзды... Адразу згадваецца, як муж цягнуў мяне ледзь не на аркане ў плюс 30 градусаў паводле Цэльсія да знакамітага палаца «напаўмілорда». Не, геніі таксама не заўсёды маюць рацыю. Быў густ у графа.

«Ластаўчына гняздо». Матэрыялізаваны прытулак мары. І мы— як мноства турыстаў і наведвальнікаў — не пазбеглі спакусы: застылі перад фотаапаратам...

Засталася памяць... Як і пра вулачкі Львова і Стрыйскі парк, пра перавалы Карпатаў, пра нашых адналеткаў каля дома Валошына ў Кактэбелі, якія выпівалі: «Сегодня ходишь в бороде, а завтра где? В энкаведе...»

Памяць пра мора, якое было роднай стыхіяй для майго Марта —так называлі яго мы з маёй мамай. Хрышчаны ён быў паводле праваслаўнага абраду (я — каталічка), а ў дакументах і сярод знаёмых ён быў Марат. Некалі яго бацькі, з вёскі Лявонцавічы, прыехаўшы ў горад, у Мінск, былі ўражаныя ладам вялікага места. Аднак кожны па-свойму.

## 3

Бацька, Павел Канстанцінавіч, так да скону і трымаўся беларускай мовы, рабоча-сялянскага гонару, традыцый гаспадара зямлі. Маці мужа, Праскоўя Фёдараўна, адразу мелася стаць «сталічнай дамай» (яе словы) і, мабыць, ніякавата адчувала сябе са сваім, на яе погляд, не самым арыстакратычным імем. Таму і сыну яна дала імя, якога ніхто і ніколі ў іх вёсцы не чуў: Марат.

Мора было яго роднай стыхіяй. І служыў ён на флоце. У Піцеры — Ленморпагранпорт...

Скончыўшы 10 класаў, на энэргафак Політэхнічнага не прайшоў па конкурсе з адной чацвёркай. Скончыў тэхнікум, адслужыў армію і ўрэшце той самы энэргафак.

Рыцар — па натуры, працаўнік — таксама паводле натуры і

## 4

і паводле выхавання...

Ён меў тонкі густ, надзвычай адчуваў усё прыгожае. Мора, лес, пагоркі, палі... Краявіды...

Марат любіў паэзію. Была ў нас звычка абменьвацца ў дні нараджэння, у святы вершамі-віншаваннямі. Запазычанымі ці сваімі.

А томікі вершаў на нашых паліцах — дзе з яго, дзе з маімі ўкладышамі, адзнакамі алоўкам...

Любіў музыку... Апошнім часам накупіў дыскаў Хварастоўскага, слухаў. Надаваў увагу Марыо дэль Монако... Плачыда да Мінго... Апошнія свае дні, калі ўжо неяк адышоў ад усяго, дык вось адным днём папрасіў паставіць яму Шапэна... «Толькі не жалобны марш», — пажартаваў сумна...

## 5

Любіў вытворчасць, калектыў. Быў завадатарам розных імпрэзаў. Як пісалі раней у характарыстыках, «карыстаўся павагай калег». Некалькі гадоў быў старшынёй прафкама. Нічога — для сябе. Толькі для іншых. Мы займелі кааператыўную трохпакаёўку, здаўшы дзяржаве нашую ўтульную кватэру на Карастаянавай і шыкоўную матчыну кватэру ў Навагрудку, з відам на замак, але без выгодаў...

Хварэла мая мама... І пытанняў не было. Абмяняць — трэба было мець немаведама колькі часу, пасярэднікаў — розных дылераў, маклераў тады не было... Вырашылі — здаваць. І на першы ўзнос — год мы ў Менску, а мама ў Навагрудку, — збіралі, седзячы ледзь не на адной вадзе, але не пазычалі, сабралі. І плацілі 15 гадоў па 45 рублёў кожны месяц: за такую ж дзяржаўную людзі не аддавалі і 10-ці. І ніколі я не чула ніводнага слова папроку... І ніякіх спробаў нешта перайграць у зручны момант свайго старшынёўства... Сумленнасць — як аснова жыцця...

## 6

Да маіх творчых памкненняў ставіўся з павагай і разуменнем, часам знешне нібыта і крыху іранічна, аднак заўсёды прыходзіў на дапамогу. Ну, напрыклад, ён пакепліваў з ідэі займець камп'ютар, аднак калі я набыла гэтую «прыладу» з выпадку, ён тут жа ўстанавіў яе, змайстраваў сам спецыяльны стол і ахвотна даваў парады...

Да майго дня нараджэння Март зрабіў вельмі сімпатычныя візітоўкі — з маёй улюбёнай Афінай Паладай... Дапамагаў — заўсёды і надзейна. Прадумваў «варыянты»...

Як некалі, у першы месяц нашага знаёмства, ён вышукваў варыянты маршрутаў для нашых шпацыраў. І з тым жа непадробным імпэтам, як рашаў задачы, танчыў са мною на розных пляцоўках. Грошай у яго не было, але на тую пару, напрыканцы 50– пачатку 60-х, танцы наладжвалі і на вуліцы каля інтэрната БДУ на Бабруйскай, і ў нейкіх дварах так званага прыватнага сектара. Уваход свабодны, усё бясплатна.

«Мне сегодня так больно, слёзы взор мой туманят», — пакутаваў голас з дынаміка. А нам было добра, мы танчылі і хадзілі па горадзе — ап'янелыя ад шчасця сустрэчы, шчаслівыя ад прадчування радасці...

Шлюб мы ўзялі праз пяць гадоў, але вось тое даўняе, ранняе, незабыўнае Март умеў вяртаць, трансфармуючы ў знакі канкрэтызаванай увагі, дапамогі, павагі...

## 7

Была такая звычка ў Марта — прыходзіў дадому і з парога лагодна-хітраватай усмешкай гаварыў: «Нештачка дам». І даставаў пакункі: першыя трускаўкі, чарэшню, персікі... Любіў і ўмеў рабіць запасы на зіму — тут ужо актыўна падключалася і я.

Апошнім часам часцей хадзіў на кірмаш: «Пакуль ты тут збіраешся, дык я вярнуся». Гэта было праўдай, хаця ў параўнанні з большасцю жанчын я збіраюся хутка. Ён імкнуўся прынесці нешта цяжкое нават у апошняе сваё лета, а калі ўжо не мог гаспадарыць, вельмі перажываў: усё ты і ты... І ён, і я лічылі — часова...

Увогуле — не тое, каб жылі адным днём, аднак глядзелі на жыццё па-філасофску... 30, 40, 50... Што ж... Адмервае Пан Бог...

Юбілеі, дні нараджэння, святы сустракалі заўсёды. Па-рознаму. Дома і ў кавярнях, на працы... Заўсёды — святкавалі з настроем, весела, з тымі, хто быў нам цікавы, а не з «патрэбнымі людзьмі»... Помніцца мае даты: Алена Васілевіч, Ян Скрыган, Рыгор Барадулін са сваёй жонкай Валяй, Алесь Разанаў, Віктар Карамазаў, Генадзь Шупенька са сваёй Галяй... Тамара Васільеўна, сябра нашай сям'і, з мужам, Анатоль Варава з мамай — таксама даўнія сябры... Можна многіх згадваць...

У Марта асабліва помніцца 60-годдзе... «Апошні баль»... Было ці не паўсотні народу... Быў прыгожы стол...

...Нараджэнне Хрыстова, Новы год, Вялікдзень часта сустракалі і ўдваіх, аднак урачыста — касцёл (для мяне), царква (для яго), а потым урачыстая пачостка: святочны стол, святочныя ўборы: не мела значэння, што мы ўдваіх...

Таксама загадзя рыхтаваліся, імкнуліся павіншаваць блізкіх і сяброў, зрабіць, калі магчыма, некаму добрае...

«Любі бліжняга, як самога сябе...»

...Запавета гэтага ён трымаўся... Больш першай часткі... Самога сябе ён любіць і берагчы не патрапляў... Ці маглі берагчы яго іншыя?

Даўнавата пачаў скардзіцца на глухія, але сталыя болі ў сэрцы. Зрабілі кардыёграму — норма. Набыў электронны танометр: ціск падвышаўся. Гэта яго ўпэўніла — нешта з сэрцам.

Хвароба падышла да яго ўпрыцён. Болі ў пазваночніку... Дыягназы радыкуліт, артроз... Масажы, магніты, фізіятэрапія... — радыкуліт, артроз... Накіраванні на аналізы ў 4-ю клініку... Усё амбулаторна...

А з 6 на 7 снежня, амаль апоўначы — неяк дзіўна, кульгаючы, здзервянела дабраўся да ложка... І больш з яго не ўстаў... 52 дні і 52 ночы...

У тую ноч «хуткая» прыехала — дзве субтыльныя дзяўчаткі. «Клічце суседзяў!» Яго трэба несці на насілках, каб везці ў шпіталь. Урэшце прыехалі нейкія мужчыны...

...У тую снежаньскую ноч яго кулялі з насілак на насілкі. Менавіта так — кулялі. Дзе яны, санітары? Дзе альтэрнатыўная служба? Урэшце — дзе платная служба? Потым высветлілася — ёсць такая. Аднак для гэтага трэба было ехаць на Захарава, на станцыю «хуткай дапамогі», пісаць там — ад рукі! — ці не пяць асобнікаў нейкіх паперак, потым ісці ў банк аплочваць, зноў вярнуцца на тую станцыю, атрымаць паперку, а ў прызначаны час чакаць... Для гэтага трэба мець неблагое здароўе і сабачую вытрымку... Да таго ж — у тым медсервісе — урачы, суправаджэнне, санітараў зноў няма... Ну, урачы бяруць насілкі самі... Але... У мясцовых правілах занатавана — вага павінна быць не болей за 70 кг... Дзе вы бачылі мужчыну нармальнага росту з такой вагой?

Яго кулялі з насілак на насілкі, караценькія, таксама разлічаныя на вельмі субтыльных пацыентаў... Я трымала яго галаву, нешта спрабавала дапамагаць... Пакуль у 5-й клініцы я голасна і жорстка не абвясціла: «Усё, больш з гэтага прыёмнага пакоя мы нікуды не паедзем»...

Зноў — каталкі... Зноў — жанкі... Злосныя, азвярэла недобразычлівыя... Нешта разам з імі спрабую рабіць і я. На мяне крычаць, як на рабыню... Ноч... З шостага паверха — у падвальны... Адзін рэнтген, другі... Ён маўчыць... Мужна, цярпліва... І так 52 дні і 52 ночы... Мужна і цярпліва маўчыць... Ці просіць: «Дастань мне атруту. Які сэнс у такім жыцці...»

Жыццё сапраўды нечакана і неабвержна падышло да свайго краю... У 5-й клініцы... Дзе ён спачатку меў надзею... Ён, а не я... Мне адразу, у першы ж дзень абвясцілі — катэгарычна, неабвержна — прысуд... Позна... Неаперабельны... Але ж... Можа, толькі ў нас, а магчыма і ва ўсім свеце — панаваў і пануе прынцып абсурда. Каб канчаткова зацвердзіць бясспрэчнае, трэба яшчэ зрабіць тое, тое, тое... Немагчыма без такіх кансультацый... Патрэбна канчатковае слова анколагаў... І г. д.

«Што мы тут робім? — пытаўся Март. Што? »

## 8

У мяне была першая, нармальная рэакцыя — вырваць яго адтуль, завезці дадому. Усё, што рабілася, гэта толькі для пацвярджэння ўжо вызначанага дыягназу. Чалавека прымушаюць пакутаваць, каб паставіць усе патрэбныя «галачкі». Аднак пакуль ён не атрымае патрэбных паперак: эпікрызаў, сведчання пра інваліднасць, нам не выдадуць лекаў: абязбольваючых, а пазней наркатычных.

О, гэтыя дакументы! Потым з-за іх трэба было яшчэ патрапіць на чатыры дні ў анкалагічны цэнтр пасля двух тыдняў блуканняў па пакутах у 5-й клініцы. А потым (ужо мне) лётаць у МРЭК (Мінская гарадская медыка-рэабілітацыйная экспертная камісія) і чакаць іх дома... А яны «праявіліся» знянацку — у МРЭКа ў гэты дзень была машына... Рэжым эканоміі... Што ж там такая дробязь, як чалавечае жыццё? Дзяржава эканоміць...

# ВЫШЫНІ ПАЛЁТУ…

…А два тыдні кожнага ранку я бегла, ці больш дакладна, прабачце, цёглася — праз увесь горад у 5-ю клініку… Мокры снег. Хлюпата. Слота. Як на той грэх, зламалася «маланка» на боціках…

Ад хаты да метро — паўгадзіны, на метро — восем прыпынкаў, сорак хвілін — ад метро да шпіталя. Там курсіраваў нейкі аўтобус, але яго чакаць — таксама ці не з паўгадзіны, ды не летнім днём… У мяне ў руках — посуд з журавінавым морсам, бярозавым сокам, яшчэ нейкімі сокамі… Фрукты…

Прылятаю ў палату — ён яшчэ ружовенькі, у бялюткай маечцы, такі на выгляд здаравячок… (Пазней ён схудне і стаў падобны да вядомага ідальга з Ламанчы…)

…Паміж намі — як сцяна… З маім пакутным веданнем прысуду — і яго няведаннем… З яго безапеляцыйна кароткім шляхам да іншабыцця і маім — пакуль невядомым…

…Зрушылася скала… Яго моц… Яго непахіснасць… Яго здароўе… У яго яшчэ была вера, але ён засяродзіўся на нечым сваім, патаемным, запаветным… Прынесла яму кнігі — не. Біблію — не. Газеты — адрынуў. Транзістар — выправіў дадому.

«Усё прайшло», — час ад часу паўтараў Март.

…Паміж намі —сцяна… І адначасова мы — як адно… З болю, адчаю, смутку… Кажуць: «Мая палавіна…». Мне здаецца, з 7-га снежня ён — як тры чвэрці мяне… Ці наадварот…

Усё ў жыцці, рэчаіснасці сублімавалася ў гэты куток — палата №2. А ўсё астатняе — гэта іншае… Іншае існаванне, іншая свядомасць… Іншая планета…

Часам мне здавалася — гэта жудасны сон. Прачнуся — і ўсё, як раней. Не хацелася верыць — вось ён, рэальны, прыгожы, у цвярозым розуме… І ён — ужо як быццам і не ён… Асуджаны лёсам. Да абавязковага. Да таго, што ніхто з нас не міне. Не пазбегне. Не ўратуецца. Нават самы шчаслівы. Самы разумны. Самы таленавіты. Аднак, калі… ўсё прапісана… Неаспрэчна… Ён яшчэ тут — і яго ўжо як няма…

*Мой конец предначертанный близок…*

…Мяне не пакідала адчуванне недарэчнасці, несправядлівасці… Гады немалыя… Аднак ён быў яшчэ поўны энергіі, нерастрачанай сілы… Зусім толькі што…

…Голас жыцця, прага жыцця — нібыта ўжо за межамі рэальнасці…

«…адгэтуль шчаслівыя мёртвыя, што ўміраюць у Пане. Сапраўды, кажа Дух, каб супачылі ад трудоў сваіх, і ўчынкі іх ідуць следам за імі» (Адкр.,14,13).

Замаўляла Імшу ў царкве і ў касцёле… Не спадзеючыся на цуд… Ці яшчэ спадзеючыся…

…Ён, мой Март, яшчэ тут, рэальны — і ўжо недзе там, на нязбытным, няўмольным шляху… А я была ўпэўненая, што гэта ён будзе праводзіць мяне… Па-мойму, ён таксама прытрымліваўся пра сябе такой думкі… Паводле задумы натуры, паводле генетыкі — цёткі яго ледзь не да ста гадоў дажыліся, дзед, бацька яго маці, на якога Март быў падобны, таксама меў пад дзевяноста…

…Праўда, да адказу дактарыцы, што яго курыравала і па іроніі лёсу мела імя па бацьку «Маратаўна», дык да гэтага яе «звышпрафесійна этычнага» фартэля, ён неяк трымаўся…

«Доктар, ну, хаця б адну нагу мне вернеце?» «Речь идет не о ноге, а о жизни и смерти!» — безапеляцыйна фыркнула дактарыца. І потым, як не спрабавала хаця б змікшыраваць афронт сваёй падначаленай загадчыца аддзялення Наталля Мікалаеўна Гола, добры ўрач і сімпатычны чалавек, ёй гэта не ўдалося…

Март зніякавеў пасля гэтай праўды… А трэба было чуць, у якой танальнасці тая рэпліка была вымаўлена… Якая там клятва Гіпакрата…

Март пасля выпаду дактарыцы больш нікому не тэлефанаваў па мабільніку, але ў шпіталі яшчэ адказваў на званкі… Пасля вяртання дадому ён не расставаўся толькі з гадзіннікам… А яго звышдакладны «камандзірскі» перастаў адлічваць час праз пару дзён пасля таго, як перастала біцца сэрца гаспадара… Містыка? Ці ён яго скінуў няўрокам ці ўдарыў? У любым выпадку не адношу наладжваць…

## 9

Кожнага дня я ўраніцы глядзела на гэты гадзіннік. З адчуваннем канца ранейшага жыцця… І з нейкай асобай пэўнасцю разумеючы: заканчваецца ноч (перажылі), пачынаецца раніца, ранішняе ўзнаўленне сувязі са светам. Прычынна-выніковыя сувязі імпульсаў і ўчынкаў… Перажыванне разбурэння часу… Незаўважна кароткае цяперашняе — з яго аграмадным, жудасным зместам, доўгія, доўгія пакуты… Смерць — з яе неспасцігальнай эмпірыкай… Абстракцыя — іншабыцця… Небыцця… Неўяўляемых уяўленняў… Існаванне ў крохкай, даўкай, рэальнай і ўяўнай рэчаіснасці… Рэальнасці, у якой нібыта скандэнсаваліся трывога, чаканне, безнадзейнасць, страх… І яшчэ амаль радасць — ад маленькіх, дробязных прыемнасцяў: вось яму спадабаўся прынесены сок, вось у яго палату, хоць на пару гадзін, падсялілі не чалавека ў безнадзейнай коме, не спінальнага хворага, а пацыента, што досыць свабодна перасоўваўся ў прасторы і мог падтрымаць гаворку, не абавязкова пра хваробу… Вось прыходзіць пасля выхадных санітарка Раіса Сямёнаўна — заўсёды ў гуморы, добразычлівая ўмелая, гаваркая… Пасля суботня-нядзельнага дыктату гарылападобнай мазахісткі, старэйшай медсястры Ларысы, якая асуджанаму на смерць хвораму пашкадавала шклянку вару, — гэта ўжо цешыць і амаль радуе…

А наконт шклянкі кіпяточку… Потым я прынесла і тэрмас, і кіпяцільнік… Кухні ў шпіталі не было, сняданкі-абеды-вячэры прывозілі аднекуль… У даўнія часы ў шпіталях і, дарэчы, правінцыйных раённых гасцёўнях стаялі старэжымныя бачкі з кіпяточкам… Ну, у век Інтэрнэту і камп'ютараў іх ужо няма… Але ж і на замен ім нічога няма. Халадзільнікі — у наяўнасці. А тут… Аказваецца, у вестыбюлі былі аўтаматы з кавай (у шпіталі!) — і ўсё. Электракіпяцільнікі — таксама кантрабанда…

Увогуле — чаго толькі не давялося чуць у той 5-й клініцы! Даведацца пра гэты асобы від чалавека (ці недачалавека?) — санітарка… Чаму яны, ненавідзячы і сваю працу і, калі не ўвесь род людскі, дык хворых — пэўна, не кінуць гэты занятак і не пойдуць у гандаль, на кірмаш, на вытворчасць? Гэта так і засталося для мяне загадкай…

…А забрала адтуль майго Марта напярэдадні Нараджэння Хрыстова, паводле ўсіх, здаецца, хрысціянскіх канфесій, акрамя праваслаўнай артадоксіі. 24 снежня…

…Навучылася рабіць уколы. Карміць яго з лыжачкі. Слухаць яго балючае пытанне: «За што?» — і не ведаць ні яго адказу.

…Бог вызначае пакуты абраннікам сваім? Сапраўды, ёсць «малітва аб захаванні ад раптоўнай смерці»… «Прашу Цябе, каб у гадзіну смерці маёй Ты меў ласку захаваць мне свядомасць, мову, шчыры жаль за грахі, сапраўдную веру, моцную надзею і дасканалую любоў да Цябе».

Усё гэта Найвышэйшы захаваў Марту, які меў тую сапраўдную веру, дарэчы, ніколі не расставаўся з абразком Святога Марка (гэты абразок пайшоў з ім і ў іншабыццё)… Але ўцаркоўленым вернікам не быў — не ведаю, чаму… Для мяне Касцёл — увасабленне і сімвал Веры і касцёл — бажніца, куды мне неабходна хадзіць да Святой Імшы і ў светлыя і горкія гадзіны…

Наканаваўшы вялікія пакуты Марту, Пан Бог даў яму найвялікшае цярпенне і мужнасць… Ніводнага стогну, скаргі… Хіба што просьбы — самыя простыя…

…Боль яму сцішвалі ўколамі… Пачыналі з так званай «трайчаткі»: аналгін, папаверын, дымедрол… Потым — рознае… Найперш — трамадол… Страшэнна пакутваў ён ад нязручнасці стану, ад параплегіі… Часта задыхаўся… Уколы я рабіла яму і раннім ранкам, і некалькі разоў на дзень, і ўвечары… І ўначы… Звычайныя «хуткія» і спецбрыгады (паводле яго хваробы ці, больш дакладна, паводле спадарожным анамаліям) былі ў нас ледзь не кожны дзень.

…Бездапаможнасць… Гэта найбольш прыгнятала яго. І безнадзейнасць… Пасля той рэплікі-«эпікрызу» дактаркі, у яго з'явілася спадзяванне, калі павінны былі перапраўіцца ў іншую клініку: анкалагічны цэнтр. «Знайдзі Сашу. Патэлефануй яму…» Саша — мой зямляк, наш агульны добры знаёмы, яго бацька і мая мама — мелі стасункі ў працы, паважалі адзін аднаго як прафесіяналы і як сумленныя людзі… Цяпер Саша, Аляксандр Васільевіч, сур'ёзны медык, на высокай пасадзе… Адразу адгукнуўся… Як зямляк… Высакародны чалавек… Дастойны сын свайго бацькі… Дарэчы, ганаровага грамадзяніна Чэхаславакіі, дзе ён падчас Вялікай Айчыннай вайны быў у партызанах…

Аляксандр Васільевіч адгукнуўся… Але было позна…

Не ўмеў Март сябе любіць… Не ўмеў…

Пасля вяртання дадому з анкалогіі ў яго было, мабыць, падвойнае адчуванне: трывога — нічога ж не рабілі, ні аперацыі, ні абпраменьвання… Светлата — ад вяртання ў родную хату, у любімы пакой, які ён зваў «святлічкай». Родныя сцены, звычная атмасфера, любімыя рэчы… Прыгожа, светла… У суседнім пакоі, сумежным, два ражкі люстры гарэлі ўсю ноч — ён не хацеў цемнаты…

25-га снежня ён нават крыху паеў і зрабіў глыток каньяку… Пасля гэтага — толькі бульёны з лыжачкі, ёгурты, зялёная гарбата, спачатку журавінавы морс — пазней ён і ад яго адмовіўся, і вада, вада, вада… Бона аква… Я на яе цяпер глядзець не магу…

Аднаго разу схамянуўся: «Чым вы мяне лечыце?» Я добрасумленна прачытала яму анатацыі…

У асноўным ляжаў з напаўпрыкрытымі вачыма…

«Што ты мне тэмпературу мераеш? Я пацыху паміраю…»

## 10

*«Мой конец предначертанный близок…»*

…Ён губляў сілы… Нават дужыя, прыгожыя рукі яго сталі губляць сваю моц…

Часам спрабаваў жартаваць… У 5-й клініцы: «Звані, прыходзь, я нікуды не пайду…». Дома, калі паклікалі суседа, каб ён дапамог крыху змяніць пазіцыю цела: «Заходзьце, у карты згуляем…» Гэтая рэпліка — літаральна за пару дзён да яго апошняга дыхання…

А я і ў апошні дзень бегала па аптэках… Ледзь не праз дзень выстойвала чэргі ў паліклініцы, каб выпісаць лекі…

«Пасядзі са мной», — усё часцей прасіў Март. І ніколі, мабыць, не было паміж намі такой бездані і такой паяднанасці і разумення, як у гэтыя апошнія 52 дні і 52 ночы. Час безнадзейнасці… І нейкай надзеі… Хаця б на месяцы жыцця… Дні… Гадзіны…

…Залатыя кроплі жыцця…

«Пасядзі са мной…»

…Тэлефанавалі многія… І калі не ведалі. І калі даведаліся. На званкі не адказвала. Што гаварыць? І калі? У мяне была занятая кожная хвіліна… Падтрымлівала сувязь толькі з некалькімі людзьмі — тымі, дзе ўсё таксама трымалася «на тонкім лёдзе».

Прыязджала праз дзень-два Іна, надзейна дапамагала «трымаць вахту» каля брата… Яе мужа і дачку Верачку мы «вызвалілі». Яго — паводле стану здароўя, яе, студэнтку, з-за экзаменацыйнай сесіі, ды і з этычна-эстэтычных меркаванняў: хай застанецца ў любімай пляменніцы памяць пра здаровага, вясёлага і моцнага дзядзьку… Ён сам найперш не хацеў, каб яго бачылі ў такім, мякка кажучы, не лепшым стане… Ні сваякі, ні калегі, ні знаёмыя… Калегі па апошняй яго працы акуратна тэлефанавалі… І падчас хваробы, і пасля таго апошняга дня… …Мае землякі… Наваградскія…

…Мае калегі… Па Саюзу пісьменнікаў… Па рэдактарскай працы… Хто пісаў мне, хто званіў… Уладзімер Арлоў, Уладзімер Васілевіч, Таня Зарыцкая…

А ўрачы «хуткай»… Былі такія дасведчаныя, уважлівыя… Адна з дактарак зрабіла патрэбныя ўколы Марту і сказала мне: «Увяла яму добрую дозу — будзе спаць. У вас жа твар…» Тамара, прыйшоўшы, праясніла: «Што з Асвенцыму».

Былі медсястрычкі ў анкалагічным цэнтры, якія вярнулі забыты мабільнік…

І, безумоўна, была фірма «Белрэквіем». На фоне ўсіх выпрабаванняў на трываласць, калі чалавек памірае, так бы мовіць, на агульных падставах: не ў лечкамісіях, не ў прывілеяваных шпіталях, гэта быў відавочны дарунак Провіду. Усё — пачынаючы ад першапачатковага рытуалу да апошніх крокаў (нават паперка-сведчанне пра смерць, прынесеная ў суботу), дык усё было зроблена на самым высокім узроўні і за тую ж цану, як у дзяржаўных установах рытуальных паслуг. Высокапрафесійна, дакладна, карэктна. Нават — выдатны святар. Нават — белыя ружы назаўтра раніцай…

Дзякуючы гэтай фірме мы — я, яго сястра, швагер, пляменніца — маглі па-хрысціянску, з малітвай, па-чалавечы развітацца з ім. Апошнія імгненні разам з ім, каля яго…

Адчуць сумную непаўторнасць гэтых гадзін, хвілін… Ужо няма пакут, яшчэ не зусім усвядомленая бездань адчаю, спустошанасці… Страты… «Усё прайшло», — як прамаўляў Март… Да апошняй хвіліны ён быў у прытомнасці, але ўжо не зусім тут, ужо недзе на мяжы зямнога быцця… «супачылі ад трудоў сваіх, і ўчынкі іх ідуць следам за імі»…

## 11

…Пражыў ён не так мала… Але быў поўны планаў, надзей… Моцы… Не зжыў сябе…

Фартуна дапамагае моцным?

…Ён быў моцны… А пані Фартуна…

…Гляджу на неадпрэчнае шэсце вясны… Расцвіла пад вакном ігруша… Распачалі свой маёвы баль каштаны…

…Апошнім часам у нас з Мартам усталяваўся звычай: калі нехта з нас адзін адыходзіць з дому, праводзіць з лоджыі. Вось ён рабіў знак рукой, шыбаваў па сцежцы… І знікаў за дрэвамі — летам… А зімою — нібыта за небакраем…

«Малады чалавек на лініі гарызонту, вярніцеся!». За небакраем…

«Вярніцеся!»

…Не вяртаецца…

…Не вяртаюцца… Ні ён… Ні маладосць… Ні шчасце…

…Толькі распушыліся бярозы, у тым ліку і пасаджаныя асабіста ім каля нашага дома — ужо ці не ўпоравень з дзевяціпавярховікам… На вышыні палёту ластавак…

…Некалькі гадоў таму падчас урагану, які не адно дрэва знёс у горадзе, Март з трывогай глядзеў на свае бярозы… Выжылі… Высталі… Зноў высяцца ў сваім карункавым харастве… Ягоны след…

*Ўсё знікае, праходзіць, як дым,*
*Светлы ж след будзе вечна*
*жывым…*

Ці не пра тое — галасы птушак, што прыляцелі да змайстраванай Мартам кармушкі?

**27 сакавіка, 9 траўня,**
**1 лістапада 2010 года**

▸ ВЕРШЫ

# ДРАБНІЦЫ ЖЫЦЦЯ

Ёнас ЛІНЯЎСКАС



## Без узаемнасці

*Даўно без узаемнасці ўлюбёны,*
*Прад ёю чырванею і нямею,*
*Не ведаючы, што і як сказаць,*
*І, слабасць адчуваючы ў нагах,*
*Куды ні йду — услед іду за ёю.*

*Даўно ў яе ўлюбёны без надзеі,*
*Я выключаў святло ў дзяцінстве ў школе,*
*Яе імя паўсюль пісаў на сценах,*
*Каб на мяне яна звярнула ўвагу,*
*Але яна ні разу не зрабіла*
*Ні жэсту, ні намёку на ўзаемнасць.*

*Пазней я спрабаваў давесці ёй,*
*Што маю густ, шляхетныя манеры,*
*Што я найлепшы з тых, на кім яна*
*Магла б спыніць свой выбар, ды заўсёды*
*Знаходзіўся хтось лепшы за мяне.*

*Я спрабаваў забыць яе з сябрамі,*
*Я змрочна піў, ды што я ні рабіў,*
*Што ні казаў — усё было нічым,*
*Апроч маёй любові беспрасветнай,*
*Якой я поўніўся і біўся праз якую,*
*Пачуўшы хоць бы слоўца непавагі.*

*Радня, сябры, суседзі пачалі*
*Тады лічыць мяне занадта дзіўным*
*І старацца сталі… Так жыву*
*Адзін я не адно дзесяцігоддзе,*
*На нешта ўсё яшчэ спадзеючыся*
*Ў любові безнадзейнай да Радзімы.*

## Папраўкі да закону аб дадатковым кошце

*Як толькі ў неба ўскрыліць самалёт —*
*Так дадатковы кошт я набываю.*

*Раблюся лепшым: не палю, не п'ю,*
*Не лаюся, бурклівa не злуюся,*
*І не хачу маёмасці чужой,*
*Як, зрэшты, немаёмасці таксама,*
*І, гледзячы на формы сцюардэс,*
*Нічым я не займаюся з суседкай.*

*Чым я вышэй, тым болей ува мне*
*Любові да ўсіх блізкіх і няблізкіх,*
*Пенсіянераў і дзяцей, хай нават*
*З тату і пірсінгам на розных частках цела,*
*Да геяў, лесбіянак, рускіх і*
*Амерыканцаў, незалежна ад*
*Канфесіі, партыйнасці і расы,*
*І болей веру ў Бога я, ва ўсё*
*Што пада мной плыве і нада мною*
*За шклом ілюмінатара. Я варты*
*Таго, каб называцца чалавекам*
*На вышыні пад дзесяць тысяч кіламетраў,*
*Насмерць прыкуты рамянямі страху.*

*Калі ж дамоў вяртаюся, калі*
*На лецішчы капаюся ў гародзе,*
*Я думаю: «А ўсё ж якія жабы*
*Ляцяць у небе, колькі ўсё ж г..на*
*Яны нам выліваюць на галовы,*
*Вунь і капуста ўся праз іх счарнела».*

## Мадам

*— З малаком ці з вяршкамі*
*вы жадаеце каву?*

*(Лёгкі фліірт ці эротыку*
*выбралі б вы перад сном?*
*Што ў спадобу вам: дождж,*
*які ціхенька стукае ў вокны,*
*ці камінныя прыцемкі ўночы?*
*Ці ўдзень санцапёк і гарачая, летняя,*
*загарэлая скура з адкрытымі порамі,*
*ці — нібыта марозцам пакрытая —*
*белая скура зімой?)*

*— Каву з цукрам ці без?*

*(Што вы любіце: можа,*
*бляск сваіх успамінаў дзіцячых?*
*Ці любіце вы ціха плакаць, абняўшы падушку,*
*бо ён вас не варты?*
*А, быць можа, вы любіце Канта?*
*Ці ў спадобу вам болей шуфлядкі з усёй драбязой,*
*аксамітныя пушачкі, поўныя розных забавак?*
*Ці не ў радасць нічога, бо цісне нябёс пустата,*
*ад якой вы ратуецеся, апусціўшы павекі*
*на збалелыя вочы,*
*на раптоўна, як зоркі, збялелыя зрэнкі.*
*Прапаную гарбату!..*
*З Кітаю і з Індыі, і з Цэйлону —*
*зялёную, чорную, жоўтую,*
*я гатую любую: як у спосаб ангельскі,*
*так у спосаб французскі, у традыцыях рускіх,*
*а таксама кітайскіх, і я абяцаю,*
*што падам яе вам год праз дзесяць ці дваццаць,*
*калі вы, адпаведна традыцыям,*
*накінеце лёгкі халат…*
*Калі вы мне адкажаце сёння…)*

*— З малаком ці з вяршкамі, мадам?*

**Пераклаў з летувіскай Уладзімір Някляеў**

## Снег

*Усё прасыпаем, я ўсё спазняюся,*
*Не паспяваю ўсё на хвіліну,*
*І збіраюцца пацеркі справаў няскончаных,*
*Хоць шукай на іх стагоддзе асобнае.*

*Я забыўся завесці конікаў —*
*І вось ніхто не цвіркае і не скача,*
*Дзятлы таксама гатунку не найлепшага —*
*Ужо не стукаюць ва ўсходні бок.*

*Мухі — і тыя ледзьве поўзаюць —*
*Карацей, ва ўсіх скончыўся час.*
*А ўчора, помню, жужжэлі як вар'яткі,*
*Я ганяў іх ад мёду і малака.*

*Салодкае было жыццё —*
*Прайшло — і не адбылося.*
*Цяпер ужо нават на першы снег*
*Пазіраю са слязьмі.*

* * *

*Паўзбоч я прайду, бо твань разлілася і кісне,*
*Нібыта шукае лісу, якая на качку цісне.*

*На ўзгорку ў рабіне дрозд чарнейшы за твань,*
*Кастрычнік, і што ні пара — ўсё роўна інь ці янь.*

*Carex, scirpus ці cyperus, — асоба найдалей сыходзіць, —*
*Яна сапраўды не адсюль, іх вецер з вадою лагодзіць,*

*І словы, як хілыя каласы, кладуцца ў снапы,*
*Зваротак быллём ліхаманкавым устаўляе між іх слупы.*

*Запозна, кастрычнік, запозна — тут ні жыцця, ні кроплі,*
*Толькі рабіна па ягадцы тупае як пантофлі.*

*Мінаю цябе, кастрычнік, мінаю цябе наўзбоч.*
*І восень, як павуцінне, а, можа, не восень, а ноч,*

*Калі знікаюць мясціны, дзе мусіў перачакаць дзень, —*
*Іх паглынае твань чорным драздом у вадзе.*

*І толькі каторы год не здольны твань абмінуць,*
*Хоць бачу штодня Хрыста, ён мне дае заснуць.*

## Бы вада

*Я хацеў бы вярнуцца, аднак куды вяртацца — не маю,*
*Як ранішняя вада, імкнуся наперад, бягу.*
*Пена словаў цягне на мель, у гэтым пакоі трымае,*
*Семіятычныя тросы і рэйкі ў шахтах ліфты берагуць.*

*Я падыму цябе, я абуджу цябе, хоць будуць прыцемкі,*
*Будзем на небе разам пільнаваць сэнс у далёкіх сузор'ях.*
*Там лёдавыя зязюлі вартуюць бераг*
*Птушыныя ракі,*
*Каб раптам яйка знічкі без нас не выплыла ў мора.*

*І на пытанне: — Мая чароўная спадарожніца, хто ты?*
*Замест адказу я чую хор спадарожніц чароўных.*
*І крочу шпарчэй, як вада ў жбаночак пусты.*
*Як жарсць — у каханне і смерць, як пустое ў поўнае.*

**Пераклаў з летувіскай Глеб Лабадзенка**

## Фантан

*Не маю грошай купіць сабе фантан.*
*Стаў бы пад дождж, ды ён ўквэцаўся ў балота*
*І ліпка-халоднымі пальцамі хапаецца за кустоўе.*
*Касавокія сарокі, шукаючы ежу,*
*Пераскокваюць з галіны на галіну.*
*Не маю грошай — яны пазарэз патрэбны дзяржаве:*
*Пасадам, установам, зямлі і паветру,*
*Паветра патрэбна народу для таго,*
*Каб душы дзядоў прыляталі, не адчуваючы ямінаў жыцця.*

*Не маю цвіка — прыбіць карціну.*
*Удзень і ўночы іх трымаюць, лунаючы ў небе, птушкі.*
*Сарокі прыкінуліся совамі, начную варту*
*Змяняе ранішняя, а яе — дзённая.*
*Так і вісяць у прасторы карціны памяці,*
*Першыя — як песні, а другія — як плачы.*
*Паветра поўніцца ўзмахамі крылаў,*
*Птушкі чаргуюць плачы і песні.*
*Ды лепш на зямлю ў гэты час не спускацца,*
*А сядзець дома, зачыніўшы дзверы і вокны.*
*Свабода — рэч, вярэдлівая для душы,*
*Прылі́пне бессаромна — не адарваць.*

*А змыць гэты сорам не маем уласных фантанаў.*
*Па хатах сядзім і пакусваем пёры.*
*Хочаш, празрыстасць вады апішу,*
*Бачыш — льецца пясок, хоць вазьмі і напіся.*
*Хочаш, мінуласць і прышласць табе апішу*
*На белым валоссі туману?*
*Дыханнем на шкле я намалюю карціну*
*І пасланцамі неба — галубамі —*
*Прышпілю яе да небасхілу Айчыны.*

## Драбніцы жыцця

*Штораніцы спяшаюся ратаваць Радзіму.*
*Забываюся пагаліцца, прычасацца,*
*Паваксаваць боты, папрасаваць кашулю —*
*Столькі нікчэмных драбніцаў.*
*Штораніцы спяшаюся ратаваць Радзіму —*
*Напаўразбураныя выдмы, чорных буслоў,*
*Старую Вільню, летувіскую мову.*
*На развітанне я забываюся пацалаваць*
*Сваю каханую.*

*Штодзень да змогі б'юся за Радзіму —*
*Ворагаў забіваю пісьмёнамі,*
*Выклікаю іх на дуэлі, дабіваю тэлефоннымі званкамі.*
*Увечары ледзь прывалакаюся, стомлены, дадому,*
*Каб з раніцы зноўку выпраўляцца на вайну.*
*— Дульцынея, дзе мой суп?*
*— Панса, чаму не навостраная зброя?!*
*І не лезьце мне ў вочы з праблемамі дзяцей і старых,*
*З працай, з грашыма, з хваробамі*
*Ды з іншымі драбніцамі жыцця.*

## Буслы

### I

*Калі надарыцца падарожнічаць*
*Ад Шаўляў уздоўж Завенця да самай Жамойці,*
*Прыглядзьцеся да нашых буслоў —*
*Яны ўзятыя на ланцуг*
*Пры хатах, платах і дрывотнях.*
*Дарэмна высільваюцца яны —*
*Крывавыя дзюбы і ногі —*
*Ланцугі трывалыя, як для быкоў ці баркасаў.*
*А дзеткі глядзяць з замілоўваннем —*
*Каб хоць не адляцелі ў Англію ці Нямеччыну.*
*У наваколлі не знойдзеш больш жабаў і змеяў,*
*Зайцоў, лісіцаў, касуляў, дзікоў.*
*Мядзведзі і зубры знішчаныя даўно.*

*Гісторыя наіўна паўтарае казку,*
*Што наш нацыянальны сымбаль — бусел,*
*І замоўчвае, як чарада буслоў*
*Напала на статак зуброў,*
*Выдзеўбла ім вочы і, аслеплых, жыўцом заядала,*
*А пасля задзяўбла да смерці.*
*Гісторыя — гэта не штодзённік,*
*Дзе было б падрабязна апісана,*
*У якое балота ўцякаў статак зуброў*
*І колькі сутак чулася адтуль іх безнадзейнае рыканне…*

### II

*Калі вы хоць аднойчы глядзелі ў вочы літоўскаму буслу,*
*Можаце не сумнявацца: вы глядзелі ў вочы смерці.*
*Там адлюстраваўся ўвесь пейзаж краіны,*
*Але — ніводнай жывой істоты.*
*І тут варта згадаць спрэчкі ў Сойме,*
*Калі зацвярджалі бусліны погляд;*
*Як дыскутавалі наконт нацыянальнай адметнасці,*
*Абмяркоўвалі гістарычны шлях народа,*
*Колькасць вады ў Балтыцы, калабарацыю і люстрацыю,*
*Законы рынку ў першую шлюбную ноч,*
*Акцызы для пенсіянераў, канвэрты для немаўлятаў,*
*Манаполію кароў на колер малака.*
*Перамаглі, як звычайна, эканамісты юрысты*
*І незалежныя эксперты з банкаў:*
*Урбанізацыя ёсць калыска для цывілізацыі.*
*Але калі бусел выносіць немаўля з калыскі,*
*То глядзіць такім позіркам, якім глядзяць у бяздонне.*

### III

*Бусел, бусел, клекатун,*
*Схапіў жабу за каўтун,*
*Па іржышчы валачыў,*
*У балоце намачыў, —*
*Так мы ў дзяцінстве спрабавалі перамагчы свой страх.*
*Хто ведае, ці ўдасца ўхіліцца ад буслінага ўдару,*
*Вастрэйшага за згрызоты сумлення.*
*Больш за паўжыцця мы жывем у страху*
*Атрымаць вастрадзюбы ўдар у глухім завулку,*
*З-за вугла, на шпацыры па ліпавай алеі —*
*Удар незаслужаны, удар несвоечасовы,*
*Удар — не як пакаранне, а як законны чын.*
*Нікога не цікавіць, як ты будзеш жыць заўтра,*
*Таму штовечар сонца заходзіць прыгажэй за смерць.*

**Пераклаў з летувіскай Міхась Скобла**

АГЛЯД

# ДЗЕЯ СЛОЎ



ЛеГАЛ

**Пачну з таўталогіі. Безумоўна, што часопіс «Дзеяслоў», як і ўсякі іншы друкаваны орган, створаны дзеля слоў. Справа за адным: яму неабходныя аўтары, якія маглі б тыя словы ўпарадкаваць дзеля надання ім пэўнага сэнсу і мастацкай мэтазгоднасці. Відавочна, што дапасаванне двух апошніх слоў дзіўнае і супярэчлівае. Але ў некаторых народаў здараюцца часы, калі неабходна адраджаць, развіваць і сцвярджаць сваю нацыянальную самасць: мову, культуру, літаратуру. І тады ў той самай мастацкай мэтазгоднасці, як гэта ні парадаксальна, з'яўляецца свая стваральная логіка. З гэтым нельга не пагадзіцца. Такі час перажывае і наша беларуская нацыя.**

Чарговы, 48-ы нумар часопіса, як заўсёды, аб'ёмны і важкі. Часам падаецца, што яго не зашкодзіла б крыху «звузіць», каб не вісела над галавой рэдакцыі дамоклавым мячом змушанае нівеліраванне выбітнага і шараговага. З іншага боку вялікай суполы незалежных літаратараў бракуе публічнай пляцоўкі. Як быць? Шукаць аптымальнае выйсце.

**Вершаваны твор Ніла Гілевіча «Споведзь крывічанкі»** — патрыятычная «мантра», своеасаблівы маліто́ўны хваласпеў годнай беларускай жанчыне. Простыя, але ўнутрана выбалены сюжэт з адраджэнскім рэфрэнам: «А як жа іначай? Іначай няможна мне.// Я ж — крывічанка». Такая вось запеўка 48-га нумара, метафарычна кажучы, — гістарычны голас сурмы. Нацыянальныя адраджэнскія пасылы — стрыжань усёй літаратурнай і грамадска-палітычнай дзейнасці народнага паэта Беларусі. Яны актуальныя ў часы вялікіх выпрабаванняў. Для нас, беларусаў, гэта змагарная паўсядзённасць. Таму паэтычныя словы Н. Гілевіча найперш займеюць водгук у сэрцах свядомых беларусаў.

Працяг **рамана «Сутарэнні Ромула» Людмілы Рублеўскай** грунтуецца на антаганізме і супярэчнасцях двух беларускіх родаў, якія, чым больш разыходзяцца ў сваіх ідэйных накірунках, тым больш прыцягваюцца сваёй нацыянальнай ідэнтычнасцю — як распілаваны на дзве паловы кубак, што з'яўляецца ключом да сакраментальнага замка беларускай грамадскай супольнасці. Усё як бы проста і на паверхні, толькі торгай за нітачкі дзей, з чым пісьменніца паспяхова і спраўляецца. Праўда, падчас здараюцца нестыкоўкі, калі, скажам, б'юцца да юхі студэнт з дацэнтам (такога ў навучальнай установе і пры цяперашнім выхаванні моладзі, бадай, не чуваць). Або карціна, калі герой правальваецца ўслед за гераіняй у сутарэнні пад зямлёй, моцна параніўшыся, аднак не выдае таго, спакойна соваючыся па цесных цёмных скляпеннях да той пары, пакуль не дае рады адкрыць дзверы ўласнага пад'езда. Аднак у цэлым гэтая частка вельмі жывая, нават, я сказаў бы, сцэнічная. Беларускі чалавек з болем здзірае з сябе «шагрэневую скуру», каб адрадзіцца і паўстаць годнай нацыянальнай асобай.

**Лясовы трыпціх «Подых звера» Ігара Сідарука** сам па сабе (пастаўленай тэматычнай задачай) цікавы, але занадта стыхійны і разбэрсаны як па форме, так і па змесце, не кажучы ўжо пра нейкую пэўную сюжэтную лінію. Ёсць выдатны пасыл да адзінай гармоніі ўсяго жывога ў Прыродзе. Аднак выклікае чытацкае пярэчанне, калі «сабачы Бог» пішацца з вялікай літары, а наўздагон яшчэ і ўдакладняецца «гэты Бог быў калісьці ваўком».

Менш уражлівая, хоць і больш дасканалая ў гэтым сэнсе **паэтычная нізка Святланы Варонік «Свята самоты»**. Пачуцці берасцейскай паэткі палягаюць не на паверхні яе тэкстаў, адсюль сіла і глыбіня іх уздзеяння на чытача.

Найбольш вартымі і запамінальнымі пакінуліся ўва мне **падборка вершаў Вікі Трэнас «За крок да раю...», літаратурныя запісы Андрэя Федарэнкі «Сечка-13» і «спробы заўчасных успамінаў» Аляксандра Лукашука.** У Вікі ўвогуле ці не ўпершыню атрымалася цэльная і выверанаяя публікацыя. Пазбаўлены штучнай сцэнічнай манернасці паэтычны стыль яшчэ маладой паэткі выявіў невядомыя мне дагэтуль яе натуральныя пачуцці і не засціснутае прагматыкай вобразнае мысленне. Не ўсё пакуль на жаданай вышыні, але вольна распраўленыя крылы абяцаюць свабодны палёт.

Андрэй Федарэнка бярэ іншым. Непадробным талентам і нажытым літаратурным майстэрствам. Здавалася б, такія ледзь не бытавыя запісы не павінны выклікаць глыбокай чытацкай рэакцыі. А тут — усё наадварот: на банальную, на першы погляд, рэалістычную згадку пісьменніка ў цябе (мяне-чытача) гоніць, як у таго падследнага сабакі Паўлава, рэфлексійную сліну з глыбокай падсвядомасці. Ты пачынаеш пярэчыць, аналізаваць, супастаўляць — учытвацца ў напісанае.

Што дорага даецца творцу, тое застаецца дарагім для яго чытачоў. **Аляксандр Лукашук са сваім «Саша what is your name?»** паўстае трохі манерным як па стылі так і па форме. Доўгай цэльнай аднаскаснасцю раздзелаў ён напамінае мне «Любіць ноч — права пацукоў» Ю. Станкевіча. Але Станкевіч — жорсткі і адназначны па змесце у ідэі, тады як Лукашук вонкава лёгка-эфемерны, цёплы, у меру іранічна-гульлівы, але, па сутнасці і ў падтэкстах, глыбока-філасафічны і плюралістычны ў высновах. Ён спагадлівы да ўсяго чалавецтва...

Нейк не адразу я «ўпісаўся» ў **раман Артура Клінава «Шалом»**, урывак з якога выдрукаваны ў гэтым нумары, але паступова ён мяне «зацягнуў» у свой вір, на жаль, ненадоўга, бо неўзабаве ён выйдзе асобнай кнігай у выдавецтве Логвінава. Сучасны філалагічны стыль, ненавязлівы, але прыцягальны змест, эстэтычная філасофія часу ствараюць аснову адмысловага твору.

Не выклікалі асаблівых уражанняў, апроч азнаямляльных, ні **твор Карэла Генэка Маха (1810 — 1836) «Май»** у перакладзе Макса Шчура, ні кароценькі ўрывак з **рамана Трыстана Х'юза «Паўвяртанне»** ў перакладзе Вольгі Гапеевай.

Чытаючы тэксты маладых літаратараў, якія былі дасланыя на **творчы конкурс беларускага ПЭН-цэнтра, прысвечаны Ларысе Геніюш**, па-першае, яшчэ раз пераканаўся ў тым, што колькасць беларускамоўнай таленавітай моладзі ў краіне дастаткова значная. Па-другое, што гэтая моладзь больш прабіўная і больш інтэлектуальная. Засмуціла хіба што большасць прачытанага, бо выклікала найперш цікавасць і супярэчлівасць, але не суперажыванне. Усё ёсць у творах маладых аўтараў: і начытанасць, і высокае версіфікатарскае майстэрства, і пачуццё іроніі, і сцёб, і правакацыі, і сучаснае прагматычнае мысленне... Няма толькі той паэзіі, якая выклікае душэўнае замяшанне, таго, што, як кажуць у народзе, «бярэ за жывое». Мне могуць сказаць, што я проста не разумею сучасных стасункаў жыцця і мастацкіх праяў маладога пакалення. Але чаму ж тады я сам разумею і ўспрымаю паэзію Пушкіна, Багушэвіча, Цютчава, Багдановіча, Аненскага, Купалы, Блока, Жылкі? І чаму як зацікаўлены літаратурай чалавек я памятаю толькі нейкія фармалістычныя закіды Каменскага альбо Шукайлы, а не іх «самавітыя высокамастацкія творы»? Перабольшваю, але гэта пытанне, над якім варта задумацца.

Паэзія — гэта найперш пакуты ўнутранага жыцця аўтара. Праўда, мне ўжо не аднойчы казалі, а навошта нам вашыя пакуты, калі ёсць месца для радасці? Так, сучаснае пакаленне, апроч грамадзянскага хаасу, прагі неўсвядомленай безадказнай свабоды, барацьбы з ветракамі, пакуль не сутыкнулася з праблемамі «духоўнай адказнасці» не толькі за лёс пэўнай чалавечай супольнасці, але, найперш, за лёс канкрэтнага чалавека... Адсюль — кітчавасць, тэматыка пафігізму і спробы вырвацца з абдоймаў інтэлектуальнай залежнасці. Літаратары хоць і агольваюцца, але творы іх пераважна безасабовыя, бо гэта ўсяго толькі вонкавая расхрыстанасць пры ўнутраным паўзмроку...

Напершапачатку мне падаліся найбольш вартымі творы Кірыла Дубоўскага і Асі Волкавай, а пасля пачалося клянраванне ўжо не раз недзе прачытанага... хоць, пэўна, каб пачаў чытаць з адваротнага боку, то падаліся б вартымі тэксты Ганкі Шэпт і Андрэя Пакроўскага. Я люблю маладых. У іх наперадзе шмат творчай працы, і, безумоўна, менавіта за імі — будучыня нашай нацыянальнай літаратуры.

У гэтым нумары заканчваецца публікацыя **дзённікавых запісаў Міхала Дубянецкага «Трэба рызыкаваць...»**. Выбітны чалавек савецкай эпохі, які заспеў яе агонію і ясна прадчуваў нацыянальную і дзяржаўную самастойнасць Беларусі, выклаў на паперы для нашчадкаў свой вялікаандзейны пасыл душы і выпісаў падрабязнасці ўласнага і акаляючага жыццягарэння падчас перабудовачага стрэсу. Я думаю, гэтыя жывыя дакументы канання савецкай эпохі стануцца прыгоднымі пры напісанні беларускай гісторыі нашымі сапраўднымі гісторыкамі.

Прадстаўлены **працяг эпісталярнай спадчыны слыннай паэткі Ларысы Геніюш** (падаецца заканчэнне яе ліставання з Язэпам Найдзюком). Чытаючы горкую прозу сямейных узаемаадносін побач з суровай вызначанасцю яе грамадзянскага лёсу, адчуваеш сябе неяк вінавата-мізэрным чалавекам са сваімі звыклымі постсавецкімі праблемамі.

Таксама ў рубрыцы «Спадчына» друкуецца **пачатак паэтычных твораў адышоўшага ў іншы свет Уладзіміра Марука** пад назовам «Намоўленае». Гэта спецыфічны жанр, калі вершаваныя тэксты запісваліся так, як яны прыходзілі на одуме ў галаву паэта, — празаічна, але з наяўнасцю неабавязковай (блытанай) рытмікі і рыфмоўкі. Мастацкая вобразнасць большыні тэкстаў падобраму ўражвае, і, думаю, чытач зверне ўвагу на гэтага «забранага дзяржхолдынгам» творцу.

У рубрыцы «Словы» — два інтэрв'ю. Адно — больш маладзёвае, расхрыстанае напаказ, з разлікам на зваротную рэакцыю. Я маю на ўвазе **гутарку Валерыі Куставай са шведскім беларусам Дзмітрыем Плаксам.** Тут шмат кідкай інфармацыі, што змушае чытаць тэкст да канца. **Размова Андрэя Масквіна з вядомай гарадзенскай паэткай Данутай Бічэль** — іншага плану. Па-першае, аснову сваіх перыядычных гутарак са знанымі беларускімі літаратарамі Масквін «закладае» на фундаменце выбітных (ці проста абраных ім) тэкстах сваіх суразмоўцаў. У рэшце рэшт, паглыбляючыся ў кантэкст, журналіст выпытвае ў «падследнага» «рэцэпты» цікавай чытачам і прафесіяналам патаемнай кухоннай лабараторыі кожнага канкрэтнага творцы, а заадно і «запаўняе пустыя месцы» ў асабовай картцы лёсу таго ці іншага з іх, якія незабаве ўзбагацяць архіўныя і музейныя захаванні ды ўвойдуць у энцыклапедычныя выданні.

Друкуецца заканчэнне **эсэ Віталя Тараса «Сто гадоў адлучэння»** (Леў Талстой як люстэрка нашай эвалюцыі). Пра Талстога напісана столькі, што дадаць да гэтага нешта адметнае амаль немагчыма, але гэты арыгінальны тэкст беларускага журналіста з праекцыяй на сусветную гісторыю літаратуры і філасофіі чытаецца з цікавасцю і без апатыі. І ўсё ж, думаю, беларусам будзе бліжэй **эсэ паэта Сяргея Законнікава «Ахоўная зорка»** (слова пра сябра). Гаворка вядзецца пра Уладзіміра Караткевіча. Па сутнасці, гэта і не эсэ, а ўспаміны пра адметныя сустрэчы і стасункі аўтара з Караткевічам. Вельмі шмат арыгінальных, вясёлых і не вельмі, згадак, якія дадаюць слыннаму творцу штрыхі нацыянальнай чалавечай простасці. Поруч, да 80-годдзя з дня нараджэння знанага пісьменніка, друкуецца і **эсэ паэта Віктара Яраца.** Агулам, чытаючы ўсё напісанае апошнім часам пра нашага славутага пісьменніка, не-не, ды й задумаешся: калі б Уладзімір Сямёнавіч ведаў, як яго ўсе моцна любілі і берaглі — ад ЦК да завадскога токара — ён бы не паміраў так рана. Зрэшты, дзякаваць Богу і яго таленту, ён і так «жывейшы за многіх жывых». Друкуюцца таксама **лісты Караткевіча да Міколы Улашчыка.** Увогуле ў гэтым нумары часопіса даволі шырокае месца адведзена культурнай і літаратурнай спадчыне слаўных асоб нашай Бацькаўшчыны (невядомыя **вершы і апавяданне А. Сыса;** Анатоль Сідарэвіч прадстаўляе тэкст **Аляксандра Бурбіса «Колькі слоў аб беларускім тэатры і хоры»;** нататкі адноса аднаго верша Янкі Купалы **Івана Лепешава «Не плюй у карытца...»; згадкі Уладзіміра Сіўчыкава пра нядаўна памерлага Вячаслава Дубінку «Алхімік, казачнік, жаўнер»).** Завяршаюць часопіс **публікацыі вершаваных фельетонаў Алеся Няўвеся** ды рэкламныя звесткі пра новыя выданні ў рубрыцы **«Рэшта».**

Якую можна падвесці рысу напрыканцы гаворкі? Змест часопіса атрымаўся align рознабаковым, ахоплена шырокая панарама сучаснага літаратурнага жыцця і разам з тым годна пададзена творчая спадчына ды ўспаміны пра выбітных асоб нашай культуры і літаратуры. Ёсць творы маладзейшых і старэйшых пісьменнікаў і паэтаў. Знайшлося месца і тэкстам, якія экстрапалююць мастацкую вартасць нашай літаратуры ў па-замежным свеце. Агулам праследжваецца спроба звесці да гармоніі ўсе літаратурныя тэксты, якія, у пераважнай большасці, прачытваюцца як адно цэлае і непадзельнае — нацыянальна беларускае. Ёсць тая — **мастацкая і мэтазгодная** — дзея слоў, пра якую я казаў на пачатку. А што да глыбокіх крытычных рэляцый, то прытрымаю іх да заключнага нумара гэтага года.

ЭСЭ

# НУ ЯК БЕЗ ІХ?..

Валеры СТРАЛКО

**Што б мы, мужыкі, рабілі без іх? Бо па жыцці, усё-ткі, вядуць нас яны, родненькія. Нават у дробязях. Я не раз у гэтым пераконваўся. Цяпер — у чарговы раз. Але крыху прадгісторыі...**





Дажыўшы да істотнага ўзросту, схамянуўся я, што ні разу не быў за мяжою. Многія са сваякоў, сяброў і знаёмых пабывалі, а я — не. Ну, так склалася. Раней хацелася, потым — быў не супраць, а цяпер — згубіў усякую цікавасць. Дый ангельскай не валодаю. Вучыць жа пазнавата — на восьмы дзясятак прасачыўся. Але ж сорамна неяк стала: ну як так — амаль усе пабывалі, а я не.

Міжволі ўсё болей стаў даражыць я сваім «непабывальствам за мяжою». Мой рэйтынг унікальнасці рос і рос. Хоць ты бярыся зарабляць на гэтым грошы. А што? Можна ў клубах, дамах культуры, універсітэтах, на будаўнічых пляцоўках чытаць платную лекцыю на тэму: «Як я здолеў не пабываць за мяжою?» Народ бы ў цырк будзе валіць. А то, стаўшы ў 60 год «чыстым» пенсіянерам, я практычна адвучыўся зарабляць. Гэта ж не заробак, калі зрэдзьчас атрымаеш нейкі ліліпутны ганарар за чарговую кніжку. Дый той імгненна знікае ў адну са шматлікіх фінансавых дзірак. У перыядычным жа друку практычна не паяўляюся. Прычыны вядомыя… А калі б не пенсія?! Яна, як матулька родная, як спагадная жанчынка, не дае прапасці.

Вунь мая нябожчыца цешча, гадаваўшы шасцёх дзяцей, не змагла набыць патрэбнага працоўнага стажу і атрымлівала нейкія смешныя «ўтрымманскія» капейкі. Дык цесць, стаўшы пенсіянерам, улаштаваў яе начным вартаўніком у дзіцячы садзік і дзяжурыў за яе не меней дзесяці год. Да чаго ж была радая цешча, пачаўшы атрымліваць амаль такую ж, як і муж, пенсію. І кожны раз са шчырым здзіўленнем па-украінску казала: «От дожылася — нічого нэ робыш, а гроші носяць». Як было ёй не дзівіцца, калі суткамі жылы рвала, падымаючы такую плойму, і ніхто не плаціў. Бо афіцыйна не рабіла. А тут... Дык такіх жа жанчын, якія самаахвярна выцягвалі дэмаграфію краіны, асабліва раней, — кожная другая…

Але вернемся да маёй «унікальнасці». Мабыць, дасягла яна апагею, калі раптам, умомант, абурылася. А ўсё старшыня Саюза. Тэлефануе і кажа, каб рыхтаваў валізы і — у Швецыю. «Як у Швецыю?! У якую яшчэ Швецыю?! А...». Ды што яму мая ўнікальнасць? Начальства падначаленых рэдка шкадуе.

Швецыя, праўда, намагалася мяне абараніць. Ну, каб захавалася мая «ўнікальнасць.» І, ведаючы, што на замену пратэрмінаванага пашпарта ў нас спатрэбіцца каля месяца, заявіла, што можа чакаць толькі тры дні. Ды раптам захацелася мне спадабацца ёй з іншага боку, прадэманстраваць сваю, так бы мовіць, «прабіўную сілу». Праз тры дні я прынёс у Пасольства Швецыі новенькі пашпарт. Там зразумелі, што «унікальнасцю» я ўжо нацешыўся….

Сярожа, зяць мой, дай Бог яму здароўя, у такую рань падняўся, каб адвезці цесця ў аэрапорт. За дзве гадзіны да адлёту былі ўжо на месцы. Агледзеўся. Даўно забытая атмасфера аэрапорта... Гэта ж колькі часу я не лятаў? Мабыць, з 1990-га, калі выпадкам пабываў ва Усць-Каменагорску. А вось упершыню паляцеў — у 1965-м…

Самалёт узяў курс на Стакгольм. У суседках — Вікторыя. Мастачка. Выпускніца інстытута культуры. Жыве ў Брэсце. Малога сына гадуе адна. Хаця чаму адна? З бацькамі сваімі. А дзе бацька сына, Бог ведае. Зарабляе на жыццё дызайнам. Ляціць у Стакгольм да лепшае сяброўкі, якая запрасіла... Ну, нешта пра сябе і я расказаў. Слухала Вікторыя чамусьці звышуважліва, час ад часу робячы вялікія вочы. Канечне, намагаўся такі стан яе падтрымаць як мага даўжэй...

Але тут мне стукнула: а ці не Шлёнкіна Віка (яна умела так слухаць) праз гэтую суседку нагадвае пра сябе, спрабуючы заадно зрабіць мой пералёт, і без таго камфортны, яшчэ больш прыемным? З Вікаю і яе мужам Анатолем я на працягу 8 год працаваў у інстытуце ядзернай фізікі ў Новасібірску. З Анатолем, да таго ж, адначасова галернічаў 6 год на завочным аддзяленні электратэхнічнага інстытута. Потым, калі я з сям'ёю перабраўся ў Мінск, гадоў 20 мы перапісваліся. Анатоль адказваў звычайна скупавата, а Віка апісвала досыць падрабязна ўсе навіны пра справы, агульных знаёмых. Паспеў я ў 87-м яшчэ паслаць ім сваю першую публікацыю: пару змешчаных у «Знаёмцы» сваіх перакладаў вершаў Міхася Стральцова, з якім незадоўга да таго пазнаёміўся, паказаўшы яму некалькі перакладзеных на рускую ягоных вершаў. Той прыхільна паставіўся да майго занятку, адразу ж патэлефанаваў у рэдакцыю, з кімсьці перамовіўся і скіраваў мяне туды, сказаўшы, каб знайшоў там літкансультанта Валодзю Някляева, перадаў яму свае пераклады для магчымай публікацыі. Хутка я пад'ехаў, знайшоў там Валодзю, аддаў пераклады. Ён спытаўся, хто я такі, дзе і кім працую. Выслухаўшы, гэтак насмешліва пытаецца: «А што, там, у вашых інстытутах, рабіць няма чаго?» Сцяўшыся, ў сваю чаргу спытаўся, ці зразумеў ён просьбу Стральцова і калі так, то астатняе яго не датычыцца. Паварнуўшыся, выйшаў. Незабавам, акурат у нумары, прысвечанаму 50-годдзю Міхася Стральцова, я з вялізнай радасцю знайшоў на трэцяй старонцы маладзёжнай газеты тую пару з першых маіх нягеглых перакладаў. Канечне, не ўтрымаўся, адаслаў Шлёнкіным. Адказ прыйшоў даволі хутка. Сярод іншага кінуліся ў вочы словы: «Ну вось, і ў нашым асяродку цяпер ёсць паэт». Ну які там паэт, падумалася, але так прыемна было чытаць пра сябе такое… Гарачкавыя 90-я спынілі, на жаль, нашую перапіску. І цяпер, цалкам верагодна, Віка праз маю суседку Вікторыю, таксама ж, зразумела, Віку, вось у такі спосаб як бы перадае мне вітанне і спрыяне ў камфортным палёце. Што ж, даляцеў я сапраўды цудоўна. Можна сказаць, пераможна. Сардэчны дзякуй вам, Вікторыі-Вікі!

У аэрапорце Стакгольма, развітаўшыся з Вікаю, хутка адчуў, што застаўся без усялякай падтрымкі, то бок, сам-насам з далейшаю сваёю траекторыяй. Самалётны, камфортна-пераможны стан куды й дзеўся. І пайшло-паехала... Мовы ангельскай, ні тым болей шведскай — ні бяльмеса. З цяжкасцю дакумекаў, дзе атрымаць з багажу сумку. Бачу, сунецца сіроткай па замкнутаму колу транспарцёра знаёмая баўліна. Пераставіў на падлогу. Глядзь, а з яе даволі шчодра капае. Пах — каньячны. Ага, адзін сувенір, паўлітроўка, ляснулася. Называецца, прывёз пачастунак. Адзіная перавага — сумка палягчэла на паўкіло. Але ж і драбнейшыя пляшачкі маглі дрызнуцца. З натугаю падняўшы сумку, супакоіўся: драбнейшыя, падобна, ацалелі. Трэба шукаць акно, дзе меў бы зарэгістравацца на самалёт да Візбю. Цягаюся па бясконцым аэрапорце — у руцэ сіняя сумка, на плячуку чорная, якую ў самалёт браў. Вопратка на мне цёплая, ды сумкі дадалі градусаў…

У пошуках патрэбнай стойкі ці не два кіламетры праваloкся ўжо па бясконцым аэрапорце. У кага ні «спытаюся», дзе тут, маўляў, да Візбю, на Готланд, — усе, як згаварыліся, шлюць і шлюць мяне далей. А 18 сінясумачных ды 8 чорнасумачных кілаграмаў зрабілі сваё — кінуў якар. Стаю й пытацца няма ні сілы, ні ахвоты, дый людзі ўсе разбегліся хто куды. А тут адкуль ні вазьміся, жанчынка ў уніформе і здалёк на мяне спачувальна глядзіць. А мо не на мяне, аглянуўся я. Не, падыходзіць, пытаецца нешта, а я цёпаю плячыма, кручу галавою. Ды неяк жа яна перайшла на польскую, трохі паразумеліся. Сама са Штэціна, Аняю завуць, як і маю дачушку. Ага, мільганула, гэта ж, мабыць, мая Аня такім чынам на выручку мне кінулася. Прасвятлеў крыху, кажу свой клопат. Ідзі за мною (махнула рукою), і досыць хутка пашыбавала пандусам вышэй. Я за ёй. Ірву жылы, намагаюся не адстаць. Выйшлі на роўнае, спрабую крочыць нявымушана, ды пот на ўсю морду псуе задуму. Аня зрэдзь азіраецца, ёй няма калі чакаць мяне — на працы ўсё ж. А тут сумкі цягнуць неміласэрна, ды толькі ж не наперад, а ўніз. Нарэшце яна стукае кулаком сабе па ілбе, робіць мне «стоп» рукою, я, канечне, імгненна бухаю сумкі на падлогу. Во рэакцыя! Яна адбягае кудысьці і вяртаецца з цялежкаю. А дзе ж ты раней была!? І Аня, і цялежка... Пагрузіў рэчы, умомант асвоіў тэхніку ваджэння... Жыццё наладжваецца!

Іду так сабе інтэлігентна, лёгка паспяваю за феяю сваёй. І разумею раптам, што потам абліваўся я не толькі ад грузу, а й ад сорама. Бо ад пачатку кінулася ў вочы, што ва ўсіх пасажыраў сумкі на колах. Адзін я цягнуся, як «дзядулька у Вільні». Прыходзіла яшчэ дома думка пра такую зручную «краўчучку», але ўважаў, што гэта — для нямоглых дзядоў ды бабуль, а я, хоць і дзядулька таксама, але ж яшчэ даволі спрытны. Спрытны, як жа. Каб не Аня, спрытаваў бы яшчэ нямаведама колькі... Але вось Аня сцішвае хаду, паказвае на «чфарту залю» наперадзе — туды мне, маўляў. І намерылася ўжо бегчы да сваіх спраў, але, глянуўшы на мой твар, убачыла там столькі, што кінулася да мяне, абняла, кранутая, мабыць, маёй бязмежна ўдзячнай пысай. Ціха я, абдымаючы яе, ціха шаптаў: «Дзенькую, цурко моя». Мала не плачам. Бач, свае, суседзі...

Але вось я каля патрэбнай стойкі. Выпісала мне шведачка нейкую паперчыну. Стаўлю сумку сінюю на кантроль. І пра мяне ж не забыліся. Здымаю з сябе куртку, пінжак, паясок са штаноў, гадзіннік, з кішэняў вымаю ўсё металічнае і ў скрынку адмыслова ўсю складваю, сам праходжу праз металадэтэктар. Усё гладка. Рэчы, што ў скрынцы, аглядвае й абмацвае служачы аэрапорта. Раптам лезе ў кішэню курткі, вымае плоскую 200-грамовую пляшачку каньяку, якую набыў яшчэ ў мінскім аэрапорце перад выхадам на пасадку ў самалёт; пытаецца ў мяне ўскінутымі брывамі: што гэта? Маўляў, чаму не ў сумцы, раз не адкаркаваная. Знізую плячыма. Кудысьці той скокнуў, вяртаецца, аддае, усміхаючыся. А я ўжо быў падумаў, што апошнюю, можа, хоча забраць (у сумцы ці ацалелі падобныя дзве, бо капала давжэнька). Во, радуюся, інтуіцыя: заплаціў даражэй, чым у горадзе, хоць і ўціснуць у сумку было ўжо немагчыма, дый, быццам, патрэбы асаблівай не было. Дзяўчына, што тады за касаю была, здалося, вельмі прыхільна паставілася да маёй пакупкі (хоць я адну толькі пляшачку тую і ўзяў). Чамусьці згадаў словы Гарбатага з фільма «Место встречи...»: «Жанчына... душою ўсё адчувае...». А пляшачкі тыя спатрэбіліся пасля...

Ну што ж, апрануўся я і пакаціў сваю цялежку да 58-га вакенца, у якім мусілі выдаць мне пасадачны квіток. Падрульваю, у вакенцы нікога. Гляну ў на гадзіннік — яшчэ ранавата. Але непрыкметна час набліжаецца да пасадачнага, а ніхто не прыходзіць. Поруч 56-е вакенца, я туды — тыцкаю ў квітку на час вылета, да якога ўсяго нічога, і на стойку, дзе — нікога. Жанчынка, помню, нешта загаварыла. Ведаць бы — што... Нярвова пахаджаю. Чакаю. Зусім часу не застаецца. Можа, якая памылка, і пасадка ў іншым месцы. А ўсё нікога. Што за халера? Ну як у нас. Я зноў да цёткі, трасу перад носам квіток, дзе 5 хвілін застаецца да вылета. Яна ўноў энергічна нешто ляпеча, разбіраю толькі слова «ван». Ага, думаю, праз адну хвілінку будзе. Але вось хвіліна, другая, трэ... Ды колькі можна!? Толькі хацеў было рынуцца ў атаку, як раптам у вочы зноў насценны гадзіннік бліснуў. Ён мне пападаўся і раней, але здавалася, што стаіць ці адстае. Я яшчэ тады падумаў: «Ну і Швецыя, гадзінніка людскага для аэрапорта не знайшлі, ліха іх матары». І тут мяне як кувалдаю па цемю: ды тут жа іншы часавы пояс! На гадзіну пазней ад нас шведы вочы прадзіраюць, заходней жа ад Мінска Стакгольм...

Упаў цяжар... Але ж абрыдла туды-сюды совацца. Пагутарыць

бы, можа, з кімсьці. На лаве двое: мужык і дзяўчына. Можа, спадарожнікі?.. У дзяўчыны больш просты, прыемны выгляд. Толькі хацеў падысці, як яна ўстала і павольна, спяшыць няма куды, пасунулася па даўгаватай зале. Падсеў да мужыка. Сяк-так пакалякалі. Ага, ён тутэйшы, сюды — на пабыўку з Нігерыі, дзе працуе па кантракце. Нямецкім валодае не лепей за мяне, кожнае слова вымучваем. Аж тут, нарэшце, і дзяўчына тая вярнулася. А ён ёй з палёгкаю — во, маўляў, твой зямеля. Гэта пра мяне, значыць. Я ўздымаю бровы... Расейская мова пасля пакутнай бязмоўіцы здалася мне такой салодкай... Жыве знаёміца ў Піцеры, у Візбю лётае раз у месяц да жаніха-шведа. Пазнаёміліся там падчас вучобы на менеджэрскіх курсах. А цяпер ні яна тут жыць не хоча, ні ён у Піцеры. Пакуль вось так бачацца, а там... Сумнавата.

Але гэта ж трэба: завуць яе Ася (!), як і ўнучачку маю маладзейшую, пяцігадовую. Яна-то ў нас Наста, але прыляпілася змалку: Ася ды Ася... Вось як! Можа, і ўнучка намагаецца стаць у прыгодзе?.. Крыху пагаварылі, а тут і пасадка. Адпаведныя квіткі выдала ўсё тая ж жанчынка з 56-га вакенца... Даляцелі хутка. Пытаецца Ася, ці сустракае мяне хто. Наўрад ці, кажу. Маіх папярэднікаў не сустракалі. А мяне, хваліцца, жаніх сустрэне. Ён з машынаю, дык калі што якое, і падкінем. Так і сталася. Жаніх прыгожы, мужны, статны. Пра гэта міжволі ціха выказаў Асі. Зачырванелася. Пазнаёміла. Андрас хутка зразумеў што да чаго, хапануў маю сумку, бы пёрка, і рашуча адтарабаніў у багажнік. У дарозе высветлілася, што ведае Ася пра наш Балтыйскі Цэнтр і нават крыху знаёмая з яго дырэктрысай Ленай Пастэрнак. Ну й цесны ж ты, свеце ясны!..

Дзверы ў двух карпусах былі замкнёныя, ніхто на званкі не выходзіў. Нарэшце, выскачыў нейкі энергічны хлапчына з бародкай і коскаю. Пазнаёміліся. Патрык, памочнік Лены. Яе не было на месцы. Ледзь утаропаў ён, хто я такі, а потым засвяціўся прыемнай такой усмешкай. Падзякаваў я Асі з Андрасам. Без іх хто ведае, як склалася б: шукай таксі, плаці, а як сказаць кіроўцу, куды мне, дый там... Ай, унучачка — такі (расці здаровенькая!) падмагла! Патрык адвёў мяне на другі паверх спальнага корпуса, пасяліў у 8-ы пакой «с видом на море». А насупраць акна, крыху лявей, кірха-сабор святой Марыі. Пра яго яшчэ Аксана Малішэўская гаварыла. Во, выходзіць, і сярэдняя ўнучачка, Марылька, будзе ўвесь час поруч, іншым разам зможа выручаць небараку дзеда... Ды чаму ж толькі ўнучка? У мяне ж яшчэ маці хрышчоная жывая, таксама Маша, якая хрысціла нас з братам ужо бальшаватымі ў снежні сорак першага, калі пайшлі чуткі, што нехрышчоных дзяцей немцы будуць расстрэльваць. Было ёй тады ўсяго шаснаццаць. Дарэчы, старыя людзі сцвярджаюць, што на тым свеце карміць з лыжачкі будзе не родная, а хрышчоная маці. Дык як жа б гэта Маша не адгукнулася? Да таго ж (уяўляеце?) прозвішча яе па мужу — Швед. Тут, без сумневу, можна чакаць вельмі сур'ёзнай падтрымкі...

Паказаў мне Патрык дзе, што, як — і знік. Агледзеў я больш уважліва свае апартаменты, адчыніў акно, паўглядаўся на храм, на раскіданыя па схілу старажытныя дамкі пад чырвонаю чарапіцаю. А за імі — мора!.. Мора да гарызонту... Маладосць мая флоцкая-хвацкая...

Ды тут жа сапраўдны рай!.. Як я сказаў? Рай? Вось-вось! Ну, мабыць, вы, шаноўныя, здагадаліся ўжо, што мова можа пайсці пра нейкую Раю. Не памыліліся! Нейкая Рая — гэта мая вечная спадарожніца, мая залатая спагадніца і памочніца — жонка.

Дык я зноўку пытаюся: як жа нам, мужыкам, без іх, без нашых анёлаў-ахоўнікаў, без нашых расцудоўнейшых жанчын, без іх няспыннай дапамогі і падтрымкі, пра якую іншым разам і не ведаем? Га?

**Кастрычнік 2010 г., Візбю, Швецыя**

# ВЕЖЫ ЎЗДОЎЖ МОРА

Сяргей АСТРАВЕЦ



## Дом пісьменнікаў

Калі ў Візбю ціха, восеньскае сонца, здаецца, наступіў перапынак паміж штормамі. Звычайна дом трасе суткамі. Пад маім вакном чатырма вяроўкамі прымацаваны сіні транспарант, які паведамляе: тут спыняюцца пісьменнікі. Яго ўвесь час тузае і пляскае па сцяне. Ці сцяг палошча наш літарацкі, ці ветразь, а мо адначасова — два ў адным.

Дом на пагорку сапраўды як карабель ва ўзнятым на дыбкі моры, шторм вось-вось сарве з якара, адарве ад берага, пачне кідаць хвалямі, зацягне ў мора — далей ад берага. Хвалі торгаюць, штурхаюць, сціскаюць у сваіх абдоймах, душаць, камячаць. Уначы пачынаюць гучаць сцены і столь, абуджаючы даўнія згадкі пра вясковую хату. Але зноўку думкі пра драўляны карабель, які рыпіць раматусам, але не наракае, бо гэта — яго жыццё.

## Авечкі і бараны

Авечкі, авечкі, бараны крутарогія. Яны паўсюль. Светлашэрыя стаяць у брамах вежаў, уздоўж тратуараў, цэлая чарада напаткалася перад рэзідэнцыяй мясцовага біскупа, на дзвярах якой мураваны герб.

Баран на каляровым сцягу места на флагштоках. Ускрылены баран вельмі сімпатычна асвойтаўся на экслібрысе — эмблеме Дома пісьменнікаў. Так-так, нагадаўшы ўсім вядомага Пегаса.

Авечкі выглядаюць не так кідка, як бараны, яны менш заўважныя: сціплыя галоўкі, апушчаныя долу. Ці варта казаць, што бараноў вы спаткаеце часцей на брукаваных вулічках?

Авечкі і бараны ў вітрынах у сценах Старога горада: каменныя, парцалянавыя, плюшавыя, вязаныя. У крамах, перад дзвярыма на вуліцы мноства рэчаў з авечай воўны.

І я бачыў іх саміх, бачыў жывцом! На жаль, мы не спыніліся, каб сфатаграфаваць: яны стаялі ўздоўж дарогі — белыя, шэрыя, чорныя і больш усё ж нагадвалі парцалянавыя ў адной вітрыне, уручную размаляваныя. Мы праязджалі міма, яны жавалі сваю восеньскую траву. Яны былі дома, калі не гаспадарамі, дык амаль боствам мясцовага значэння, вартавымі на вуліцах і пры брамах, фетышам, рэкламнай прынадай.

Радуюся, што я тут, думаю пра жыхароў, іхніх продкаў, якія стварылі горад, збудавалі вакол яго сцяну з высокімі вежамі; да мяне прыходзіць усведамленне, што авечка з бараном — не выпадковасць у яго сценах у тым сэнсе, што яны не спынілі выбар канчаткова на кімсьці адным з іх, нібыта не здолеўшы прыйсці да адзінай думкі. Бо яны — два бакі аднаго медаля. Авечка — руплівая, непераборлівая, памяркоўная, на іх, дбайных, трымаўся дабрабыт, становішча гандлёвага места на марскім раздарожжы. А бараны — што тут доўга меркаваць, калі яны стаяць у брамах вежаў — гэта ўпартыя абаронцы Візбю.

Такі анімалізм горада паўночнага, скандынаўскага, марскога. Так, для любога вострава авечкі — выйсце, можа нават паратунак, абы трава расла. Небарачкі — яны і ежа, і цяпло: малако, мяса, лой, сыр, воўна, а таксама швэдры, хусціны, шапкі, лямцавы абутак, коўдры, кажухі. Так, для любога вострава, а тут, на Готландзе, у Візбю яны ўвогуле паўсюль.

## Келіх чырвонага

Пада мною ў пакоі на першым паверсе грэк Тэа. Ён перакладае з нямецкай і ў яго жонка з Горадні. Там ён быў тройчы: раз летам і два — узімку, калі яму больш спадабалася — снег і ўсё з гэтым звязанае. Летам — горача. Так, цяжка дыхаць, бо вільготнасць. Нам гэта таксама занадта добра вядома.

Пахмурны дзень, але вакно ў Тэа расчыненае ўвесь час, і ў ім высокі вялікі келіх. Спачатку ён запоўнены напалову, потым было на дне, яшчэ пазней след чырвонага віна толькі ў сподзе ўгадваўся. Увесь час побач была відаць бутэлька чырвонага віна, пакуль не сцямнела.

Вакно глядзіць у вулічку, цераз якую турысты трапляюць звычайна да храма, на рынкавы пляц і далей — да мора. Яны толькі што прайшлі скрозь вежу з брамай, каб перад вакном Тэа збочыць. Усе, хто йдзе, не можа не ўбачыць келіх з бутэлькай — маленькая выстава Тэа.

Ці варта дадаваць, што гэта амаль поўха мясцовым звычаям? Не, якраз выстаўляць на вокнах — на агляд — моцная традыцыя, амаль няма вакна, якое б пуставала. Але бутэлек, віна, вы не ўбачыце. Што праўда, зрэдку трапляюцца келіхі, але ў іх — сухая трава, букет — не букет.

Цяпер у вакне Тэа гарыць лямпачка, ён працуе. Калі іду міма, то паказваю пецярню — вітаюся, ён адказвае. Ён відавочна задаволены быць на сваім цяперашнім месцы... Кучаравая чорная галава, круглыя акуляры. Часам з завулка выязджаюць машыны і асвятляюць яго фарамі.

## Wine House

У Горадні з Візбю існуе агульнае: у іх спыняліся каралі. «Вінны дом» і каралеўскі «Дом са шкуры цяляці» у Візбю — дзве назвы адной камяніцы. Спачатку пра віно. Гэта Балтыка, яно каштавала дорага, і можна было зарабіць. З караблёў яго ў бочках перавозілі ў вінны склеп, дзе дэгуставалі. Белыя, часам кіславатыя, дастаўлялі з нямецкіх земляў, салодкія — з грэцкіх, пікантныя — з Гішпаніі і Партугаліі, нарэшце з Францыі — чырвоныя, якія каштавалі найдаражэй. Што да мяне, я сабе купіў апошнім саламянага колеру кіпрскае. На востраве сярод халоднага мора сапраўды мацней адчуваеш яго каштоўнасць.

З мясцовай легенды вынікае, што дом гэты збудаваў кароль Біргер Магнусан. Ён папрасіў у гарадской рады сціплы кавалак зямлі, каб паменей плаціць, зямля за мурамі каштавала. Такога, які пакрые цялячая шкура, будзе досыць, — паабяцаў кароль. Але загадаў нарабіць шнуроў са шкуры, звязаць і акрэсліць кола — пляц атрымаўся як мае быць. Але ў Візбю сёння сумняваюцца: ці не жарт гэта сярэднявечны?



Што да караля, ён сапраўды існаваў і спыняўся ў «Вінным доме», але тут версіі разыходзяцца: ці ён напаў на востраў у 1313 годзе, ці папросту хаваўся ў Візбю? Вядома аднак, што ён сапраўды ўцёк на Готланд, але потым паплыў у Данію — у эміграцыю. І такое здаралася з каралямі.

## Кнігі

Вокны горада за мурамі — музейныя вітрыны, кожны сам вырашае — што прапанаваць на агляд турыстам, мінакам. Але зазіраць у вокны ўсё ж няёмка, хіба што бакавым зрокам. Мінаеш чорны стары дом: квадратныя вокны невялікія з аканіцамі на вышыні, над галавой у цябе. У левым гарыць святло — на сценах скрыні драўляныя, выглядаюць як старыя. Паварочваеш галаву: у правым стэлажы з кнігамі, драўляныя, дрэва цёплага колеру, сярэдне-карычневае. Утульна так, вулічка вузкая-вузкая, адразу трапляеш на рынкавы пляц.

Уздоўж абрыву сцяжына з дамамі, якія глядзяць на чарапічныя дахі ўнізе, разбураныя касцельныя сцены, а далей мора-мора! У адным невялікім дамку справа пакой: карціны на сцяне, падрамнікі, стол, злева куханка, паміж імі нешырокі стэлаж, у ім кнігі. Адчуваецца, што гаспадар прыязджае толькі часам, можа, сталічны мастак.

Блізка ад батанічнага саду на рагу з вулічкай караля Олафа ў акне кнігі, кнігі, уся сцяна, цэлая бібліятэка. Але больш за ўсё іх у Доме пісьменнікаў і перакладчыкаў.

## Мора

Як гэта дзіўна ў такім месцы, калі няма ветру. Мора амаль лагоднае зусім, толькі хваля нямоцная набягае, як заўжды рытмічна, на камяні ля набярэжнай.

Яно ўвесь час мяняецца, кожны раз спыняешся ля вакна, ацэньваючы колер. Калі былі запар цёплыя дні, яно выглядала менш выразным, і, што цікава, не праглядаўся асабліва гарызонт, ён не быў акрэслены, мора злівалася з небам. Цяпер сонечны, але вятрысты дзень, мора густа-сіняе, такога даўно не бачыў. А то, здараецца — як расплаўленае волава.

Нярэдка мора бярэцца плямамі, выцягнутымі, цямнейшымі, святлейшымі, прычым зусім не абавязкова можна падумаць на цені ад хмараў. Розніца ў тэмпературы, адліў-прыліў? Не ведаю. Твар таксама розным бывае — ад марозу, хвосткага ветру, ад гарачыні, ад алкаголю.

Ты бачыш, як плыве па моры доўгі белы карабель — на самай мяжы далягляду. Першая думка — чалавеку заўсёды на борце хочацца хутчэй да берага, асабліва, як шторм. Другая: а калі на беразе чакае штурм, высокія сцены, латнікі з запаленымі кнатамі пры гарматах? Лепей сядзець на бочках з віном, табе ўсе будуць радыя.

Рытуал: ацаніць з вакна, калі мора неспакойнае, — што ў нас сёння? — ці бягуць да берага белыя баранчыкі, як далёка ўзнікаюць, ці частыя, якія па велічыні? Пайшоў зфільмаваў хвалі, атрымалася нечакана: мора рыхтык чорнае.

**2010**

УРОК

# ЛАРЫСА ГЕНІЮШ

Уладзімір АРЛОЎ



Ларыса Геніюш з сынам Юркам. Прага, 1941 г.

## Зачараваная Радзімай

Ларыса прыйшла на свет 9 жніўня 1910 года на маляўнічым хутары Жлобаўцы пад Ваўкавыскам. Сям'я ейных бацькоў Антона і Аляксандры Міклашэвічаў была вялікая, працавітая і заможная.

Калі пачалася Першая сусветная вайна, тату забралі на фронт, а сям'я апынулася ў бежанстве ў Расіі. Вярнуўшыся адтуль, Міклашэвічы ўбачылі, што родны хутар разрабаваны.

Заходнебеларускія землі трапілі тады пад уладу Польшчы. Ларыса хацела вучыцца на роднай мове, але мусіла хадзіць у польскую школу, адчыненую ў беларускай вёсцы Гудзевічы. У Ваўкавыскай гімназіі таксама вучылі толькі па-польску. Юных беларусаў і беларусак збіраліся перарабіць на палякаў.

У гімназічныя гады Ларыса захапілася сусветнай літаратурай. Найбольш дзяўчыне падабаліся творы ангельскага пісьменніка Уільяма Шэкспіра. Калі яна ехала дадому на вакацыі, у вазку сярод падарункаў бацькам і братам абавязкова ляжала і некалькі кніжак славутага ангельца.

## Муж Янка

У 1935 годзе Ларыса сустрэла сямейнае шчасце.

Ейны муж Янка з прыгожым прозвішчам Геніюш паходзіў з беларускай Беласточчыны. У тыя гады ўрад незалежнай Чэхаславацкай дзяржавы запрашаў на навучанне заходнебеларускую моладзь, якой цяжка было здабыць адукацыю ў Польшчы. Геніюш вучыўся на медычным факультэце знакамітага Карлавага ўніверсітэта ў Празе. Паступіць туды хлопцу дапамог палітык і вучоны Браніслаў Тарашкевіч, якога ведала ўся Заходняя Беларусь.

Янка быў не проста мужам, але і аднадумцам Ларысы. Ён першы даў нарачонай беларускія кнігі, чытаў ёй вершы Янкі Купалы, знаёміў з нашай гісторыяй. Гэта рабіла Ларысіну адданасць Беларусі яшчэ мацнейшай.

Чакаючы дзіця, Ларыса жыла разам з Янкавымі бацькамі ў мястэчку Зэльва. Аднойчы польская паліцыя жорстка збіла там беларускага хлопца-патрыёта. Праз некалькі дзён ён памёр. Геніюш прыйшла на пахаванне юнака і гнеўна сказала паліцыянтам: «Вы забілі беларуса, але я хутка нараджу новага!»

Свайго сына Геніюшы ахрысцілі Юркам. Ларыса пяшчотна спявала над калыскаю:

*Спі, мой сыночку,*
*Спі, галубочку…*

У ейнай душы нараджаліся першыя вершы.

Тым часам Янка Геніюш закончыў навучанне ў Празе. Атрымаць працу ад палякаў доктарубеларусу было вельмі складана, і маладая сям'я пастанавіла ехаць у чэшскую сталіцу.

## Залатая Прага

Прыгажуня-Прага прыняла Геніюшаў гасцінна. Адрозна ад Польшчы да беларусаў там ставіліся як да роўных сабе братоў-славянаў. Ніхто не смяяўся і не здзекаваўся, калі чуў беларускае слова. Але, каб лепей даваць сабе рады, Ларыса хутка вывучыла чэшскую мову. Ёй дапамагаў муж Янка, які нястомна клапаціўся пра сям'ю. Дзякуючы таму, што малады доктар меў шмат пацыентаў, Геніюшы пераехалі ў добрую кватэру.

Будучая паэтка закахалася ў Прагу, якую за яе веліч і багацце здаўна называлі Залатой. Геніюшы ведалі, што некалі на гэтых вуліцах, па дзівосным Карлавым мосце цераз Влтаву, хадзіў наш першадрукар Францішак Скарына. Ларыса паэтычна называла сябе ягонай унучкай.

У 1920–1930-я гады ў Празе жылі кіраўнікі ўрада БНР Пётра Крэчэўскі і Васіль Захарка. Спадар Васіль напачатку і прытуліў у сябе сям'ю Геніюшаў. Пазней ён даверыў Ларысе захаванне архіва Беларускай Народнай Рэспублікі.

У Празе закрасаваў паэтычны талент Ларысы. Праўда, абставіны для гэтага былі зусім не спрыяльныя. Спакойнае жыццё Геніюшаў доўжылася ўсяго паўтара года. Увесну 1939-га Чэхію занялі нямецкія фашысты. Гітлер і Сталін ужо рыхтаваліся да сусветнай вайны.

Праз некалькі месяцаў Нямеччына напала на Польшчу, а Чырвоная армія пачала «вызваленчы паход» у Заходнюю Беларусь…

## Ад родных ніў

У акупаванай гітлераўцамі Празе ў 1942 годзе выйшла першая кніга вершаў Ларысы Геніюш «Ад родных ніў». І ў самой яе назве, і ў кожным творы гучалі любоў і туга па Беларусі, якая тады пакутавала ад фашысцкіх нелюдзяў.

Паэтка пісала пра нязломны беларускі дух. Яна згадвала славутых продкаў-крывічоў і князя Усяслава Чарадзея. Сумавала па дарагіх людзях і мясцінах.

*Мой родны кут,*
*мой ціхі дом,*
*дзе ў голле дрэў,*
*аб сцены ніў,*
*пад сумны спеў*
*буйным крылом*
*паўночны вецер*
*звонка біў…*

Вершы беларускай паэткі прачыталі не толькі захопленыя яе магутным талентам суайчыннікі, але і акупанты. Ларысу Геніюш пачалі выклікаць на допыты. Нацыстаў абурыла, што ў кнізе няма ніводнага слова пра іхняга правадыра Гітлера. Паэтка спакойна, але з прыхаванай насмешкаю адказала, што ейны талент занадта малы, каб услаўляць такіх асобаў. Мужнасць і падтрымка сяброў дапамаглі Ларысе застацца на волі.

Неўзабаве ёй удалося пераведаць Бацькаўшчыну. Вандроўка атрымалася цяжкой і горкай. Перад вайной бацьку забілі ў бальшавіцкім астрозе. Маці загінула ў казахстанскай высылцы. Людзі з НКВД у 1939 годзе расстралялі на вачах зэльвенскіх вернікаў старэнькага святара айца Давыда, які некалі хрысціў малога Юрку Геніюша.

А потым на змену адным «вызваліцелям» прыйшлі іншыя — са свастыкамі замест зорачак.

## Чайка за кратамі

Першыя вершы Ларыса Геніюш падпісвала псеўданімам «Чайка». Яна і потым часта параўноўвала сябе з гэтай свабодалюбівай птушкаю. Але Ларысе-Чайцы было наканавана надоўга апынуцца ў няволі.

Пасля вайны на Геніюшаў пачалі паляваць эмгэбісты. Спярша спрабавалі завабіць у СССР абяцанкамі спакойнага і заможнага жыцця, якое быццам бы маюць беларускія пісьменнікі. Калі гэта не атрымалася, Ларысу і Янку арыштавалі і вывезлі ў СССР, нягледзячы на тое, што яны былі чэхаславацкімі грамадзянамі.

У Менску паэтку дапытваў міністр дзяржаўнай бяспекі БССР. Ларыса запатрабавала, каб з ёю гаварылі па-беларуску. У адказ міністр-грузін, які не ведаў нашае мовы, прыгразіў, што сам будзе катаваць арыштантку.

Узімку 1949 года Ларыса і Янка пачулі прысуд: кожнаму па 25 гадоў лагераў. Уся віна Геніюшаў была ў тым, што яны хацелі для Беларусі свабоды і незалежнасці. У хвіліны роспачы суцяшала толькі тое, што ў рукі сталінскіх катаў не трапіў сынок Юрка. Яго ўдалося пераправіць да сваякоў у Польшчу.

Растанне было горам, але разам з тым матчына сэрца цешылася, што сын на волі. Пазней, у сваіх успамінах Ларыса Геніюш пісала: «У адным кутку нашага лагера быў другі лагер, таксама аплецены калючым дротам і з узброенаю вартаю. Там жылі дзеці. Каля дзіцячай зоны стаяў вечны плач, а дзеці, ціначкі бледныя, запалоханыя, рваліся да мамаў. Падысці бліжэй было нельга. Раз'юшаныя канваіры стралялі без папярэджання. Загіне матуля — і асірацее дзіця…».

І ў сталінскіх турмах, і ў лагеры на далёкай Поўначы Ларыса заўсёды гуртавала каля сябе беларусаў. Яна давала прыклад духоўнай сілы і веры ў перамогу справядлівасці. Сябры па няшчасці з любоўю клікалі паэтку — Маці.

У нялюдскіх умовах, калі штодня побач хадзіла смерць, Ларыса Геніюш працягвала пісаць вершы. Вязні завучвалі іх на памяць, перапісвалі на тонкай папяроснай паперы. Каб перадаваць вершы з жаночай часткі лагера ў мужчынскую, выкарыстоўвалі розныя вынаходкі. Адной з найбольш надзейных быў кавалак вугалю з «сакрэтам».

Уявіце, як у выстылым цёмным бараку пры маленькім дрогкім агеньчыку каганца хтосьці разломваў вугальную схованку і даставаў складзеную ў шмат столак паперку. Зняволеныя збіраліся вакол і ў халодным прыцемку пачыналі гучаць паэтычныя радкі…

Вершы веялі ветрыкам далёкай радзімы, давалі глыток свежага паветра, вярталі надзею. Нездарма вязні называлі іх «глюкозай».

*Адзінай мэты не зракуся,*
*І сэрца мне не задрыжыць:*
*як жыць — дык жыць для Беларусі.*
*А без яе — зусім не жыць.*

## Дамок у Зэльве

Пасля смерці Сталіна Геніюшы вярнуліся на Бацькаўшчыну і пасяліліся ў Зэльве. Іхні дамок, што перайшоў у спадчыну ад бацькоў, стаяў насупраць царквы. Спадарыня Ларыса малілася там за сваіх блізкіх і за Беларусь. Суседзі і большасць зэльвянаў паважалі сям'ю былых лагернікаў. А вось улада не пакідала іх у спакоі. За домам Геніюшаў увесь час сачылі. Спадару Янку не давалі працы, адпаведнай яго выдатнай адукацыі. Сям'і не дазвалялі пераведваць сына Юрку, які жыў за недалёкай польскай мяжой у Беластоку. Пасылка з лекамі для хворага сэрца паэткі магла ісці з Полацка да Зэльвы цэлы месяц і добра яшчэ, калі не прыходзіла пустая.

Мясцовыя кіраўнікі касавурыліся на Ларысу Антонаўну за тое, што яна дапамагала пісаць зэльвянам скаргі на розныя несправядлівасці. Яшчэ больш уладу злавала, што паэтка з усімі гаворыць на роднай мове.

У Зэльве дагэтуль памятаюць, як спадарыня Ларыса прыйшла ў клуб, дзе выступаў беларускі хор з сталічнага Менска. Паэтка прынесла на канцэрт вялікі букет півоняў. Аднак букет так і завяў непадараваны, бо ніхто з артыстаў не мог звязаць па-беларуску і дзясятка словаў.

Геніюш не стамлялася казаць, што без нашай мовы і культуры знікне і сама Беларусь. Лісты пра гэта яна пасылала тагачаснаму кіраўніку БССР Пятру Машэраву, але ў адказ атрымлівала пустыя адпіскі. Праз знаёмых ёй перадалі, што кіраўніцтва рэспублікі занятае больш важнымі клопатамі, чым нейкая там мова.

Імя паэткі Ларысы Геніюш было непажадана згадваць у газетах. Усіх, хто бываў у яе дома, бралі на заметку.

## На гасціны да Бабулі

Але насуперак усім перашкодам пра Ларысу Геніюш ведалі паўсюль, дзе жылі беларусы.

Кожны дзень яна атрымлівала лісты з розных гарадоў і краінаў. Паэтцы дзякавалі за выдатныя творы, за вернасць БНР. З усёй Беларусі да яе прыязджалі пісьменнікі, мастакі, вучоныя, былыя таварышы па няволі. За гасцінным сталом спадарыні Ларысы нярaз сядзелі нашыя выдатныя пісьменнікі Максім Танк, Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч, Данута Бічэль-Загнетава, мастакі Яўген Кулік і Аляксей Марачкін ды многія іншыя.

Не баючыся нагляду кагэбістаў, у Зэльву амаль тры дзесяцігоддзі па парады і духоўную падтрымку прыязджала беларуская моладзь. Паміж сабой юнакі і дзяўчаты за дабрыню і мудрасць менавалі паэтку Бабуляй.

Той, хто трапляў у Зэльву першы раз, пазнаваў дом Геніюшаў па вялікім і прыгожым кветніку. Спадарыня Ларыса вельмі любіла валошкі і белыя лілеі, а таксама ўсе белыя і чырвоныя кветкі. Перад домам Геніюшаў улетку і ўвосень можна было ўбачыць жывы бел-чырвона-белы сцяг.

На гасцінах у Бабулі маладыя беларусы часта ўпершыню чулі забароненыя тады імёны «айцоў» БНР ды іхніх наступнікаў братоў Луцкевічаў, Кастуся Езавітава, Васіля Захаркі. Ад Бабулі прывозілі і таемна перадрукоўвалі для сябе і сяброў кнігі, якія яшчэ ў 1930-я гады бальшавікі спалілі альбо адправілі ў сховішчы-сутарэнні. Гэта былі недазволеныя творы Янкі Купалы, расейска-беларускі слоўнік Вацлава Ластоўскага, заходнебеларускія часопісы…

Але самымі хвалюючымі хвілінамі былі тыя, калі паэтка нягучна, але натхнёна чытала новыя творы. Прытуліўшыся да ног гасцей, уважліва слухаў і ласкавы сабачка Жук. Пасля смерці Янкі Геніюша ён стаў ахоўнікам і найлепшым сябрам гаспадыні.

У Зэльве Ларыса Антонаўна напісала паэмы «Даўніна» і «Куфар», шмат вершаў, дзве дзіцячыя кніжкі: «Казкі для Міхаські» і «Добрай раніцы, Алесь!»

Гісторык Міхась Чарняўскі аднойчы вяртаўся з гасцей ад Бабулі з большымі, чым звычайна, перасцярогамі. Ён вёз у Менск надзейна схаваны вялікі рукапіс успамінаў Ларысы Геніюш. Ужо пасля смерці паэткі яны сталіся кнігаю пад назваю «Споведзь». Некаторыя называюць «Споведзь» падручнікам мужнасці і патрыятызму.

## Дарагое імя

Зямная дарога паэткі завяршылася ўвесну 1983 года. Яе сябры з'ехаліся на пахаванне з усёй Беларусі. Каля іх бегаў пасівелы ад гора Жук.

За людзьмі сачылі, іх запалохвалі. Але кагэбісты пралічыліся. Загады везці труну і вялікі драўляны крыж на машыне былі марныя. Увесь няблізкі шлях да могілак спадарыню Ларысу неслі на руках. Следам ішла ўся Зэльва.

Праз два гады пры нявысветленых абставінах загінуў сын Ларысы Антонаўны, таленавіты паэт Юрка Геніюш…

Сёння імя спадарыні Ларысы дарагое кожнаму сапраўднаму беларусу. Выходзяць яе кнігі, пра жыццё і творчасць паэткі знятыя фільмы. Шмат якія яе вершы сталі песнямі. Дзякуючы паэту Міхасю Скоблу выйшлі вялікія зборнікі лістоў Ларысы Геніюш і ўспамінаў пра яе.

Кожны год на пачатку жніўня ў Зэльву прыязджае шмат людзей. Госці прыносяць кветкі да помніка паэтцы. Ён стаіць каля царквы, куды кожны дзень прыходзіла Ларыса Антонаўна. Калі-небудзь у доме Геніюшаў адчыніцца музей нашай выдатнай суайчынніцы, а пры ім будуць цвісці яе ўлюбёныя бел-чырвона-белыя кветкі.

УРОК

# УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

Уладзімір АРЛОЎ

## Шасцігадовы паэт

Прыгожы і ўтульны беларускі горад Ворша стаіць на берагах Дняпра ўжо амаль 950 гадоў. Ворша многа пабачыла на сваім вяку, дала Беларусі нямала вядомых людзей. Але найбольш ганарацца аршанцы тым, што тут 26 лістапада 1930 года з'явіўся на свет Уладзімір Караткевіч.

Бацькі хлопчыка, Надзея і Сямён, былі добра адукаванымі людзьмі і паходзілі з інтэлігенцкіх сем'яў. Маці працавала настаўніцай, а потым займалася выхаваннем дзяцей.

Валодзя з маленства вылучаўся сярод аднагодкаў сваімі талентамі. Чытаць ён навучыўся ў тры з паловаю гады, а ў шэсць пачаў складаць вершы. Добра маляваў і паспяхова займаўся ў музычнай школе. Меў здольнасці спевака і актора.

Хлопчык вельмі любіў дзядулю Васіля Юльянавіча. Той ведаў шмат легендаў і паданняў. Ад яго будучы пісьменнік пачуў пра паўстанцаў Каліноўскага, сярод якіх ваявалі і продкі Караткевіча. Адзін з іх, Тамаш Грыневіч, камандаваў паўстанцкім аддзелам на Магілеўшчыне і быў расстраляны царскімі карнікамі ў Рагачове. Гэтае сямейнае паданне надта ўразіла Валодзю і потым натхніла яго на выдатныя творы.

У школе, дзе ён вучыўся, выпускаўся рукапісны часопіс «Званочак». Там з'явіліся першыя вершы Караткевіча і ягоная прыгодніцкая аповесць «Загадка Неферціці».

## Юначыя мары

Валодзя рана пасталеў. Яму ішоў толькі адзінаццаты год, калі пачалася вайна з фашыстамі. Яна заспела хлопчыка на гасцінах у Маскве, дзе вучылася старэйшая сястра Наталля. Доўгія месяцы ён не ведаў, што здарылася з бацькамі. Юнага беларуса адправілі ў школу-інтэрнат. Некалькі разоў ён спрабаваў уцячы адтуль, каб біць гітлераўцаў на фронце. Там у 1941 годзе загінуў старэйшы Валодзеў брат Валера.

Сям'я аб'ядналася толькі ў 1943 годзе ў далёкім Арэнбурзе. Праз год Караткевічы вярнуліся ў вызваленую ад захопнікаў Воршу, і Валодзя пайшоў у адзіную тады ў горадзе беларускую школу.

Студэнцкія гады будучага пісьменніка прайшлі ў сталіцы Украіны. Уладзімір вучыўся на філалагічным факультэце Кіеўскага ўніверсітэта. Ён пісаў тады вершы і апавяданні і па-ўкраінску, і па-расійску, але адчуваў, што найбольш цікавыя творы нараджаюцца на роднай мове.

Універсітэцкія таварышы любілі юнака за дасведчаннасць, сумленнасць і смеласць. У дзень пахавання Сталіна Караткевіч наладзіў у студэнцкім інтэрнаце сяброўскую застоліцу, а калі начальства ўзялося шукаць вінаватых, узяў усю адказнасць за гэтае «злачынства» на сябе…

## Кніга за кнігай

Аднойчы Уладзімір паслаў вершы сябру. Той занёс іх у рэдакцыю часопіса «Полымя». Неўзабаве там з'явіўся верш маладога паэта «Машэка», прысвечаны асілку з беларускіх народных паданняў.



Уладзімір Караткевіч, 1961 г.

У 1958 годзе выйшла першая кніга паэзіі Уладзіміра Караткевіча «Матчына душа». У тым самым годзе пісьменнік напісаў адзін з самых вядомых сваіх твораў — аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха».

Аповесць «Цыганскі кароль» была пра беларускіх цыганоў, якімі кіраваў у мястэчку Мір прызначаны князем Радзівілам кароль — шляхціч-ліцвін.

Падзеі XVI стагоддзя ажылі ў рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Караткевіч расказаў аб простым чалавеку, які воляю лёсу быў названы Хрыстом, пачаў рабіць «цуды», а потым узначаліў паўстанцаў.

Кніга «Зямля пад белымі крыламі» распавядала пра дзесяць стагоддзяў нашай гісторыі, пачынаючы ад часоў Рагвалода. Гэты твор называлі энцыклапедыяй Беларусі…

## «Каласы пад сярпом тваім»

Галоўнай кнігаю Уладзіміра Караткевіча стаў раман «Каласы пад сярпом тваім». Пісьменнік меў даўнюю задуму — напісаць вялікі твор пра вызвольнае паўстанне Кастуся Каліноўскага.

Тысячы беларускіх хлапчукоў і юнакоў, чытаючы раман, хацелі быць падобнымі да Алеся Загорскага. Алесь быў нашчадкам багатага княжскага роду, але бацькі аддалі яго на выхаванне ў сялянскую сям'ю. Вярнуўшыся з вясковай хаты ў палац, ён застаўся арыстакратам, аднак назаўсёды захаваў любоў і павагу да простых людзей.

Разам з сябрамі Алесь трапляў у розныя прыгоды і выпрабаванні. Аднойчы юны Загорскі пазнаёміўся з Кастусём Каліноўскім. Хлопцы чыталі кнігі, лавілі ў Дняпры ліноў і шчупакоў, пачыналі захапляцца дзяўчатамі, разважалі пра гісторыю Літвы-Беларусі… Сталеючы, яны ўжо марылі пра вызваленне Беларусі ад расійскага панавання і гатовыя былі аддаць дзеля гэтага сваё маладое жыццё.

На многіх старонках «Каласоў…» з чытачамі сустракаецца Алесеў дзед, стары князь Даніла Вежа-Загорскі. Ён надзелены шмат якімі рысамі Васіля Юльянавіча — дзеда самога пісьменніка...

## Праз церні да зорак

У старажытныя часы казалі, што да зорак чалавек уздымаецца праз церні. Гэта значыць, што на шляху да прызнання і славы — шмат цяжкасцяў і перашкодаў.

Шлях Уладзіміра Караткевіча таксама не быў лёгкім і бясхмарным.

У маладосці ён з болем чытаў артыкулы і лісты ў аршанскай газеце «Ленінскі прызыў». Мясцовыя начальнікі ды падвучаныя імі «чытачы» абвінавацілі паэта, што ён ідзе не ў нагу з жыццём. Караткевіча заклікалі пісаць не пра далёкую гісторыю, а пра поспехі савецкіх людзей у будаўніцтве «светлай будучыні».

Нялёгка складаўся і лёс рамана «Каласы пад сярпом тваім». Непрыхільныя водгукі на яго напісалі нават некаторыя калегі-літаратары. Нехта сапраўды не разумеў пісьменніка. А нехта проста зайздросціў яму, як ніздары заўсёды зайздросцяць вялікаму і светламу таленту. «Не параўноўвайце жывое дрэва з тэлеграфным слупом!» — абурана сказаў пісьменнік такім «крытыкам». Але Караткевіча падтрымалі лепшыя нашыя творцы і вучоныя: Алесь Адамовіч, Васіль Быкаў, Янка Брыль, Ніл Гілевіч, Адам Мальдзіс.

Асобнай кнігаю «Каласы..» выйшлі толькі праз некалькі гадоў. А вось раману «Нельга забыць» пашанцавала значна менш. Ужо амаль гатовую кнігу ўлады забаранілі друкаваць, і яна сустрэлася з чытачамі толькі праз два дзесяцігоддзі. Некаторыя творы Караткевіча ў перакладах на замежныя мовы выходзілі раней, чым па-беларуску.

Але Караткевіч быў цвёрдым чалавекам і не саступаў з абранай пуцявіны. У адным з лістоў ён пісаў: «Я мог бы з куды большым поспехам пісаць па-расійску, або, падвучыўшыся трошкі, папольску. Меў бы стотысячныя тыражы, дачу, прэміі. Я свядома пайшоў на больш цяжкі шлях… Нават проста дзеля таго, каб быць беларускім пісьменнікам, патрэбна мужнасць».

Нязмерна важнейшымі за любыя прэміі і ордэны для Караткевіча была любоў чытачоў.

Ягоныя творы чыталі, здавалася, усе: не толькі вучні і студэнты, выкладчыкі або навукоўцы, але і таксісты, лекары, рабочыя, вайскоўцы. Да яго падыходзілі на вуліцы, каб узяць аўтограф. Новую кнігу маглі за лічаныя дні разабраць ва ўсіх менскіх кнігарнях. Тэлегледачы чакалі праграму «Спадчына», дзе Караткевіч расказваў пра лёс старажытных беларускіх гарадоў і помнікаў.

Па творах Караткевіча праводзілася шмат чытацкіх канферэнцыяў. На адной з іх, прысвечанай «Каласам пад сярпом тваім», пісьменнік пазнаёміўся у Берасці з сваёй будучай жонкай Валянцінай…

У хвіліны адпачынку Уладзімір Сямёнавіч любіў глядзець мультфільмы. Ведаў шмат даўніх сакрэтаў прыгатавання розных страваў і напояў. Госці вельмі хвалілі каву, якую Караткевіч варыў паводле рэцэпта, які нікому не раскрываў.

Ён быў таленавітым у самых розных справах. На пытанне, хто ён, Уладзімір Сямёнавіч адказваў так: «Празаік, паэт, драматург, перакладчык, сцэнарыст, настаўнік, мастак, паляўнічы, вандроўнік, рыбак…».

## Ён вяртаў нам Радзіму

Пра Караткевіча кажуць, што ён вярнуў беларусам забытую не па іхняй віне мінуўшчыну. Даследчыкі пісалі, што ў 1960–1970-я гады пісьменнік зрабіў для гэтага больш за цэлы Інстытут гісторыі Акадэміі навук.

Але кнігі Караткевіча вярталі нам не толькі гісторыю. Яны вярталі Радзіму. Дзякуючы пісьменніку сотні тысяч нашых суайчыннікаў зразумелі, што іх радзіма — не СССР, а Беларусь, а яны — не савецкія людзі, а беларусы.

Пра родную краіну паэт надзвычай пранікнёна і ўзнёсла сказаў у вершы «Беларуская песня»:

*Дзе мой край? Там, дзе вечную*
*песню пяе Белавежа,*
*Там, дзе Нёман на захадзе*
*помніць варожую кроў,*
*Дзе на ўзвышшах Наваградскіх*
*дрэмлюць суровыя вежы*
*І вішнёвыя хаты глядзяцца*
*ў шырокі Дняпро.*

*Ты ляжыш там, дзе сіняя*
*Прыпяць ласкава віецца,*
*Дзе Сафія плыве над Дзвіною,*
*нібы карабель…*
*Там, дзе сэрца маё з першым*
*крокам, як молат заб'ецца,*
*Калі б нават сляпым і глухім*
*я прыйшоў да цябе.*
*Там звіняць неўміручыя песні*
*на поўных грудзі,*
*Там спрадвеку гучыць мая мова,*
*булатны клінок.*
*Тая гордая мова, якую й тады*
*не забудзем,*
*Калі сонца з зямлёю*
*ў апошні заглыбіцца змрок.*
*Ты — наш край. Ты — чырвоная*
*груша над дзедаўскім домам,*
*Лістападаўскіх знічак густых*
*фасфарычная рацъ,*
*Ты — наш сцяг, што нікому,*
*нікому на свеце, нікому*
*Не дамо абсмяяць, апаганіць,*
*забыць ці мячом зваяваць…*

## На гасціны да Майстра

У ліпені 1984 года Уладзімір Сямёнавіч выправіўся з сябрамі ў вандроўку па Беларусі. У Пінску пагрузілі на плот харчы, вуды ды і рушылі ўніз па рацэ. Падарожнікі планавалі даплысці да Дняпра, а потым дабрацца па ім да Воршы. Сядзелі вечарам каля вогнішчаў, гутарылі з мясцовымі рыбакамі, паромшчыкамі, матросамі-рачнікамі. Нататнікі Караткевіча запаўняліся запісамі для новай кнігі пра Беларусь.

Аднак таму падарожжу наканавана было стаць у жыцці пісьменніка апошнім…

Сталася так, што неўзабаве пасля сыходу Караткевіча ў Воршы адбывалася нарада маладых пісьменнікаў. Яны прапанавалі назваць імем Караткевіча родную вуліцу пісьменніка. Нейкі тамтэйшы чыноўнік сказаў, што гэтага ніколі не будзе, бо вуліца мае імя савецкіх касманаўтаў. Нехта абурана запытаўся: «Няўжо ўсе тыя касманаўты нарадзіліся ці жылі ў Воршы?». «Яны над Воршай праляталі»,— адрэзаў чыноўнік і ўзяўся тлумачыць, у чым Караткевіч вінаваты перад савецкай уладай...

Вуліца, дзе захаваўся родны дом самага славутага з сыноў Воршы, неўзабаве атрымала ягонае імя. Праз некалькі гадоў у парку над Дняпром урачыста адчынілі помнік пісьменніку, а потым непадалёку з'явіўся і музей.

Незвычайна тое, што музей пісьменніка знаходзіцца ў будынку былой радзільні, дзе Уладзімір Сямёнавіч некалі ўпершыню падаў свой голас. А яшчэ ў Воршы вам могуць расказаць, як зусім малады Караткевіч аднаго разу хаваўся разам з каханай на ганку гэтага дома ад залевы і падзяліўся мараю стаць пісьменнікам.

Сваякі пісьменніка беражліва захоўваюць і ягоны кабінет у менскай кватэры. Са сцenaў глядзяць кнігі і партрэт Кастуся Каліноўскага. Здаецца, вось зараз Уладзімір Сямёнавіч у белай кашулі зойдзе ў пакой і ўладкуецца за пісьмовым сталом.

Нехк адзін з замежных гасцей-вучоных на юбілеі пісьменніка сказаў, што каб лёс не паслаў беларусам Караткевіча, на свеце магло б не быць незалежнай Беларусі. З гэтымі словамі можна і паспрачацца, але несумненна тое, што чытачы Уладзіміра Караткевіча былі ў першых шэрагах змагароў за нашую незалежнасць.

САЮЗ

# ЗАЯВА

## РАДЫ ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ «САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ»

Рэспубліка Беларусь апынулася перад пагрозай духоўнага крызісу, звязанага з ізаляцыяй і знікненнем мовы тытульнай нацыі. Апошні рэспубліканскі перапіс насельніцтва засведчыў істотнае скарачэнне прыхільнікаў беларускай мовы. За дзесяць гадоў колькасць тых, хто лічыць яе роднай, скарацілася на 20,5 % і склала 53,2 % усіх грамадзян Беларусі. І толькі 23 % беларусаў валодаюць роднай мовай — а яшчэ дзесяць гадоў назад іх было 37 %.

Гэта — плён ігнаравання канстытуцыйных нормаў аб дзяржаўнасці нашай мовы і яе шматгадовага выцяснення з афіцыйнага і грамадскага жыцця. Гэта вынік паўторнай постсавецкай русіфікацыі Беларусі і грэблівага стаўлення кіраўніцтва дзяржавы да нацыянальнай культуры і яе найгалоўнага складніка — мовы. Гэта вынік манкурцкага ўладнага прыкладу, які талерантна паўтараецца беларускім грамадствам.

Стагоддзямі лепшыя сыны і дочкі Беларусі захоўвалі сваю мову, праз забароны і забыццё вярталі гэты неацэнны дар свайму народу, распрацоўвалі і ўзбагачалі яго слоўнікавае і выяўленчае багацце, аберагалі ў віхурах імперскай і палітычнай залежнасці ад знішчэння, з'ядноўвалі з ім свае творчыя лёсы, чым праславілі і праслаўляюць Беларусь. Дзякуючы вернасці роднаму Слову, за апошняе стагоддзе вырасла вялікая нацыянальная літаратура, сцвердзіўся выдатны нацыянальны тэатр, праз нацыянальную беларускую школу прайшлі мільёны дзяцей — і што ж цяпер? Ліквідаваць усе гэтыя сацыяльныя заваёвы, усе набыткі і дасягненні — і тым самым перакрэсліць гістарычны шлях беларускага народа? Якім дзяржаўным розумам трэба кіравацца, якім патрыятычным сэрцам клапаціцца пра лёс нацыі, якімі мудрымі вачыма глядзець на родную зямлю і на ўвесь белы свет, — каб стаць на шлях нацыянальнага самазабойства?

Сёння беларуская мова, якая зрабіла з народанасельніцтва беларускую нацыю, — на мяжы выжывання. Беларусь — адзіная не толькі ў Еўропе, але і ў свеце краіна, якая не забяспечвае поўнага цыклу адукацыі на сваёй мове — пачынаючы ад дзіцячых садкоў і заканчваючы вышэйшымі навучальнымі ўстановамі.

Са стратай сваёй мовы беларускаму народу зноў пагражае небяспека ператварэння ў насельніцтва — краіны, якая мае гонар адносіць сябе да еўрапейскай. Аднак ні ў Еўропе, ні ў Азіі, ні ў Афрыцы няма падобных ганебных прыкладаў адмаўлення ад сваёй «адзежы душы», як назваў родную мову класік беларускай літаратуры Францішак Багушэвіч. Якраз агульнасусветны вопыт яскрава сведчыць: мова краіны — гэта адзін з наймагутных фактараў дзяржаўнай незалежнасці, без якога немагчымыя ні палітычная, ні эканамічная суверэннасць.

Адмаўляючыся ад сваёй мовы, беларусы страчваюць не толькі сваю культурную адметнасць і нацыянальную самабытнасць, але і будучыню сваёй нацыі.

Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў у чарговы раз нагадвае аб недапушчальным і катастрафічным стане беларускай мовы ў нашай краіне і заклікае ўсіх грамадзянаў паўстаць на яе абарону. Нацыянальная мова павінна адпавядаць статусу рэальнай дзяржаўнай!

Далучаючыся да іншых грамадскіх ініцыятыў па ўшанаванні мовы тытульнай нацыі Беларусі, Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў звяртае ўвагу на адсутнасць належных прапаноў па тэрміновым выпраўленні крызіснай моўнай сітуацыі ў сучасных дзяржаўных праграмах сацыяльнага, культурнага і духоўнага развіцця краіны і патрабуе неадкладна распрацаваць і ажыццявіць дзяржаўную праграму па выратаванні беларускай мовы.

**Снежань 2010 г.**

# САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ: ДЗЕСЯЦЬ ТОП-СПРАЎ 2010 ГОДА

**1. Перыядычнае выданне свайго газетнага дадатка «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ»** да штотыднёвіка «Новы час». Гэты культурна-асветніцкі праект распачаўся яшчэ ў 2006 годзе, калі з'явіўся ў свет першы нумар аднайменнага бюлетэня СБП — пасля таго, як старэйшую творчую арганізацыю Беларусі ўлады пазбавілі свайго перыядычнага выдання «Літаратура і мастацтва», заснавальнікам якога Саюз пісьменнікаў быў доўгія дзесяцігоддзі. Некалькі нумароў «Літаратурнай Беларусі» раней выйшлі ў газетах «Наша слова» і «Народная воля», а цяпер стала «прапісаліся» ў «Новым часе». За 2010 год падрыхтавана і выдадзена 14 нумароў літаратурнага дадатка.

«Літаратурная Беларусь» як своеасаблівае люстэрка незалежнага літаратурна-грамадскага жыцця выконвае актуальную асветніцкую, інфармацыйную і прапагандысцкую функцыю, распавядаючы пра дзейнасць Саюза беларускіх пісьменнікаў і знаёмячы з творчасцю беларускіх аўтараў — ад народных паэтаў да таленавітых дэбютантаў, згадкі пра якіх не змяшчаюць афіцыйныя СМІ.

**2. Выступы беларускіх пісьменнікаў у межах кампаніі «БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ!».**

Саюз беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца сузаснавальнікам і асноўным партнёрам гэтай агульнанацыянальнай грамадскай культурніцкай кампаніі, мэта якой — праз папулярызацыю беларускай культуры як сучаснай і перспектыўнай у сённяшнім свеце пашыраць узровень нацыянальнай ідэнтыфікацыі жыхароў Беларусі.

За год арганізавана і праведзена 274 сустрэчы літаратараў (членаў СБП) у 153 населеных пунктах Беларусі: у ВНУ, школах, бібліятэках, Дамах культуры, музеях. Сумарная аўдыторыя слухачоў — каля 10 000 чалавек.

Акрамя таго, СБП запачаткаваў і правёў у Белаазёрску міжнародныя паэтычныя чытанні «Бабіна лета Ніны Мацяш», якія плануецца ладзіць штогод у памяць выдомай паэтэсы на яе радзіме.

**3. Падрыхтаваныя і выйшлі ў свет чатыры чарговыя выданні кніжнай серыі Саюза беларускіх пісьменнікаў «КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА»:** зборнік гутарак Юрася Залоскі з Васілём Быкавым «Праўда як рэлігія», кніга ўспамінаў Дануты Бічэль «Мост Святога Францішка», зборнікі прозы Галіны Багданавай і беларускамоўнага пісьменніка з Беласточчыны Міхася Андрасюка (гэта яго першая кніга ў метраполіі).

4. Саюзам быў абвешчаны і праведзены рэспубліканскі літаратурны КОНКУРС «Жанчына ў сучасным грамадстве», у якім прыняло ўдзел 78 аўтараў. Яго пераможцы атрымалі прэміі і прызы. Завяршэннем Конкурса стаў міжнародны СЕМІНАР па гендэрных праблемах у творчасці і жыцці (чытайце аб тым на стар. 10(2) гэтага нумара «Літаратурнай Беларусі»).

**5. Тэхнічнае пераабсталяванне САЙТА Саюза беларускіх пісьменнікаў lit-bel.org і выхад яго на новы незалежны сервер,** што забяспечвае надзейнае функцыянаванне «электронных старонак» арганізацыі ў сусветным Сеціве. Сайт, зместавая дапрацоўка якога працягваецца, стаў не толькі даведнікам па гісторыі і сучаснасці старэйшай творчай арганізацыі Беларусі, але і своеасаблівай вэб-панарамай беларускага і замежнага літаратурна-грамадскага жыцця.

**6. Правядзенне грамадзянскай акцыі «БУДЗЬМА З БЫКАВЫМ!»:** бясплатны распаўсюд выдадзеных васьмі тамоў Поўнага збора твораў народнага пісьменніка Беларусі па бібліятэках краіны; даследчыцкая падрыхтоўка двух наступных (9 і 10-га) тамоў, у якія ўвойдуць драматургія і кінасцэнарыі славутага празаіка.

**7. Заснаванне і выданне раз у два месяцы культурна-інфармацыйнага бюлетэня «КНІГАНОША»,** які спрыяе папулярызацыі беларускамоўнага друку ў Беларусі і па-за яе межамі, змяшчае гутаркі з аўтарамі, рэцэнзіі на новыя выданні, а таксама анатацыі і выявы вокладак кніг незалежных выдавецтваў. Папяровы і электронны варыянты «Кніганошы» дасылаюцца на 602 адрасы — бібліятэкі, кнігарні, ВНУ Беларусі і беларусазнаўчыя асяродкі замежжа.

**8. Здабыццё «готландскіх стыпендый» членам СБП** з правам месяц жыць і працаваць на Балтыйскім востраве ў Доме пісьменнікаў і перакладчыкаў у шведскім горадзе Візбю. За 2010 год там адпачылі і папрацавалі шэсць беларускіх літаратараў (Сяргей Астравец, Галіна Дубянецкая, Валянціна Коўтун, Лера Сом, Аксана Спрынчан і Валерый Стралко).

**9. Удзел у еўрапейскіх і сусветных пісьменніцкіх з'ездах, кангрэсах і форумах** (WOLTIC-2010, Еўрапейскай пісьменніцкай радзе, Балтыйскай пісьменніцкай асацыяцыі, фестывалях у Летуве, Украіне, Польшчы, Чэхіі, Расіі, Швецыі, Турцыі, Славеніі, Сербіі), што спрыяе прапагандзе здабыткаў беларускай літаратуры за межамі краіны і садзейнічае міжнародным кантактам асобных літаратараў.

**10. І нарэшце — Саюз беларускіх пісьменнікаў «замацаваўся»:** займеў сваю «штаб-кватэру», куды пісьменнікам можна штодзённа вочна ці тэлефонна звярнуцца як са сваімі радасцямі, так і клопатамі; СБП выстаяў пад арганізаванным уладамі на пачатку года страшнейшым адміністрацыйным ціскам, калі ад васьмі дзясяткаў членаў СБП, якія працавалі ў дзяржаўна-бюджэтных інстытуцыях, пад пагрозай звальнення патрабавалі выйсці з арганізацыі. Шэрагі Саюза беларускіх пісьменнікаў папаўняюцца новымі таленавітымі апантанцамі мастацкага слова.

КОНКУРС

# ЛЕПШАЯ ДРУГАЯ…

**Паважаныя паэты і празаікі!**

**Шаноўныя аўтары, хто ўжо апублікаваў дэбютныя зборнікі!**

Саюз беларускіх пісьменнікаў абвяшчае Конкурс на лепшы рукапіс другой кнігі і ласкава запрашае дасылаць-перадаваць на суд нашага журы свае паэтычныя ці празаічныя зборнікі — на наступныя адрасы:

**220012, Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, д. 31, пак. 906;**

**e-mail: ubw.office@gmail.com.**

Чаму менавіта Конкурс другой кнігі? Як сведчыць беларуская выдавецкая ды і быццёвая практыка, менавіта ў стварэнні і выданні другой кнігі літаратары маюць найбольшыя праблемы і клопат.

Удзел у Конкурсе могуць браць аўтары і аўтаркі розных мастацкіх кірункаў і стыляў.

Перавага аддаецца літаратурнай моладзі.

Пераможца Конкурса атрымае адпаведны падарунак — бясплатнае выданне яго кнігі!

**Сакратарыят СБП**

ПРЭМІЯ

# ЛІТАРАТУРНАЯ ПРЭМІЯ ІМЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

У дзень нараджэння Максіма Багдановіча Саюз беларускіх пісьменнікаў, Беларускі ПЭН-цэнтр і Літаратурны музей імя Максіма Багдановіча абвесцілі пра заснаванне літаратурнай прэміі. Яна будзе ўручацца за найлепшы дэбют года ў трох намінацыях: паэзія, проза і пераклад.

«Да намінантаў Прэміі імя Максіма Багдановіча ёсць абавязковыя ўмовы, — кажа сябра журы, пісьменнік Уладзімір Арлоў. — Твор мае быць напісаны па-беларуску, аўтар на момант вылучэння мусіць мець не больш за 35 поўных гадоў».

Да разгляду журы прымае дэбютныя кнігі аўтараў, якія выйшлі цягам года. Могуць разглядацца і грунтоўныя публікацыі ў літаратурных часопісах (раман, аповесць, вялікі перакладны твор).

Спіс прэтэндэнтаў на Прэмію імя Максіма Багдановіча за 2010 год фармуецца да 14 лютага 2011 года.

Уручэнне адбудзецца напрыканцы сакавіка 2011 года.

Вылучэнні ад выдавецтваў і аўтараў з пазнакай «Прэмія імя Максіма Багдановіча» можна дасылаць на наступныя адрасы:



**ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»: вул. Кузьмы Чорнага, д. 31, пак.906, Мінск, 220012**
**E-mail: ubw.office@gmail.com**

**220050, а/с 218, Мінск.**
**E-mail: pen@vessobel.by.**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 2 СТУДЗЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.45** «Навагоднія прыгоды ў ліпені». Музычна-прыгодніцкая казка («Беларусьфільм»).
**09.00** Навіны.
**09.05** Альманах вандраванняў.
**09.35** Відэафільм АТН «Belarus open-2010. Сёе-тое аб танцах».
**10.20** Меладрама «Зімовая вішня» (СССР).
**12.00** Навіны.
**12.10** «Шрэк Трэці». Фантастычная анімацыйная камедыя (ЗША).
**13.55** Шоў «Чарадзейны цырк». Трансляцыя з Жэневы.
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** Шоў «Чарадзейны цырк». Трансляцыя з Жэневы.
**16.00** Сямейная калядная камедыя «Адзін дома-4» (ЗША).
**17.45** Суперлато.
**18.35** Навагодняя камедыйная меладрама «Снежны чалавек» (Расія).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.55** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Прэм'ера. Камедыя «Сваты-4» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
**23.40** Канцэрт 2.

### ОНТ

**08.00** Нашы навіны.
**08.05** «Смех, ды і толькі».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная прапаведзь.
**09.20** Фільм «Загадай жаданне».
**11.00** «Вялікая розніца». Навагодні выпуск.
**12.30** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.00** Легендарнае кіно ў колеры. «Папялушка».
**14.20** Камедыя «Дыяментавая рука».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Анімацыйны фільм «Хадзячы замак».
**18.05** «Лёд і полымя». Парад пераможцаў.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Лёд і полымя». Парад пераможцаў. Працяг.
**21.50** Фільм «Мужчына ў маёй галаве».
**23.55** Камедыя «Адпачынак у наручніках».

### СТВ

**07.20** Фільм «Дванаццаць месяцаў». СССР, 1972 г.
**09.40** «Вялікі сняданак». Навагодні выпуск.
**10.20** Навагодні мюзікл «Як казакі...». Украіна, 2009 г.
**12.20** «Добры дзень, доктар!».
**12.50** Фільм «Бум». Францыя, 1980 г.
**14.40** Фільм «Бум 2». Францыя, 1982 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Фільм «Студэнтка». Францыя, 1988 г.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Прэм'ера! Фільм «Каханне ў вялікім горадзе 2». Расія, 2010 г.
**22.25** Музычна-забаўляльнае шоў «Аднакласнікі. Навагодняя сустрэча». Украіна, 2008 г.
**01.25** Музычная прэмія «Залаты грамафон». Лепшае.

### ЛАД

**07.25** Прыгодніцкая камедыя «Вакацыі Санта Клаўса» (ЗША).
**09.00** Дабравест.
**09.25** Мір вашай хаце.
**09.35** Тэлебарометр.
**09.40** «Дванаццаць месяцаў». Мультфільм.
**10.35** Медычныя таямніцы.
**11.05** Школа рамонту.
**12.05** Бухта капітанаў.
**12.40** Кінаспробы.
**13.00** Гаспадар.
**13.30** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**13.50** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Чэлсі-Астан Віла. Прамая трансляцыя.
**17.30** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**18.25** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**22.05** Тэлебарометр.
**22.25** Смешная часіна.
**23.00** Культасвет.
**23.25** Канцэрт Beyonce «Experience Live» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.20** Музычная камедыя «Тытунёвы капітан».
**08.50** «Лепшыя песні». Святочны канцэрт.
**10.50** Навагодняя камедыя «Буйнагабарытныя».
**12.35** Прэм'ера. «Каралі лёду».
**14.00** Весткі.
**14.10** Фільм «Сабака на сене».
**16.40** Прэм'ера. «Гумар года».
**18.50** Прэм'ера. «Песня года». Частка другая.
**20.00** Весткі.
**20.25** Надвор'е на тыдзень.
**20.30** Прэм'ера. «Песня года». Частка другая. Працяг.
**22.40** Прэм'ера. «Добры вечар з Максімам».
**00.05** Фінал Першай лігі «КВЗ».

### НТВ

**06.20** Фільм «Глушэц. Прыходзь, Новы Год!».
**08.00** Сёння.
**08.20** Сямейная камедыя «Зачараваная Элла».
**10.00** Сёння.
**10.20** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара».
**12.05** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс: місія «Клеапатра»».
**13.50** «Суперстар».
**15.45** «Следства вялі…».
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Эра Стральца».
**19.00** Сёння.
**19.30** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне».
**23.00** Рамантычная камедыя «Кейт і Лео».
**01.05** Камедыя «Шосты элемент».

### EUROSPORT

**09.30** Хакей. Кубак Шпэнглера (Давос, Швейцарыя). Фінал.
**11.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі. Турнэ 4-х трамплінаў. HS 140.
**11.45** Вось дык так!!!
**12.15** Вось дык так!!!
**12.45** Усе віды спорту. Топ-10. Часопіс.
**13.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі. Турнэ 4-х трамплінаў. HS 140.
**14.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 130. Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**16.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Тур дэ Скі. Мужчыны і жанчыны. Спрынт. Класічны стыль. Прамая трансляцыя.
**17.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Мюнхен). Прамая трансляцыя.
**19.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 130. Кваліфікацыя.
**19.30** Гандбол. Прамая трансляцыя.
**21.00** Вось дык так!!!
**21.15** Ралі. Ралі-рэйд (Дакар). 1-ы этап. Прамая трансляцыя.
**21.45** Футбол. Harder Cup у Германіі. Прамая трансляцыя.
**00.00** Ралі. Ралі-рэйд (Дакар). 1-ы этап.
**00.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 130. Кваліфікацыя.
**01.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Тур дэ Скі. Мужчыны і жанчыны. Спрынт. Класічны стыль.
**02.00** Ралі. Ралі-рэйд (Дакар). 1-ы этап.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Калыханка для самых маленькіх.
**08.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.50** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**09.10** «Мы вольныя людзі», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**09.55** «Бульбаны», мультсерыял: «З Новым годам».
**10.10** Вагон.
**10.15** «Шлюб і перадузятасць», маст. фільм, 2004 г., ЗША – Вялікабрытанія.
**12.00** Навагодні канцэрт.
**12.55** «Коні і Карла», маст. фільм, 2003 г., ЗША.
**14.30** Хто ёсць кім?: «Цацачны гандляр з Давыд-Гарадка».
**14.50** Без рэтушы: «Кітайцы атакуюць», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**15.15** «Снежны завулак, 9», навагодні канцэрт.
**16.15** «Ранча», серыял: 20 серыя.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Час гонару», серыял: 10 серыя.
**18.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Аляксандр Салжаніцын», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Карнавал са смакам».
**20.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Каранацыя Вітаўта. Няспраўджаныя магчымасці».
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Паганяты сланоў».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**21.50** Фільматэка майстроў: «Мы тут больш не жывем», маст. фільм, 2004 г., ЗША.
**23.30** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Дзень другі».
**23.35** Тыдзень у «Аб'ектыве».

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, афоміўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанк», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Віцебск: (8 029) 3084978, Юрый.
Масты: (8 029) 1387994, Дзмітрый.
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей,
(8 029) 178 31 68, Вольга,
(8 029) 625 57 51, Аксана.

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Шаноўныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

Але для тых, хто падпішацца на «Новы час» да 1 студзеня, кошт застанецца ранейшы (500 руб нумар, 2000 — месяц).

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 625 57 51.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______
Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

НОВЫ ЧАС

www.novychas.org

ЭСЭ

# ЛІЛЕЯ

Андрэй АДАМОВІЧ

**Учора, калі мы ўжо сышлі з плошчы, мы сядзелі ў сябра. Ён падарыў мне малюначак, які ўначы ў адным са спальных раёнаў набыў у дзяўчынкі, з выгляду аўтысткі. Яна прасіла за сваю інсітную акварэль сто рублёў, але ён даў тысячу.**

На малюнку, на чырвоным тле — жоўтыя лілеі, энергічна абведзеныя сіняй асадкай. На адваротным баку аркуша — верш пра іх, такі самы энергічны, як і малюнак, але такі наіўны — мастак нібы не ведаў, што такое словы і як яны мусяць складацца ў тэкст. Яго лініі хочуць вырвацца за межы аркуша, але не разумеюць, што гэта фізічна немагчыма. Праз гэтую першабытную, але пераможаную межамі аркуша энергію малюнак мае звышнатуральную моц уздзеяння.

Тое, што адбывалася ўчора, — інсітныя лілеі. Шмат, шмат, шмат людзей — столькі я ніколі не бачыў у адным месцы разам — выйшлі, каб выказацца, але не ўлічылі, што ў гэтага белага аркуша Мінска ёсць межы, праведзеныя дыктатурай аднойчы, але ўпэўнена і назаўсёды. Усё, што адбывалася ўчора, — гэта папросту чарговая спроба намаляваць лілеі, не зважаючы на ўласцівасці фарбаў і прынцыпы кампазіцыі. Мы, як тая дзяўчынка-аўтыстка, хацелі перамагчы рэальнай моцай духа, але мастацкія крытыкі ўбачылі ў гэтым толькі парушэнне законаў кампазіцыі і здаровага сэнсу.

Я хачу напісаць пра тое, што бачыў учора. Хто я такі, каб рабіць гэта? Ніхто. Я напраўду "адмарозак", як казаў пра мяне АГЛ. Я не зрабіў кар'еры, я не зарабляю вялікіх грошай. Я басаногі, але даўно ўжо не хлопчык. Учора жонка назвала мяне няўдахаю. Гэта праўда. Мне няма чаго страчваць. Але ўчора на плошчы я бачыў прафесіяналаў, якіх паважаю. Я ведаю, што яны дасягнулі ўсяго, што можа дасягнуць чалавек у прафесіі. Яны не маюць нястачы ў грошах, яны проста хочуць выказацца.

Дый тая задаволеная большасць, якая спала ў гэты час па малінаўках і зялёных лугах, такая ж басаногая, як я. У лепшым выпадку, яны маюць патрыманыя машыны і свежаадбудаваныя кватэры, кошт якіх упадзе крыху ніжэй за ніякі пры першым-лепшым перакрыцці газавага венцілю. Бо без людзей гэты ячэісты бетон і гэтыя механічныя каробкі не каштуюць нічога. А людзей здзьме эканамічным ветрам у Еўропу ці Расію менш чым за тыдзень. Яны будуць гандляваць у Польшчы, будаваць шматпавярхоўкі ў Маскве, яны будуць начаваць у вагончыках — карацей, змрочныя дзевяностыя бліжэй, чым ім падаецца.

Учора я ішоў на плошчу паўз вокны рэстарану. Вялікія вокны, поўныя маладой буржуазіяй. Добра апранутыя мужчыны кармілі сваіх жанчын грашыма з талерак. Мужчыны глядзелі ў вочы сваіх жанчын, але зрэдку мы сустракаліся позіркамі. І я, і яны — мы ўсё разумелі. Я разумеў, чаму я іду на плошчу, а яны — чаму яны сядзяць у дарагой вопратцы над талеркамі, поўнымі грошай. І ў іх вачах было што заўгодна: пачуццё перавагі, снабізм, які можна дазволіць сабе, заліваючы спадарожніцу французскім шампанскім, але ў іх не было аднаго — страху.

А пасля, пасля скончыліся вокны з наведнікамі і пачаліся вокны, поўныя белых халатаў кухні. Маладыя няўдахі, кшталту мяне, шчыравалі над ежай, ператвараючы яе ў грошы, яны сустракаліся позіркамі са мною, і ў гэтых позірках быў страх. Яны баяліся, баяліся за свае ланцугі.

Тады я сказаў сябру:

— Пасля перамогі нагадай мне, што я збіраўся разграміць гэтыя галеры.

Праз пяцьсот крокаў мы ўліліся ў натоўп і сталі часткаю вялікай Лілеі, што не змяшчалася на аркуш. Тут было шмат тых, каго я ведаю асабіста. Маладыя прафесіяналы, людзі творчых прафесій, проста нейкія мутныя асобы без пэўных занняткаў — мае сябры. Але тут былі і крэпкія маладыя мужчыны. Пазней у інтэрнэце, я бачыў, іх называлі крывавымі правакатарамі.







Можа быць, але там я спадзяваўся, што гэта працоўныя, якія больш не баяцца ланцугоў. Працоўныя з серабранак, якіх мы чакалі так даўно. Чакалі столькі, колькі я помню, як лілеі малююць на вуліцах.

Там, на плошчы, я зрабіўся часткай гэтага вялікага, не зразумелага мне малюнку. Адной рысачкай, якую мастак хацеў ператварыць у сцяблiну або ў лісток, але ён забыўся пра гэтую рысачку, і яна так і засталася — недаведзенай да агульнай карціны. Карціны, якая і складалася толькі з такіх вось недаведзеных рысачак.

Побач са мной былі мае сябры. І людзі, якіх я ніколі да гэтага не бачыў. Мы крычалі нейкія дзіўныя словы, у якія даўно ніхто не верыў. Незабытыя, але сцёртыя словы, сэнс якіх падаваўся далёкай абяцанай зямлёй, у якую ніхто з нас не прыйдзе. Бо Маісей, спускаючыся з Сінаю, звярнуў шыю.

Мастак, які пачаў маляваць лілею, ужо забыўся на нас. На мяне, на старога паэта побач са мною, на дызайнераў і праграмістаў, на манагераў і дробных прадпрымальнікаў — на ўсіх, хто стаяў плячо да спіны і спіна да нечаканай лакуны ў малюнку. Лакуны, пакінутай па неахайнасці.

Праз доўгія хвіліны чакання, пакуль хтосьці казаў штосьці ў мікрафон, але словаў усё адно не было чуваць, усе мы зрушылі на праспект. Міліцыянты, якія вартавалі дарогу, падаваліся адным з намі цэлым. Яны не былі ні агрэсіўнымі, ні напужаным, нібы яны былі самаарганізаванай часткай лілеі, эрытрацытамі ў яе жылах — тым, кім і мусілі б быць.

На праспекце стала бачна, як нас насамрэч шмат. Хтосьці падпаліў файеры. Але гэтая колькасць людзей-рысачак, якія замалявалі вуліцу ад Кастрычніцкай плошчы да Цэнтральнай кнігарні, нічога не мяняла ў вачах галоўнага крытыка. Бо ніводзін крытык у сваіх ацэнках не кіруецца такім крытэрам, як колькасць паасобных рысачак на малюнку. Спадзявацца на гэта было б смешна.

Ужо на іншай плошчы, якую мы занялі, здаецца, без бою, хтосьці званіў у чарнобыльскі звон Чырвонага касцёлу. Я не ведаю, ці ўмеў гэты чалавек званіць, ці разбіў ён звон. Ці вырвуць гэтаму звону язык. Але я ведаю, што хтосьці мусіў схапіць вяроўку і пачаць гаварыць над галовамі людзей. Бо ўсе сабраліся толькі з адной мэтай — гаварыць, чаго б гэта ні каштавала. Цяжка гаварыць, калі цябе не слухаюць, немагчыма гаварыць з вырваным языком — але пакуль вялікі крытык не схіліўся над аркушам, пакуль ты не прапасіў у яго сто рублёў за сваю лілею, ты вольны маляваць, што табе хочацца, што падказвае табе сумленне мастака.

Нехта ўскараскаўся на Леніна і казаў правільныя словы, якія, пасіленыя апаратурай, разляталіся над галовамі сабраных. Ён заклікаў тэлефанаваць сябрам і клікаць іх на плошчу. Нібы не ведаў, што ўсе, каму гэта было важна, і так былі там.

А далей, далей рысачкі скончыліся, і быў час напраўду даведацца, ці змогуць яны ператварыцца ў малюнак, быў час вырашаць. Кожны вырашаў, пайсці ці застацца. Было толькі два выйсця: граміць Дом ураду ці ісці спаць. Я не быў гатовы ламаць дзверы і біцца з маладымі хлопцамі, што стаялі па той бок аркушу.

Тых, хто ламаў дзверы, называюць правакатарамі, але я не ведаю, чаго хацелі тыя, хто заклікаў на плошчу грамчэй за астатніх. Мірных перамоваў? Але хіба можа дзяўчынка-аўтыстка прадаць свой малюнак на «Сотбіс»? Прынамсі, пакуль яна жывая.

Я сышоў. Мы сядзелі з сябрам у ягоным офісе, мы яшчэ чулі, як лунае над плошчай покліч да ўладаў. Словы, якія даўно сцерліся аб яе цвёрды граніт. Мы пілі гарачую гарбату і каву. Мы разглядалі намаляваную дзяўчынкай лілею. Мы яшчэ нічога не ведалі ні пра зламаныя дзверы, ні пра бойню на плошчы. Бойню без нумара. Чарговую.

Я сеў у маршрутку і разам са стомленымі напрыканцы цяжкога дня людзьмі, што ехалі ў спальны раён, прыехаў дадому. Мне тэлефанавалі тыя, хто хваляваўся за мяне. Дарэмна. Я быў негатовы да таго, каб пайсці на штурм. Пакуль я гатовы толькі разглядаць лілеі.

Чалавек памірае адзін і голы. Мастацкія крытыкі вынеслі прысуд інсітнай працы дзяўчынкі-аўтысткі: «Кампазіцыя няверная на 76 адсоткаў». Хай яны памятаюць, што чалавек памірае голы і ў адзіноце. Хай яны памятаюць, што пашкадавалі сто рублёў для той, якая проста хацела, каб яе лілею стрымана пахвалілі.

Няхай яны памятаюць, што сапраўднага мастака не спыніць ні адсутнасць фарбаў, ні адсутнасць паперы. Мастак пачне маляваць крывёй. Для яго напраўду існуе толькі лілея — і нічога больш.



Photo.ByMedia.Net

▸ ГЕАПАЛІТЫКА

# ЗАЛАТАЯ СТАРОНКА Ў ГІСТОРЫІ АБО СУР'ЁЗНЫ НЕДАХОП

Алег НОВІКАЎ

**Замежныя дыпламатычныя службы па-рознаму трактуюць вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.**







## Захад і ЗША

Тут ацэнка выбараў дастаткова кансалідаваная. Няма нават традыцыйнай супярэчнасці паміж пазіцыяй ЕС і ЗША.

Прэс-служба Белага дому распаўсюдзіла заяву «Аб беларускіх выбарах і палітычным гвалце». У ёй гаворыцца, што ЗША не могуць прызнаць законнымі вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі 19 снежня і заклікаюць неадкладна вызваліць усіх затрыманых».

«Збліжэнне з Еўрапейскім Саюзам, да якога імкнецца Беларусь, адкладаецца на нявызначаны час», — такую заяву зрабіў афіцыйны прадстаўнік ураду ФРГ Штэфан Зайберт, каментуючы разгон вулічнай акцыі ў Мінску 19 снежня і масавыя арышты грамадзян. Зайберт запатрабаваў вызвалення апазіцыйных палітыкаў і журналістаў, адзначыўшы, што Германія сочыць за падзеямі ў Беларусі «з вялікай заклапочанасцю».

Францыя запатрабавала неадкладнага вызвалення ўсіх арыштаваных. «Мы асуджаем арышты кандыдатаў апазіцыі, журналістаў і актывістаў NGO, — гаворыцца ў заяве МЗС Францыі ад 20 снежня. — Мы заклікаем беларускія ўлады неадкладна вызваліць усіх гэтых людзей і не ўжываць сілу».

Міністр замежных спраў Аўстрыі Міхаэль Шпіндэлегер выказвае шкадаванне ў сувязі з тым, што беларускія ўлады «не выкарысталі шанец, які былі выбары». Па яго словах, быў прадэманстраваны «кропкавы прагрэс», аднак у цэлым у выбарчым працэсе па-ранейшаму існуюць сур'ёзныя недахопы».

Міністэрства замежных спраў Славакіі лічыць, што падчас выбараў мелі месца «сур'ёзныя парушэнні міжнародных стандартаў».

Чэшскае знешнепалітычнае ведамства асуджае «шырокае выкарыстанне сілы беларускімі ўладамі супраць дэманстрантаў» і «глыбока занепакоенае затрыманнем актывістаў апазіцыі, уключаючы кандыдатаў у прэзідэнты».

## Польшча і Літва — галоўныя лабісты

МЗС Польшчы асудзіў «масавыя збіванні і затрыманні дэманстрантаў на вуліцах Мінска». «Жорсткія дзеянні праваахоўных органаў недапушчальныя, — гаворыцца ў заяве польскага МЗС. — Мы заклікаем спыніць гвалт, неадкладна вызваліць затрыманых і растлумачыць збіванні пратэстуючых, палітыкаў і журналістаў, у тым ліку замежных». Гвалтоўныя дзеянні беларускіх уладаў асудзіў таксама прэзідэнт Польшчы Браніслаў Камароўскі. Кажучы пра вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, ён падкрэсліў, што выбары павінны паслужыць падставай для перагляду стратэгіі ЕС у адносінах да Беларусі.

Міністр замежных спраў Літвы Аўдронюс Ажубаліс заявіў, што Літва ўхваляе ацэнку міжнародных назіральнікаў, якія абвясцілі, што прэзідэнцкія выбары ў Беларусі былі недэмакратычнымі.

## Садружнасць незалежных дзяржаў

У той час, як кіраўнік місіі АБСЕ прызнала выбары «не адпаведнымі стандартам гэтай арганізацыі», старшыня АБСЕ Нурсултан Назарбаеў так не лічыць. Ён павіншаваў Лукашэнку з «пераканальнай перамогай». Падобным чынам выказаўся і Аліеў.

Што тычыцца Расіі, то пакуль афіцыйнага віншавання няма. Хіба што Мядзведзеў у тэлефоннай гутарцы адзначыў, што «Беларусь заўсёды будзе адной з самых блізкіх краін для Расіі, а выбары з'яўляюцца ўнутранай справай суседняй дзяржавы». Уладзімір Жырыноўскі паставіў Мінску двойку за выбары, а ліберальны апазіцыянер Нямцоў назваў іх татальнай фальсіфікацыяй. Стопрацэнтна задаволены толькі Зюганаў. «Нядаўна ў Маскве для партыйнага актыву мы дэманстравалі сумесны беларуска-расійскі фільм «Брэсцкая крэпасць». Там праз усю карціну рэфрэнам праходзіць заклік радыста-беларуса, які трымаў сувязь з «вялікай зямлёй»: «Я крэпасць, я крэпасць, вяду бой, чакаю падтрымкі»... Дык вось, беларускі народ заўсёды можа разлічваць на нашу падтрымку», — адзначыў Зюганаў.

Адміністрацыя прэзідэнта Грузіі ацэніць прэзідэнцкія выбары ў Беларусі пасля таго, як стануць вядомыя іх канчатковыя афіцыйныя вынікі. Пра тое ж заявіў і афіцыйны Ерэван.

Афіцыйны Кіеў маўчыць, але ва Украіне ўжо ідуць дэбаты, ці не дасць Лукашэнка заразлівы прыклад свайму ўкраінскаму калегу Януковічу. Самі лідары Партыі рэгіёнаў так не лічаць. «Той, хто пра гэта заяўляе ва Украіне, пакутуе на хворае ўяўленне», — сказаў дэпутат Партыі рэгіёнаў Вадзім Калеснічэнка.

## Саюзнікі

Па словах прэзідэнта Ірана Махмуда Ахмадзінеджада, выбары ў Беларусі «сталі яшчэ адной залатой старонкай у гісторыі вялікага беларускага народа» і сведчаць пра «народную падтрымку прэзідэнцкіх праграм».

У заяве МЗС Венесуэлы гаворыцца, што прэзідэнт Уга Чавес «віншуе народ Беларусі і яе дзяржаўныя структуры з правай дэмакратыі падчас галасавання, у выніку якога быў пераабраны на пасаду прэзідэнта краіны вялікі еўрапейскі лідар Аляксандр Лукашэнка». «Сёння Беларусь узвышаецца, як бастыён добрай якасці і росквіту ў Еўропе, якая знаходзіцца ў стане канвульсій з-за сквапнасці транснацыянальнага капіталу», — гаворыцца ў віншаванні Чавеса.

Сюрпрызам стала пазіцыя Кітаю, які не спяшацца з віншаваннямі. «Мы спадзяемся, што ў Беларусі захаваецца палітычная стабільнасць, эканоміка будзе развівацца», — заявіла афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Цзян Юй на брыфінгу. «Выбары прэзідэнта Беларусі — унутраная справа краіны. Кітай паважае суверэнны выбар беларускага народа», — сказала яна. З улікам шэрагу апошніх дамоваў з Пекінам, можна было чакаць больш цёплых слоў. Магчыма, у Пекіне сапраўды хацелі пагуляць на канфлікце Масквы і Мінска і спадзяваліся на ўстанаўленне кантролю над часткай беларускай эканомікі (напрыклад, «Беларуськаліем»). Цяпер больш смачныя кавалкі дастануцца расійскім алігархам.

***

Сыходзячы з тону заходніх МЗС, можна прагназаваць вяртанне РБ да халоднай вайны з Захадам. Як прыклад, словы кіраўніка аўстрыйскага МЗС: «Еўрасаюз павінен вельмі актыўна заняцца сітуацыяй у Беларусі і будучай формай адносін Брусэлю з Мінскам. Мы не хочам ізаляваць Беларусь, але будзем настойваць на выкананні дэмакратычных каштоўнасцяў». Гэта штурхае Мінск у абдымкі Масквы, аднак новы фармат адносін тут пакуль не зразумелы.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

4 снежня жыхары Беларусі назіралі нешта беспрэцэдэнтнае: дзевяці кандыдатам у прэзідэнты ад апазіцыі дазволілі крытыкаваць Лукашэнку ў прамым эфіры дзяржаўнага тэлебачання. Але дэмакратычны «прасвет» апынуўся толькі чарговым блефам Лукашэнкі ў яго гульнях, дзе ён закідвае вудачку для Масквы. У апошнія гады Лукашэнка сварыцца з Крамлём, і ягоны галоўны сродак абароны — высілкі збліжэння з Захадам. Відавочна, рэальных намераў увесці дэмакратыю ніколі не было. Усё гэта было толькі пантамімай, закліканай прымусіць Расію да перамоваў. Пасля таго, як дамова была дасягнутая, Лукашэнка, не саромеючыся, задушыў апазіцыю.

**«The Time» (ЗША)**

Паспрабаваўшы ўсе магчымыя сродкі для дэмакратызацыі Беларусі, ЕС вымушаны прызнаць, што яго дзеянні поспеху не маюць. Як далей выбудоўваць адносіны з гэтай краінай, яшчэ павінна вырашыцца, але ўжо цяпер неабходна зноў увесці супраць Лукашэнкі санкцыі, якія былі адменены год таму.

**«Frankfurter Allgemeine» (Германія)**

Выхад людзей — сур'ёзны званок для стабільнасці рэжыму. Пакуль Лукашэнка гэтага не разумее. Як гісторык, ён павінен памятаць, што некаторыя палітыкі, якія адчуваюць сваю палітычную смерць, пачынаюць адкручваць гайкі і праводзіць лібералізацыю. У выпадку з Лукашэнкам хуткім часам лібералізацыі ў краіне чакаць не варта. Курс застаецца ранейшы. Беларусь уступае ў 4-ю пяцігодку Лукашэнкі расколатай, як ніколі раней. Нічога добрага чарговы тэрмін Лукашэнкі для Беларусі не нясе. Расія і Еўропа зноў атрымліваюць праблемнага і неадэкватнага суседа яшчэ на 5 гадоў.

**«РЭГНУМ» (Расія)**

Спадар Лукашэнка зараз можа меркаваць, што ў яго атрымаецца абаперыцца на Маскву, якая абвясціла разгон дэманстрацый «унутранай справай Беларусі». Але заходнія ўрады павінны зрабіць так, каб ён заплаціў высокі кошт за свае паводзіны. Санкцыі супраць спадара Лукашэнкі і яго бліжэйшых саўдзельнікаў павінны быць аднаўлены і ўзмоцнены… Падзеі ў Беларусі даюць прэзідэнту Бараку Абаме шанец праверыць, ці не распаўсюджваецца «перазагрузка» ў адносінах паміж Масквой і Вашынгтонам таксама на Беларусь. Крэмль мае досыць уласных падставаў не любіць містэра Лукашэнку. Магчыма, надышоў момант заахвоціць урад Уладзіміра Пуціна адмовіцца ад сваіх імперыялістычных амбіцый у рэгіёне і дапамагчы ў ізаляцыі рэжыму, у якім даўно наспелі змены.

**«The Washington Post» (ЗША)**

Рэакцыя кіраўніцтва Польшчы і Літвы — гэтыя краіны гучней іншых заклікалі да вываду Беларусі з расійскай арбіты, — характарызуецца адным словам «шок».

**«The Wall Street Journal» (ЗША)**

ЦІКАВА

# АБАРАНІЦЬ ГОДНАСЦЬ МЕХРЫБАН ХАНУМ

Алег НОВІКАЎ

**Азербайджан узняўся на абарону годнасці першай лэдзі, якую падазраюць у інтымных сувязях з беларускім прэзідэнтам.**



Пра тое, што А. Лукашэнка ў Берліне таемна сустракаўся з жонкай прэзідэнта Азербайджана Мехрыбан Аліевай, напісала італьянская газета «Il Foglio». Выданне спасылалася на ананімнага нямецкага дыпламата, які, у сваю чаргу, засвяціўся на «WikiLeaks».

Звычайна, паведамленні са пасылкай на «WikiLeaks» успрымаюцца спакойна. Аднак не ў Азербайджане. Хаця інфармацыя пра адзюльтэр Мехрыбан здаецца проста вар'яцкай, у Баку вырашылі даць годны адпор — распачалі кампанію ў абарону годнасці першай лэдзі.

Нагадаем, што Мехрыбан Аліева (нар. 1964) — жонка прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева. Ад шлюбу, які быў заключаны ў 1983 годзе, яны маюць трох дзяцей. Аліева таксама дэпутат парламенту Азербайджана, кіраўнік працоўнай групы па азербайджана-амерыканскіх міжпарламенцкіх сувязях, прэзідэнт Фонду Гейдара Аліева і Фонду сяброў культуры Азербайджана, прэзідэнт Федэрацыі гімнастыкі Азербайджана, амбасадар добрай волі ЮНЭСКА, ААН.

І вось, калі верыць італьянскім журналістам, такая жанчына магла здрадзіць мужу з беларускім прэзідэнтам.

Палітра азербайджанскіх абаронцаў годнасці Мехрыбан вельмі шырокая: ад працоўных калектываў да партый і вядомых асобаў. Штодня на старонках газет друкуюць іх гнеўныя лісты пра тое, што «Il Foglio», які надрукаваў хлусню пра нефармальныя сустрэчы першай лэдзі ў Берліне, «пераступіў рысу прыстойнасці, парушыўшы мінімальныя этычныя нормы журналістыкі».

Прычым, як прызнаюць замежныя журналісты, кампанія мае грамадскі рэзананс. Расійская «Независимая газета» адзначае: «Не варта думаць пра арганізаваную вярхамі кампанію. У краіне сапраўды глыбока паважаюць Мехрыбан Аліеву за яе добрыя справы, за здольнасць дапамагчы. А шматгранная, актыўная дзейнасць, накіраваная на актывізацыю дыялогу культур і цывілізацый, абарону сусветнай культурнай спадчыны, падвышэнне ролі жанчын у палітычным і грамадскім жыцці, прэзідэнта Фонду Гейдара Аліева, амбасадара добрай волі ЮНЭСКА, дэпутата парламента Мехрыбан Аліевай вядомая і далёка за межамі Азербайджана».

Так ці інакш, чым далей, тым больш кампанія выходзіць за рамкі звычайнай барацьбы з неэтычнай журналістыкай. Нараджаюцца ўсё новыя і новыя мегапалітычныя версіі. Кажуць, што замах на маральны воблік Мехрыбан — частка больш глабальнага плану супраць дзеючага рэжыму Аліева.

«Паклёпніцкія выдумкі пра першую лэдзі Мехрыбан Аліеву, дзейнасць якой атрымала высокую адзнаку ў свеце, зыходзяць ад ворагаў Азербайджана, якія ўсімі сіламі імкнуцца дыскрэдытаваць дзяржаўнасць краіны і ставяць пад удар міжнародныя адносіны. Гэта таксама пераканаўчы доказ таго, што расце міжнародны аўтарытэт Азербайджана, які не дае жыцця ворагам, што апусціліся да такой ганебнасці» (Day.az).

На тым жа партале сцвярджаюць, што «Il Foglio» сваёй публікацыяй мела за мэту абразіць усіх азербайджанцаў: «Публікацыя выклікае справядлівае абурэнне і праведны гнеў, таму што гэта газетка абразіла грамадска-палітычнага дзеяча, чыя паспяховая дзейнасць дэманструе ўсяму свету такія яркія рысы азербайджанскага народа, як працавітасць, высокую маральнасць, гуманнасць, клопат пра блізкіх і адданасць сямейнаму ачагу».

Хутка атака на італьянскае выданне перайшла на новы ўзровень. Пад удар азербайджанскіх публіцыстаў трапіла ўся італьянская нацыя.

«І гэта друкуецца ў каталіцкай краіне, дзе існуе культ маці, Мадонны, жанчыны. На жаль, становіцца відавочным, што ўся тая рэлігійнасць выглядае апэрэткай. Гэты брудны лісток, які па дзіўным збегу акалічнасцяў завецца газетай, у першую чаргу знішчыў вобраз італьянца як чалавека гонару, які так доўга стваралі вялікія майстры кіно. Перад вачамі засталася толькі выява жука-журналіста па прозвішчы Папарацы з фільма Феліні, які і стаў прабобразам цынічных і жулікаватых лаўцоў поспеху. Дадумацца да такой хлусні мог толькі сын, унук і праўнук cornuto («рaганосец» па-італьянску). А такую краіну з-за вас ніхто паважаць не будзе, хоць здыміце яшчэ тысячу «хросных бацькаў» і дайце свету яшчэ пецярых Леанарда Да Вінчы», — піша Анар Мамедханаў.

Пакуль італьянцы мала рэагуюць на падобныя выпады. Затое ахвотна кампанію ў абарону Мехрыбан каментуе армянская прэса. Мясцовыя газеты знаходзяцца ў стане перманентнай перапалкі з азербайджанскай прэсай (адно са шматлікіх рэхаў карабахскага канфлікту).

За словам у кішэню армянскія акулы пяра не лезуць, яўна пры гэтым выходзячы за рамкі этыкі. «Новое время»: «Зрабілі замах на годнасць першай лэдзі, жанчыны, маці, гераіні, працаўніка. Ды што там, замахнуліся на адзіную выбітнасць (нафта не лічыцца) Азербайджана, на яго гонар — Мехрыбан ханум Аліеву. Усё гэта зразумела. Але чаму маўчыць беларускі прэзідэнт, чаму Бацька не скажа слова ў абарону такой жанчыны? Вось у чым загадка».

Самае цікавае, што ўся гэта гісторыя, якая яшчэ раз сведчыць пра значэнне інстытуту першай лэдзі, набывае новыя абароты. Быццам нехта, дзякуючы кампаніі, пралічыў, што постаць Мехрыбан — слабае месца ў іміджу рэжыму Аліева.

Брытанская «Guardian» напісала: «У жонкі прэзідэнта Азербайджана сур'ёзныя праблемы з выразам твару. Гэта з-за велізарнай колькасці пластычных аперацый, чаго немагчыма не заўважыць. Адзначаны і той факт, што дзякуючы хірургічнаму ўмяшанню, яна выглядае не старэй уласных дачок».

Брытанскі журналіст таксама згадвае каментар, які быў у адной з дыпламатычных дэпеш, адпраўленых з пасольства ЗША ў Азербайджане. Дыпламат піша, што Мехрыбан Аліева носіць вельмі смелую вопратку нават па заходніх мерках.

Нарэшце, у сацыяльнай сетцы Twitter быў створаны профіль twitter.com/firstladyaze, які нібы належыць Аліевай. З гэтага профілю з карыстальнікамі сеткі вядзецца інтэнсіўная перапіска.

Спатрэбілася паведамленне пратакольнай службы Мехрыбан, у якім падкрэсліл, што гэты фальшывы профіль і перапіска не мае ніякага дачынення да першай лэдзі краіны.

Таксама раней пратакольная служба паведаміла, што Баку пакідае за сабой права афіцыйна звярнуцца ў італьянскія і міжнародныя судовыя інстанцыі з іскам пра абарону гонару і добрыя якасці першай лэдзі Азербайджана.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### УГА ЧАВЕС

З падачы прэзідэнта, Венесуэла зрабіла першы крок на шляху да змены дзяржаўнага ладу. Нацыянальная асамблея, якую кантралююць прыхільнікі Чавеса, насуперак пратэстам апазіцыі, прыняла закон пра народную ўладу. Сэнс рэформы ў тым, каб сфармаваць на месцах парламенты камунаў. Камуны — гэта органы самаарганізацыі грамадзян на месцах. Звычайна яны займаюцца развіццём інфраструктуры і сацыяльнымі акцыямі. Справа, на першы погляд, быццам добрая. Тым больш, што камуны працуюць па прынцыпе базавай дэмакратыі. Сродкі размяркоўваюцца наўпростам галасаваннем. Аднак апазіцыю турбуе іншае: звычайна арганізатарамі падобных камунаў з'яўляюцца бедныя людзі, якія галасуюць за дзеючага прэзідэнта. Цяпер тыя камуны набываюць юрыдычны статус дзяржаўнай арганізацыі. У дадатак атрымаюць частку гарадскіх бюджэтаў і будуць адказныя за некаторыя галіны, якія традыцыйна былі ў кампетэнцыі муніцыпалітэтаў. На думку апанентаў Чавеса, пачынаецца паступовы пераход улады ад гарадскіх саветаў да тых самых лаяльных рэжыму камунаў. Тым больш, што ў перспектыве плануецца ўвогуле стварыць нацыянальны парламент камунаў, які будзе дзейнічаць паралельна з асноўным парламентам. Зараз у парламенце амаль 40 працэнта дэпутатаў ад апазіцыі. Каб перастрахавацца на выпадак, калі ў праціўнікаў Чавеса з'явіцца дэпутацкая большасць, улада быццам і збіраецца ўзаконіць камуны.



### ІСЛАМ КАРЫМАЎ

Прэзідэнт Узбекістана абвясціў вайну фільмам жахаў. Пра гэта піша папулярны рэсурс Фергана.ру, аналізуючы спіс забароненых у краіне фільмаў, які з'явіўся на афіцыйным сайце ўрада. У чорны спіс увайшлі 744 стужкі мясцовай і замежнай вытворчасці. У тым ліку і сусветна вядомыя, якія заваявалі прызы на розных кінафэстах: «300 спартанцаў», «Ад змяркання да світання», «Борат», «Сэкс, хлусня і відэа», «Антыхрыст». Пераважная большасць з забароненага — не парнаграфія, а фільмы жахаў. Прычым некаторыя забароненыя ва Узбекістане двойчы. Напрыклад, у першы раз фільм «Лясная здань» забаранілі ў сакавіку 2009 года. Але, мабыць, гэтага стала недастаткова: яшчэ раз яго забаранілі ўжо ў чэрвені таго ж года. А вось фільм «Мёртвыя» забаранілі не два, а цэлых тры разы — спачатку ў студзені і жніўні 2009 года, а потым яшчэ ў красавіку 2010-га. Карціна «Белы зомбі», знятая ў далёкім 1932 годзе, была забароненая ў 2009 годзе, праз 77 гадоў пасля яе стварэння. Застаецца пытанне: што за ўсім гэтым стаіць? Няўжо ўлады Узбекістана клапоцяцца пра тое, каб псіхіка грамадзян, і так падарваная ростам коштаў і бязмежжам чыноўнікаў, канчаткова не саскочыла з катушак?

### УЛАД ФІЛАТ

Прэм'ер-міністр Малдовы пачаў крыжовы паход супраць «амаральных паводзін» у школах. Адно з апошніх пасяджэнняў ураду было спецыяльна прысвечанае зместу кнігі «Дзецям пра сэкс». Кніга, якая стала прадметам гарачых спрэчак, з'явілася ў продажы яшчэ ў 2004 годзе. Двухтамовае выданне — прадукт румынскага выдавецтва «Prut International» на рускай і румынскай мовах. Філат раптам узняў скандал: чаму такія выданні ў вольным продажы! «Што гэта за кніга? Хто дазволіў яе прадаваць?» — не супакойваўся прэм'ер, дэманструючы міністрам малюнкі целаў мужчын і жанчын. Пад раздачу патрапіў, як і меркавалася, міністр асветы, у якога запатрабавалі тлумачэнні. У выніку, акрамя забароны продажу кнігі, прэм'ер запатрабаваў у кампетэнтных дзяржструктур прааналізаваць сітуацыю на прадмет парушэнняў пры выдачы ліцэнзіі на продаж. У той жа дзень кніга знікла з прылаўкаў кніжных крамаў. Расправа над кніжкай абурыла праваабаронцаў. На арганізаванай прэс-канферэнцыі прадстаўнікі праграмы Цэнтра па правах чалавека заявілі, што Філат перавысіў свае службовыя паўнамоцтвы, аддаўшы распараджэнне пра забарону распаўсюду выдання.



ЦІКАВА

# ЗААКІЯНСКІ ВЫРАЙ

## ЦІ ВАРТА НЕ ВЯРТАЦЦА З АМЕРЫКІ?

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**З верасня па лістапад 2010 года Марыя Мартысевіч знаходзілася ў ЗША па запрашэнні Дзярждэпартамента як удзельніца Міжнароднай пісьменніцкай праграмы Універсітэта Аявы (горад Аява-Сіці, штат Аява). Праграма ўключала супрацу з літаратарамі больш чым 30-ці краін свету, а таксама з дзеячамі амерыканскай культуры і адукацыі, і дала магчымасць павандраваць па ўсёй краіне. Пра яе ўражанні ад паездкі чытайце ў «НЧ».**



Маленькія дзеці не думаюць пра смерць, але дасканала абазнаныя ў параметрах раю. Калі мне было адзінаццаць, мой дзіцячы рай меў выгляд вялікага кінатэатра, дзе зранку да вечара круцілі дыснеўскія фільмы, раздаючы гледачам кока-колу, бананы, чыпсы і смачныя шакаладныя батончыкі «Марс», «Снікерс», «Твікс». Толькі ў такіх умовах я — тыповы дзіцёнак дзевяностых — магла б сцвярджаць: я абсалютна шчаслівая.

І калі некалькі месяцаў таму я ўпершыню ў жыцці трапіла на борт трансатлантычнага авіялайнера, салон якога памерамі і будовай да болю нагадваў залу мінскага кінатэатра «Беларусь», я злёгку запанікавала. Асабліва калі на экранчыках перад намі сталі паказваць рознае кіно, сцюардэсы пачалі разліваць напоі і раздаваць пасажырам іх законны снэк — чыпсы і снікерсы. Трэба яшчэ дадаць, што самалёт авіякампаніі «Юнайтэд» накіроўваўся ў Злучаныя Штаты Амерыкі.

Менавіта тады ў мяне ўзнікла адчуванне, якое так і не развеялася за тры месяцы знаходжання ў ЗША: Амерыка — гэта беларускі рай дзевяностых.

І тым больш напрыканцы 2010-х мне здаваліся дзіўнымі абставіны, пры якіх мне даводзілася ад’язджаць на маю кароткую стажыроўку.

### «Што вы пакідаць у Беларусь?»

Па-першае, я, у парадку выключэння, была адзінай грамадзянкай Беларусі ў веку да 60-ці гадоў, якой у той ліпеньскі дзень выдалі візу. Астатнія мае равеснікі змушаныя ездзіць па амерыканскія візы ў суседнія краіны, дзе ў праве на ўезд у ЗША ім найчасцей адмаўляюць. Адмаўляюць, як сцвярджаецца, тым, каго падазраюць у жаданні застацца. Але гэта спрацоўвае наадварот. Для большасці маіх равеснікаў з Беларусі, якім пашчасціла атрымаць візу ў ЗША, сам факт выдачы стаў дастатковай прычынай невяртання і згоды на нелегальны статус: другі раз не пусцяць.

Пенсіянераў у консульстве ў Мінску таксама падазравалі. «*Якая рухомая і нерухомая маёмасць вы пакідаць у Беларусь?*» Пераляканыя, што іх могуць не пусціць праведаць дзяцей і ўнукаў, тыя ліхаманкава казыралі «жыгулямі», кватэрамі, дачамі...

«Што я ім скажу? — з жахам цяміла я, — бо наўрад ці тут усур’ёз прымуць тое, што мяне сапраўды трымае ў Беларусі. Хутар!!! Ура: на мяне запісаны дзедавы хутар! Трэба толькі правільна сфармуляваць па-англійску: «гектар зямлі з фермерскімі пабудовамі...» Але маё запрашэнне апынулася надта аўтарытэтным, каб справа дайшла да такіх роспытаў.

Па-другое, калі стала вядома пра мой хуткі ад’езд, сябры папрасілі вярнуць пазыкі. Тон некаторых развітанняў нагадваў пахаванне жыўцом. Чорт, няўжо адтуль сапраўды ніхто-ніхто не вяртаецца?

У сувязі з гэтым я вырашыла: перад тым, як размаўляць пра культуру ды геаграфію ЗША ці лад жыцця амерыканцаў, неабходна і карысна адказаць грамадзянам краіны Беларусь на пытанне, якое іх насамрэч хвалюе: ці варта не вяртацца з Амерыкі?

### «Свабода вядзе да таго, што няма свабоды»

Яшчэ задоўга да магчымасці пабачыць жыццё ў ЗША на ўласныя вочы, я заўважыла, што ўяўленні шараговага беларуса пра гэтую далёкую краіну фармуюцца дзвюма супярэчлівымі візуальнымі крыніцамі: масавым амерыканскім кінематографам і прапагандысцкімі ролікамі дзяржаўнага тэлебачання. Прычым візэрункі Амерыкі ў кожнай з іх розняцца настолькі, што шараговы беларус перакананы: адна з крыніцаў бязбожна хлусіць.

Насамрэч, як мне здаецца, хлусяць абедзве крыніцы, але кожная — па-боску. БТ не робіць нічога іншага, апроч перакладу вострасацыяльных ролікаў, датычных праблемаў амерыканскага грамадства, якіх (праблемаў і — адпаведна — ролікаў) нямала: дэградацыя чорнага насельніцтва ў трушчобах вялікіх гарадоў, недаступная медыцына, страляніна ў сярэдніх школах і перыядычныя экспартныя войны за нафту і справядлівасць. Але ўнутрыамерыканская крытыка ўласных заганаў, скіраваная на абуджэнне свядомасці сытага і ўсім задаволенага насельніцтва, аўтаматычна ператвараецца ў «Іх норавы», трапляючы ў БТшную сетку вяшчання.

Штотычыцца прадукцыі Галівуду, то , як ні сумна гэта гучыць, яе стваральнікам увогуле не да нас: нашае захапленне «амерыканскай марай» — пабочны эфект іх кінематографу. Мэта гэтага бізнесу, як правіла, — прадаць фільм, у якім сярэдняму амерыканцу пакажуць жыццё, прыўкраснейшае за яго штодзённасць. Героі там амаль абавязкова будуць прывабнымі і паспяховымі, горад — вялікім, свет — вышэйшым, гатэлі — пяцізоркавымі, машыны — дарагімі, а жыццё — бестурботным. Між тым, як паказвае досвед, дэкарацыі таго ж фільма «Тэрмінатар» — гэта і ёсць сапраўдная Амерыка.



Год таму я паглядзела камедыю «Зомбілэнд» рэжысёра Дэвіда Фінчара. Яго першы нашумелы фільм — «Байцоўскі клуб» паводле раману Чака Паланіка, яго апошні нашумелы фільм — «Сацыяльная сетка», паводле гісторыі стварэння рэсурсу «Фэйсбук». А вось «Зомбілэнд» прайшоў амаль незаўважаным, магчыма, праз спецыфіку жанру. «Гэта фантастычны фільм пра тое, што Амерыкі больш няма, бо амаль усе жыхары краіны ператварыліся ў зомбі», — пераказваю я сутнасць фільму двум амерыканскім пісьменнікам, якія яго не бачылі. «Чаму фантастычны? — смяюцца тыя. — Гэта чыстая праўда: амаль усе амерыканцы — зомбі».

Як ні дзіўна гучыць, менавіта беларусы, «замбаваныя» прапагандай БТ, — патэнцыйныя шчаслівыя грамадзяне заходняга свету. ЗША і сапраўды рай, калі ўсё, для чаго ты прыйшоў у на зямлю, — спажыванне. Бо нават у насельнікаў тых самых страшных трушчобаў з задавальненнем першасных патрэбаў чалавека ўсё ў парадку: ім хапае чаго есці, піць, яны (збольшага) маюць дзе спаць і размнажацца.

Цяжкасці пачынаюцца далей, калі падключаюцца другасныя патрэбы: адукацыя, падарожжы па свеце, статус у грамадстве, цікаўнасць чытаць кнігі і хадзіць у музеі ды мюзік-холы. І — самае страшнае — пошукі адказу на пытанне: «Для чаго я жыву?» Тады быццё амерыканцам выяўляецца не менш праблемным за быццё кімсьці іншым. «Амерыканская свабода — гэта брэнд, — дзеліцца сваімі бязрадаснымі назіраннямі мой сябар-амерыканец, — але ва ўмовах, калі большасць маіх суграмадзян не навучаная думаць, поўная свабода прыводзіць да таго, што няма ніякай свабоды. Зірні хаця б на ЗША з 2000-га па 2008 гады, калі мы двойчы выбралі прэзідэнтам маладшага Буша. Я, напрыклад, так і не зразумеў, чым ён адрозніваецца ад вашага Аляксандра Лукашэнкі».

Але рана біць у ладкі, сцвярджаючы, следам за кумірам тых жа дзевяностых расійскім сатырыкам Міхаілам Задорнавым, маўляў, «усе амерыканцы тупыя». Калі ты багаты амерыканец — гэта яшчэ не значыць, што ты — амерыканец разумны. Гэта, здаецца, сусветны закон. Але ж, у адрозненне ад маёй радзімы, быць разумным і бедным у Амерыцы амаль немагчыма. Праўда і тое, што бедным здаравей быць у Беларусі.

### «Фаст-фуд — адзіная радасць бедных»

Творы шматлікіх літаратур свету ўключаюць у сябе аповеды пра чароўнае ператварэнне людзей у свінняў. Пра гэта мы можам прачытаць у «Вандроўках Сіндбада-Марахода» і «Адысеі» Гамера. Такую метамарфозу суправаджае не толькі фізічнае атлусценне, але і маральнае падзенне: ежа — адзінае, пра што здатныя думаць свінні-пярэваратні. Гэтыя сюжэты мімаходзь лезуць у галаву, калі ўжывую бачыш хваравіта тлустых людзей на вуліцах амерыканскіх гарадоў. Асабліва шмат іх заўважаеш у Сэрцы Радзімы — «мілай сталіцы Вашынгтоне», куды з’язджаюцца турысты з усіх штатаў.

Першая лэдзі краіны падцягнутая і энергічная Мішэль Абама вызначыла атлусценне — і найперш атлусценне дзяцей — адной з галоўных праблем сучаснай Амерыкі. Беларускі сацыёлаг Алена Гапава, жыхарка ЗША з 10-гадовым стажам, з сумам зазначае: «Фаст-фуд — гэта, на жаль, адзіная радасць бедных амерыканцаў». Тых, якім не па кішэні якасныя прадукты, падарожжы, фітнэс. Адмысловай пародыяй на здаровы лад жыцця выглядаюць крамы, дзе прадаюць танную спартовую вопратку XXXXL памеру.

Але не ехаць у Амерыку толькі таму, што за паўгода цябе там абавязкова разнясе на дваццаць кілаграмаў, — бздуры: варта памятаць, што Сіндбад і Адысей не паддаліся чарам і ва ўсіх сэнсах засталіся людзьмі.

У ЗША сапраўды можна пабачыць шмат нездарова тлустых абывацеляў. Але стройных спартыўных амерыканцаў можна пабачыць значна болей. Асабліва на такіх людзей шчасціла мне: я збольшага вандравала па ўніверсітэцкіх гарадах. Адсутнасць грошай на здаровую ежу і вышэйшую адукацыю ў ЗША — рэчы ўзаемазвязаныя. У жоўтай прэсе часта з’яўляюцца кур’ёзныя зацемкі пра тое, што падчас рэканструкцыі амерыканскіх стадыёнаў месцаў на трыбунах меншае, бо павялічваюцца памеры крэслаў. Пра амерыканскія тэатры такой інфармацыі не паступае.

Але худы ты ці тоўсты, высокі ці нізкі, лысы ці валасаты, носіш акуляры ці не — наваколныя людзі не пададуць выгляду, што з табой «нешта не тое». На прылюднае абмеркаванне фізіялогіі тут негалоснае табу. У гэтым плане ў Амерыцы значна лягчэй існаваць не тое, што інвалідам-вазочнікам ці людзям з нетрадыцыйнай арыентацыяй, а і проста асобам з нестандартнай знешнасцю. За тры месяцы я (больш за 80 кг. вагі) ні разу не пачула пра сябе здзеклівае «карова» — ані ў грамадскім транспарце, ані ад п’янага пісьменніка на літаратурнай імпрэзе. У Амерыцы я пераканалася, што над палітычнымі ці эканамічнымі фактарамі эміграцыі з Беларусі дамінуе псіхалагічны фактар: беларусу, які хоць неяк вытыркаецца з пракрустава ложку грамадскіх уяўленняў пра норму, хочацца проста жыць у частцы свету, дзе «не такія, як усе» маюць рэальны шанец «людзьмі звацца».

### «Амерыканскі запраўшчык шчаслівы тым, што мае»

«Дык вяртацца ці не?» — нецярпліва абарвяце мяне вы. Шчыра — у мяне няма адказу. Амерыка — прыязны і кранальны рэтрарай майго дзяцінства — асабіста ў мяне жадання жыць у ім да скону не выклікала. І справа тут нават не ў дзедавым хутары. Але мы гаворым пра памкненні кожнага асобна ўзятага беларуса...

Калі, пераехаўшы жыць у ЗША, беларус будзе працаваць з такой якасцю і столькі, як гэтага вымагае ад яго сучасная беларуская сістэма, то ён мае 100-працэнтныя шанцы стаць амерыканцам бедным. І тоўстым. Перад канчатковым рашэннем эміграваць сярэдняму беларусу варта спытацца ў сябе, ці гатовы ён працаваць столькі, колькі працуе сярэдні амерыканец. Я гавару нават не пра 8 гадзін на суткі, а пра мінімум 12–14. Але ёсць і іншая праўда — калі нават беларус у Беларусі працуе столькі ж і гэтак жа якасна, як сярэдні амерыканец, ён усё адно заробіць менш.

А што да шчасця ў «амерыканскім раі», то яго галоўная спецыфіка — не ў лепшай якасці жыцця, а ў тваім стаўленні да ўсяго, што з табой адбываецца. Як трапна сфармуляваў мой польскі таварыш Мілаш: «Асноўная розніца паміж палякам і амерыканцам у тым, што паляк заўжды незадаволены тым, чым зарабляе ў дадзены момант. Запраўшчык скардзіцца на тое, як кепска быць запраўшчыкам, прэм’ер-міністр — на сваю пасаду прэм’ера. У той жа час амерыканскі запраўшчык шчаслівы тым, што мае, ідучы па жыцці з перакананнем, што ён робіць сваю працу».

Думаю, гэтае назіранне працуе для ўсіх еўрапейскіх народаў, і пагатоў яно працуе для беларусаў. Амерыка як філасофія — гэта найперш пазітыўнае стаўленне да жыцця, а яно — унутры цябе і цалкам магчымае без самой Амерыкі навокал.

**Працяг будзе**

МУЗЫЧНЫЯ ВЫНІКІ

# КОНТУРЫ НАДЗЕІ ЗА СМУГОЙ ПЕСІМІЗМУ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Перад тым, як сесці за напісанне матэрыялу па выніках мінулага 2010 музычнага года, зазірнуў у запісы, што сталі асновай папярэдняга выніковага артыкула «Год 2009: Сутаргі культурнага каланіялізму». І здзівіўся: многія тэндэнцыі ў нацыянальным рок-руху захаваліся, шмат якія тэндэнцыі, асабліва негатыўныя, узмацніліся. Аднак падстаў для аптымізму ўсё ж не зменшылася. Чаму так? Папросту пазітыўныя з'явы з нашага музычнага жыцця, як і ўсё сапраўднае мастацтва, сталі больш асцярожнымі, выглядаюць больш сціплымі, быццам баяцца сурочыць саміх сябе і сваю місію ў цяперашняй культурнай прасторы Беларусі. Ад гэтага іх важкасць не змяншаецца: хто хоча, няхай пабачыць і ўсвядоміць.**







Ужо другі год даводзіцца канстатаваць тое, што айчынны рок-рух фактычна функцыянуе без «камандната складу» — гуртоў першага эшалону. На гэтую акалічнасць я звяртаў увагу раней, таму дам кароткае рэзюмэ: у такой з'яве няма нічога страшэннага, як і ў тым, што ролю «валадароў думак» цяперашніх прыхільнікаў рок-музыкі займаюць рускамоўныя калектывы. Так, яны могуць збіраць нават Палац спорту ці КЗ «Мінск», але іх поспех да гэтага часу вымяраецца паводле далёкіх ад мастацтва крытэраў. Як бы там ні было, гэтыя каманды ствараюць канкурэнтнае асяроддзе, актывізуюць «змаганне» за слухачоў, вымушаюць шукаць новыя формы ў прасоўванні свайго прадукту.

Мінулы год быў адзначаны даволі маштабнымі канцэртамі і выданнем альбомаў рускамоўных гуртоў «Без билета», «J-Морс» і «Ляпис Трубецкой», якія шырока рэкламаваліся ў афіцыйных сродках масавай інфармацыі. Праўда, там ні слова не казалі, ці з'яўляюцца тыя творы ўкладам у сучаснае нацыянальнае мастацтва, ці будуць іх слухаць праз год. Відавочна, што гэтае пытанне, як правіла, выносіцца за рамкі мастацкай вартасці твораў такіх гуртоў.

Затое амаль ніхто са штатных крытыкаў гэтых СМІ не адзначыў тэхнічна і выканаўча дасканалы альбом гурта «Маўзер» «PORNA», выданне якога стала сапраўдным прарывам для ўсёй айчыннай рок-культуры. Застаўся за межамі ўвагі і альбом гурта «Мутнаевока» «Пошлы гламур», які абвясціў пра з'яўленне на нашай рок-сцэне самабытнага і перспектыўнага калектыву. Не кажучы ўжо пра сольнік берасцейскага гурта «Sciana» «Кропка невяртання», які стаў добрым дэбютным падмацаваннем для набыцця папулярнасці гурта ў межах усёй Беларусі. Хацелася б толькі пажадаць, каб і самі музыканты, і іх сябры ўзялі на сябе частку высілкаў па распаўсюджванню свайго альбому. Асабістая зацікаўленасць лёсам свайго прадукту заўсёды спрыяе росту папулярнасці артыстаў! Своеасаблівую сенсацыю стварылі ўдзельнікі гурта «AKUTE», якія ў гэтым годзе заваявалі Гран-пры «Басовішча». Застаецца чакаць дэбютнага альбома гэтай магілёўскай каманды.

Канкурэнцыю сваім рускамоўным vis-a-vis на беларускіх канцэртных пляцоўках складалі ў гэтым годзе з большага выканаўцы-салісты. І перш за ўсё маю на ўвазе Лявона Вольскага з яго эксперыментальным альбомам «Белая яблыня грому» на вершы беларускіх паэтаў-класікаў. Камусьці дыск спадабаўся, камусьці — не, але нельга не прызнаць тое, што песні Лявона і новага складу яго «Крамбамбулі» не пакінулі слухачоў абыякавымі. Дакладна! Гэта стала відавочна падчас прэзентацыі дыска ў канцэртнай зале «Мінск».

Дарэчы, гэту прэстыжную канцэртную пляцоўку мог бы з поспехам асвойваць і яшчэ адзін выканаўца — Зміцер Вайцюшкевіч, які ў гэтым годзе выдаў першы ў сваёй дыскаграфіі канцэртны альбом «Беларуская песня» на вершы Уладзіміра Караткевіча. Аншлагавы канцэрт-прэзентацыя «Беларускай песні» ў Палацы чыгуначнікаў засведчыў, што Зміцеру і яго гурту "WZ-Orkiestra" пад сілу збіраць і самыя вялікія аўдыторыі. Зразумела, пры больш шчыльнай рэкламе і пастаяннай наяўнасці «разынак» у канцэртных праграмах артыста. Песні Вайцюшкевіча зала спявае з выканаўцам вельмі ахвотна, таксама актыўна набывае ўсе дыскі, на якія багата дыскаграфія Зміцера.

Заўважнай з'явай агульнанацыянальнага маштабу стала ўзнікненне на айчыннай сцэне праекта «У нескладовае», удзельнікі якога выказалі прэтэнзіі стаць, прынамсі, вядомымі не толькі на радзіме, але і ў суседняй Расіі. Матэрыяльным пацверджаннем намераў стаў першы аднайменны альбом «У нескладовае», выдадзены кампаніяй «VEST-RECORDS». Пакуль пра новы дыск можна казаць як пра першую спробу ініцыятараў праекта Рамана Арлова і Вадзіма Марголіна стварыць варты канкурэнтны прадукт, запатрабаваны і ў Беларусі, і ў Расіі. Для гэтага былі выпрацаваны ўсе сродкі: запамінальныя мелодыі, лёгкія поп-рокавыя аранжыроўкі, зразумелыя тэксты. Але чаканага выніку ўдзельнікі «У нескладовае» ў гэтым годзе пакуль не атрымалі. А гэта значыць, што ў наступным годзе давядзецца больш актыўна заняцца аранжыроўкамі песень, а таксама стварэннем арыгінальнай гукавой канцэпцыі гурта. Якраз арыгінальнасці і не хапае «У нескладоваму» для рэалізацыі сваіх асветных памкненняў у суседняй краіне.

2010 год стаў знамянальным і тым, што многія беларускія выканаўцы рэалізавалі свае даўнішнія навучальныя праекты. Так, лідар гурта «Стары Ольса» Зміцер Сасноўскі прэзентаваў сваю грунтоўную «Гісторыю беларускай музычнай культуры. Ад старажытнасці ад канца XVIII ст.», у якой ім выкладзены ўнікальны гістарычны матэрыял пра генезіс старадаўніх музычных інструментаў, звесткі пра першых кампазітараў, якія працавалі на тэрыторыі Беларусі, пра знойдзеныя музычныя зборнікі часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Відавочна, Зміцер вырашыў падзяліцца сваімі гістарычнымі знаходкамі з чытачамі, даць падставу для роздуму даследчыкам айчыннай музычнай культуры.

Па шляхах Сасноўскага рушылі вядомы калекцыянер музычных інструментаў, рок-бард Яраш Малішэўскі і Аксана Спрынчан. Яны прапанавалі юным чытачам яшчэ адзін музычны фаліянт — паэтычны даведнік «Незвычайная энцыклапедыя беларускіх народных інструментаў», які можна выкарыстоўваць на ўроках музыкі ў пачатковых класах. Дарэчы, менавіта выкладчыкам і выканаўцам адрасуецца і іншае музычнае выданне — праект «Дзіцячы альбом» з фальклорнымі спевамі ад барда Зміцера Сідаровіча і спявачкі Тацціяны Матафонавай. Пад іх кіраўніцтвам вядомыя беларускія песні спяваюць Адась Матафонаў і Тамаш Сідаровіч. Іх выканаўчы запал, звонкія галасы зрабілі «Дзіцячы альбом» галоўным дзіцячым метадалагічным выданнем гэтага года. Цяпер справа за распаўсюджваннем дыска ў школах, для якіх і быў задуманы праект. Не будзем перабольшваць магчымасці ў гэтай галіне прыватных асоб, але вельмі важна тое, што такія выданні можна цяпер замовіць у крамах і выкарыстоўваць на ўроках спеваў.

Па волі лёсу цэлы год давялося адсочваць працу айчынных FM-радыёстанцый: за слуханнем добрай музыкі хутчэй бяжыць час, да таго ж можна зрабіць нейкія высновы адносна тэндэнцый у беларускім эфіры. Зноў даводзіцца канстатаваць, што беларускія радыёстанцыі толькі намінальна можна лічыць беларускімі: амаль ніхто з іх ды-джэяў не вытрымлівае 75-працэнтную квоту на беларускую музыку. Зноў жа, беларускамоўнай музыкі ў FM-эфіры гучыць катастрафічна мала.

Многія радыёстанцыі робяць усё магчымае, каб «беларуская музыка» гучала ў эфіры без беларускай мовы. Асабліва шчыруюць ды-джэі «Radio-BA 104,6», якія прайграюць музыку беларускіх гуртоў толькі на англійскай мове. Прааналізаваўшы трэк-ліст гэтай радыёстанцыі, можна зрабіць выснову, што «Крама» і дуэт Аляксандра і Канстанцін — цалкам англамоўныя выканаўцы. Што казаць, калі песню «Бывайце здаровы!» Зміцера Вайцюшкевіча з праекта «Bella Ciao!» — «Бывайце здаровы!» на «Radio-BA 104,6» транслююць толькі на італьянскай мове, хоць гэта італа-беларускамоўная кампазіцыя! Праўда, такія высновы не заўсёды стоадсоткавыя: на ўсіх хвалях зрэдку можна пачуць нешта на роднай мове. Вось нават «Мелодыі Века» пачалі трансляваць не толькі «Песняроў» ды «Верасоў», але і песні «Крамы», каверы гурта «P.L.A.N.», Юрыя Несцярэнкі і Пятра Ялфімава. Выключэнні сведчаць якраз пра тое, што на праблему «75-працэнтнай квоты на беларускую музыку» стараюцца забыцца, каб не турбаваць сябе лішнім клопатам.

А вось піянеры і лідары ў трансляцыі беларускай музыкі — «Аўтарадыё-105,2» — ужо часцяком стамляюць вуха аднатыпнымі музычнымі сэтамі. Асабліва, пяцігадовай даўніны: «Цмокі» — «Дзеці», «Імпэт» — «Зусім не проста», «Крама» — «Дай мне шанец»... Вядучым можна было б «расквецііць» стылістычную палітру станцыі, пачаўшы трансляваць лепшыя песні беларускіх бардаў, айчынную медывальную музыку. Менавіта так і робіць у рамках праекта «Простыя словы» на «Аўтарадыё–105,2» вядучы Зміцер Вайцюшкевіч. І яшчэ адно пажаданне ўлюбёнай станцыі: рабіць святочныя музычныя падборкі, напрыклад, да свята Божага Нараджэння ці на Вялікдзень. У беларускіх выканаўцаў назапашана столькі святочнай тэматычнай музыкі, што ёй можна ўпрыгожыць трэк-лісты на адной беларускай FM-радыёстанцыі. Дай Божа, каб у наступным годзе так і здарылася!

ФЕЛЬЕТОН

# ЯК ГАЛАСАВАЦЬ ПРЫ «ТАЛКОВАЙ ДЭМАКРАТЫІ»

Лёлік УШКІН

**Надышоўшая эпоха «талковай дэмакратыі», напэўна, патрабуе новай легітымнай базы. Вось як магла б выглядаць новая рэдакцыя Закона аб выбарах прэзідэнта.**

## Артыкул 1.

Прэзідэнт абіраецца прэзідэнтам на аснове агульнага, роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні.

## Артыкул 2.

Прынцыпы правядзення выбараў

Выбары прэзідэнта з'яўляюцца свабоднымі. Прэзідэнт сам вырашае, калі яму прагаласаваць — да абеду або пасля. Ніхто не мае права прымусіць прэзідэнта не прагаласаваць за прэзідэнта. У выбарах не ўдзельнічаюць прэзідэнты, якія прызнаныя судом непрацаздольнымі, знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі або пад следствам. Не допускаецца дыскрымінацыя прэзідэнта па полу або расе.

## Артыкул 3.

Арганізацыя выбараў

Для арганізацыі выбараў выклікаецца Ліда.

## Артыкул 4.

Галоснасць пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў

Сродкі масавай інфармацыі асвятляюць словы Ліды пра тое, што выбары арганізаваны на высокім узроўні і на іх запрошана дэлегацыя назіральнікаў ад СНД.

## Артыкул 5.

Права вылучэння кандыдатаў у прэзідэнты

Кандыдаты на пасаду прэзідэнта вылучаюцца не менш чым адным прэзідэнтам.

## Артыкул 6.

Сродкі на выбары прэзідэнта

Расходы, звязаныя з падрыхтоўкай выбараў, аплачваюцца за кошт дзяжурнага крэдыту МВФ, узятага на правядзенне лібералізацыі эканомікі.

## Артыкул 7.

Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб выбарах прэзідэнта

Бандыты і дыверсанты, якія перашкаджаюць свабоднаму выяўленню права прэзідэнта абіраць і быць абраным прэзідэнтам, нясуць адказнасць як арганізатары масавых беспарадкаў. Прэзідэнту забараняецца заклікаць да байкоту выбараў прэзідэнта.

## Артыкул 8.

Прызначэнне выбараў прэзідэнта

Выбары прэзідэнта прызначаюцца на перыяд паміж Дажынкамі і хакейным турнірам на прызы прэзідэнта.

## Артыкул 9.

Камісіі па выбарах

Для падрыхтоўкі і правядзення выбараў ствараецца камісія па выбарах у адной асобе (гл. артыкул 3).

## Артыкул 10.

Паўнамоцтвы камісіі

Камісія рэгіструе прэзідэнта. Падводзіць вынікі яго галасавання і інфармуе СМІ, каб яны пісалі: «Выбар зроблены. Усе на выкананне плану пяцігодкі!»

## Артыкул 11.

Спіс прэзідэнтаў, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах прэзідэнта

Спіс прэзідэнтаў складаецца Лідай. У спіс прэзідэнтаў уключаюцца ўсе прэзідэнты, якія дасягнулі да дня выбараў 18 гадоў. Кожны прэзідэнт мае права напісаць скаргу ў суд у выпадку, калі яго не ўключылі ў спіс.

## Артыкул 12.

Ініцыятыўная група па вылучэнню прэзідэнта

Па ініцыятыве прэзідэнта ствараецца ініцыятыўнай група па яго вылучэнню на пасаду прэзідэнта. Спіс групы падаецца Лідзе, якая рэгіструе яе і выдае яе сябрам спецыяльныя пасведчанні на збор подпісаў. Падпісваць лісты маюць права прэзідэнты. Калі прэзідэнт падтрымлівае прэзідэнта, ён павінен указаць у лісце сваё прозвішча, дату нараджэння, нумар пашпарту. Падпісныя лісты аддаюцца Лідзе. Падпісныя лісты, на якіх выяўленыя фіктыўныя подпісы прэзідэнта, подпісы аднаго і таго ж прэзідэнта, лічацца несапраўднымі.

## Артыкул 13.

Перадвыбарчая агітацыя

Прэзідэнту надаецца права ўсебаковага абмеркавання сваёй выбарчай праграмы, будзь у якой форме (за абедам, на прыродзе, у сямейным коле, у душы). Камісія па выбарах павінна садзейнічаць правядзенню такіх мерапрыемстваў. Агітацыя ў дзень выбараў не дапускаецца.

## Артыкул 14.

Бюлетэнь для галасавання

У бюлетэнь уключаюцца ў алфавітным парадку ўсе прэзідэнты — кандыдаты на пасаду прэзідэнта.

## Артыкул 15.

Час і месца для галасавання

Галасаванне прэзідэнта праводзіцца ў дзень выбараў з 7 да 22 гадзінаў на выбарчым участку.

## Артыкул 16.

Арганізацыя галасавання

Галасаванне адбываецца ў спецыяльных памяшканнях у кабінах для тайнага галасавання. Прэзідэнт галасуе за сябе асабіста. Галасаванне за іншых асобаў не дапускаецца. Запоўнены бюлетэнь прэзідэнт апускае ў скрыню для галасавання.

## Артыкул 18.

Падлік галасоў

Скрыня для галасавання ўскрываецца камісіяй пасля заканчэння галасавання. Камісія ўстанаўлівае наяўнасць прэзідэнцкага бюлетэня і заносіць яго дадзеныя ў пратакол. Пратакол падпісваецца Лідай.

## Артыкул 19.

Другі тур галасавання

Калі прэзідэнт не набраў патрэбнага голасу, адбываецца другі тур. Абраным лічыцца прэзідэнт, які ў другім туры атрымаў больш за палову голасу.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1323

Падпісана да друку 24.12.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.